# ПАРЛАМЕНТ –

## Нацыянальны сход Рэспублікі Беларусь трэцяга склікання

Пад агульнай рэдакцыяй старшынь палат
Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь
Г.В.Навіцкага, В.А.Папова

Мінск
БЕЛТА
2008



Палата прадстаўнікоў



Савет Рэспублікі

УДК 342.52/.53(476)(092)(035.5)
ББК 67.400.6(4Беи)я2
П 18

Аўтары-складальнікі:
А.Э.Вярцінскі, Н.А.Карповіч, С.В.Савіцкая, А.Г.Чурсін

Каардынатары дзейнасці па выданню кнігі
старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў
па адукацыі, культуры, навуцы
і навукова-тэхнічнаму прагрэсу У.М.Здановіч,
старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі
па адукацыі, навуцы, культуры,
і гуманітарных пытаннях А.М.Новікаў

У кнізе выкарыстаны здымкі
фотахронікі УП «БЕЛТА», Сакратарыята Савета Рэспублікі,
С.В.Зяленкіна і В.М.Педзько

П18 **Парламент** – Нацыянальны сход Рэспублікі Беларусь трэцяга склікання / Аўт.-склад.: А.Э.Вярцінскі, Н.А.Карповіч, С.В.Савіцкая, А.Г.Чурсін; пад агул. рэд. Г.В.Навіцкага, В.А.Папова.– Мінск : БЕЛТА, 2008. –312 с.: іл.

ISBN 978-985-6828-27-3

На старонках кнігі змешчана агульная інфармацыя аб складзе Нацыянальнага сходу трэцяга склікання, яго паўнамоцтвах і заканадаўчым працэсе. У яе ўключаны біяграфічныя звесткі пра дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў і членаў Савета Рэспублікі. Выданне будзе карыснае для ўсіх, хто цікавіцца дзейнасцю Парламента Рэспублікі Беларусь.

**УДК 342.52/.53(476)(092)(035.5)**
**ББК 67.400.6(4Беи)я2**

**ISBN 978-985-6828-27-3**

© Палата прадстаўнікоў, 2008
© Савет Рэспублікі, 2008
© Афармленне. УП «БЕЛТА», 2008

# ПАРЛАМЕНТ – НАЦЫЯНАЛЬНЫ СХОД РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

## Прававы статус і структура Парламента

Згодна з артыкулам 90 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, Парламент – Нацыянальны сход Рэспублікі Беларусь з'яўляецца прадстаўнічым і заканадаўчым органам Рэспублікі Беларусь.

Парламент Рэспублікі Беларусь:
- прымае законы;
- зацвярджае дзяржаўны бюджэт і справаздачу аб яго выкананні;
- удзельнічае ў фарміраванні органаў выканаўчай і судовай улады;
- рэалізуе некаторыя кантрольныя паўнамоцтвы;
- ажыццяўляе міжпарламенцкае супрацоўніцтва.

Тэрмін паўнамоцтваў Парламента – чатыры гады. Паўнамоцтвы Парламента могуць быць прадоўжаны на падставе закона толькі ў выпадку вайны.

Парламент складаецца з дзвюх палат – Палаты прадстаўнікоў і Савета Рэспублікі. Склад Палаты прадстаўнікоў – 110 дэпутатаў. Поўны склад Савета Рэспублікі – 64 члены Савета Рэспублікі.

## Фарміраванне палат Парламента

У адпаведнасці з Канстытуцыяй выбары новага складу палат Парламента назначаюцца не пазней як за чатыры месяцы і праводзяцца не пазней як за 30 дзён да сканчэння паўнамоцтваў палат дзеючага склікання. Падрыхтоўка і правядзенне выбараў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, членаў Савета Рэспублікі ажыццяўляюцца адкрыта і галосна.

Дэпутатам Палаты прадстаўнікоў можа быць выбраны грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які дасягнуў 21 года і пастаянна пражывае ў Рэспубліцы Беларусь. Выбранне дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў ажыццяўляецца ў адпаведнасці з законам на аснове ўсеагульнага, свабоднага, роўнага, прамога выбарчага права пры тайным галасаванні.

Савет Рэспублікі з'яўляецца палатай тэрытарыяльнага прадстаўніцтва. Ад кожнай вобласці і горада Мінска тайным галасаваннем выбіраюцца на пасяджэннях дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў базавага ўзроўню кожнай вобласці і горада Мінска па восем членаў Савета Рэспублікі. Восем членаў Савета Рэспублікі назначаюцца Прэзідэнтам. Кандыдатам у члены Савета Рэспублікі можа быць грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які дасягнуў 30 гадоў і пражыў на тэрыторыі адпаведнай вобласці, горада Мінска не менш як пяць гадоў. Выбары членаў Савета Рэспублікі праводзяцца на аснове роўнага і ўскоснага выбарчага права пры тайным галасаванні.

## Кампетэнцыя Парламента

Кампетэнцыя Нацыянальнага сходу рэалізуецца шляхам ажыццяўлення паўнамоцтваў палат Нацыянальнага сходу ў формах і межах, устаноўленых Канстытуцыяй і законамі Рэспублікі Беларусь.

Палата прадстаўнікоў:

1) разглядае па прапанове Прэзідэнта або па ініцыятыве не менш як 150 тысяч грамадзян Рэспублікі Беларусь, якія валодаюць выбарчым правам, праекты законаў аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю, аб тлумачэнні Канстытуцыі;

2) разглядае праекты законаў, у тым ліку аб зацвярджэнні асноўных напрамкаў унутранай і знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь; ваеннай дактрыны; аб ратыфікацыі і дэнансацыі міжнародных дагавораў; аб асноўным змесце і прынцыпах ажыццяўлення правоў, свабод і абавязкаў грамадзян; аб грамадзянстве, статусе іншаземцаў і асоб без грамадзянства; аб правах нацыянальных меншасцей; аб зацвярджэнні рэспубліканскага бюджэту і справаздачы аб яго выкананні; аб устанаўленні рэспубліканскіх падаткаў і збораў; аб прынцыпах ажыццяўлення адносін уласнасці; аб асновах сацыяльнай абароны; аб прынцыпах рэгулявання працы і занятасці; аб шлюбе, сям'і, дзяцінстве, мацярынстве, бацькоўстве, выхаванні, адукацыі, культуры і ахове здароўя; аб ахове навакольнага асяроддзя і рацыянальным выкарыстанні прыродных рэсурсаў; аб вызначэнні парадку вырашэння пытанняў адміністрацыйна-тэрытарыяльнага ўладкавання дзяржавы; аб мясцовым самакіраванні; аб судаўладкаванні, судаводстве і статусе суддзяў; аб крымінальнай адказнасці; аб амністыі; аб абвяшчэнні вайны і заключэнні міру; аб прававым рэжыме ваеннага і надзвычайнага становішча; аб устанаўленні дзяржаўных узнагарод; аб тлумачэнні законаў;

3) назначае выбары Прэзідэнта;

4) дае згоду Прэзідэнту на назначэнне Прэм'ер-міністра;

5) заслухоўвае даклад Прэм'ер-міністра аб праграме дзейнасці Урада і адабрае або адхіляе праграму; паўторнае адхіленне палатай праграмы азначае выказванне вотуму недаверу Ураду;

6) разглядае па ініцыятыве Прэм'ер-міністра пытанне аб даверы Ураду;

7) па ініцыятыве не менш як адной трэці ад поўнага складу Палаты прадстаўнікоў выказвае вотум недаверу Ураду; пытанне аб адказнасці Урада не можа быць пастаўлена на працягу года пасля адабрэння праграмы яго дзейнасці;

8) прымае адстаўку Прэзідэнта;

9) выстаўляе большасцю галасоў ад поўнага складу Палаты прадстаўнікоў абвінавачанне супраць Прэзідэнта ва ўчыненні дзяржаўнай здрады або іншага цяжкага злачынства; на падставе адпаведнага рашэння Савета Рэспублікі прымае большасцю не менш як дзве трэці галасоў ад поўнага складу рашэнне аб зняцці Прэзідэнта з пасады;

10) адмяняе распараджэнні Старшыні Палаты прадстаўнікоў.

Савет Рэспублікі:

1) адабрае або адхіляе прынятыя Палатай прадстаўнікоў праекты законаў аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю; аб тлумачэнні Канстытуцыі; праекты іншых законаў;

2) дае згоду на назначэнне Прэзідэнтам Старшыні Канстытуцыйнага Суда, Старшыні і суддзяў Вярхоўнага Суда, Старшыні і суддзяў Вышэйшага Гаспадарчага Суда, Старшыні Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенню рэспубліканскіх рэферэндумаў, Генеральнага пракурора, Старшыні і членаў Праўлення Нацыянальнага банка;





3) выбірае шэсць суддзяў Канстытуцыйнага Суда;

4) выбірае шэсць членаў Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенню рэспубліканскіх рэферэндумаў;

5) адмяняе рашэнні мясцовых Саветаў дэпутатаў, якія не адпавядаюць заканадаўству;

6) прымае рашэнне аб роспуску мясцовага Савета дэпутатаў у выпадку сістэматычнага або грубага парушэння ім патрабаванняў заканадаўства і ў іншых выпадках, прадугледжаных законам;

7) разглядае выстаўленае Палатай прадстаўнікоў абвінавачанне супраць Прэзідэнта ва ўчыненні дзяржаўнай здрады або іншага цяжкага злачынства, прымае рашэнне аб яго расследаванні. Пры наяўнасці падстаў большасцю не менш як дзвюма трацямі галасоў ад поўнага складу прымае рашэнне аб зняцці Прэзідэнта з пасады;

8) разглядае ўказы Прэзідэнта аб увядзенні надзвычайнага становішча, ваеннага становішча, поўнай або частковай мабілізацыі і не пазней як у трохдзённы тэрмін пасля іх унясення прымае адпаведнае рашэнне;

9) ажыццяўляе права заканадаўчай ініцыятывы.

Палата прадстаўнікоў і Савет Рэспублікі сумесна:

па прапанове Прэзідэнта прымаюць закон аб дэлегаванні яму заканадаўчых паўнамоцтваў на выданне дэкрэтаў, якія маюць сілу закона;

разглядаюць пытанні аб датэрміновым вызваленні ад пасады або зняцці з пасады Прэзідэнта;

прымаюць прапанову аб правядзенні рэспубліканскага рэферэндуму і ўносяць яе на разгляд Прэзідэнту.

Палата прадстаўнікоў і Савет Рэспублікі таксама:

разглядаюць часовыя дэкрэты Прэзідэнта, якія маюць сілу закона;

заслухоўваюць штогадовыя пасланні Прэзідэнта да Парламента;

выбіраюць са свайго складу Старшыню адпаведнай палаты Парламента, яго намесніка, пастаянныя камісіі і іншыя органы для вядзення законапраектнай работы, папярэдняга разгляду і падрыхтоўкі пытанняў, якія адносяцца да ведання палат;

праводзяць пасяджэнні для пытанняў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў і членаў Савета Рэспублікі і адказаў Урада;

звяртаюцца ў Канстытуцыйны Суд з прапановамі аб дачы заключэнняў аб канстытуцыйнасці нарматыўных актаў або іх асобных палажэнняў;

даюць згоду на ўзбуджэнне крымінальнай справы ў адносінах да дэпутата Палаты прадстаўнікоў, члена Савета Рэспублікі, на прыцягненне іх у якасці падазроных ці абвінавачаных па крымінальнай справе, узбуджанай у адносінах да іншых асоб або па факце здзейсненага злачынства, а таксама на іх затрыманне і іншае пазбаўленне асабістай свабоды;

праводзяць парламенцкія слуханні.

Палата прадстаўнікоў, Савет Рэспублікі могуць прымаць рашэнні па іншых пытаннях, калі гэта прадугледжана Канстытуцыяй.

Палаты Нацыянальнага сходу пры ўзаемадзеянні з іншымі дзяржаўнымі органамі, органамі тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання, іншымі арганізацыямі самастойныя ў межах сваіх паўнамоцтваў.

## Формы работы палат Парламента

Работа Палаты прадстаўнікоў ажыццяўляецца ў форме пасяджэнняў, сумесных пасяджэнняў з Саветам Рэспублікі ў перыяд правядзення сесіі, парламенцкіх слуханняў, дзейнасці пастаянных і часовых камісій, іншых органаў Палаты прадстаўнікоў, дэпутацкіх груп, дэпутатаў у Палаце прадстаўнікоў, выбарчых акругах, а таксама ў іншых формах у адпаведнасці з заканадаўствам.

Работа Савета Рэспублікі ажыццяўляецца ў форме пасяджэнняў, сумесных пасяджэнняў з Палатай прадстаўнікоў у перыяд правядзення сесіі, парламенцкіх слуханняў, дзейнасці пастаянных і часовых камісій, іншых органаў Савета Рэспублікі, кансультатыўных і дарадчых органаў, якія ствараюцца пры Савеце Рэспублікі, членаў Савета Рэспублікі, а таксама ў іншых формах у адпаведнасці з заканадаўствам.

## Сесіі палат Парламента

Палаты збіраюцца на дзве чарговыя сесіі ў год.

Першая сесія адкрываецца 2 кастрычніка; яе працягласць не можа быць больш як восемдзесят дзён. Другая сесія адкрываецца 2 красавіка; яе працягласць не можа быць больш як дзевяноста дзён.

Палата прадстаўнікоў, Савет Рэспублікі ў выпадку асаблівай неабходнасці склікаюцца на нечарговую сесію па ініцыятыве Прэзідэнта, а таксама па патрабаванню большасці не менш як дзве трэці галасоў ад поўнага складу кожнай з палат па вызначаным парадку дня. Нечарговыя сесіі склікаюцца ўказамі Прэзідэнта.

## Старшыні палат Парламента

Палата прадстаўнікоў і Савет Рэспублікі выбіраюць са свайго складу адпаведна Старшыню Палаты прадстаўнікоў і яго намесніка і Старшыню Савета Рэспублікі і яго намесніка.

Старшыня палаты Нацыянальнага сходу:

• ажыццяўляе агульнае кіраўніцтва палатай Нацыянальнага сходу і кіруе яго ўнутраным распарадкам работы;

• вядзе пасяджэнні адпаведнай палаты Нацыянальнага сходу;

• узначальвае адпаведна Савет Палаты прадстаўнікоў, Прэзідыум Савета Рэспублікі;

• дае даручэнні пастаянным камісіям, сакратарыятам і іншым органам палаты Нацыянальнага сходу па пытаннях, якія адносяцца да іх ведання;

• падпісвае пастановы палаты Нацыянальнага сходу і рашэнні адпаведна Савета Палаты прадстаўнікоў, Прэзідыума Савета Рэспублікі;

• прадстаўляе палату Нацыянальнага сходу ва ўзаемаадносінах з Прэзідэнтам, другой палатай Нацыянальнага сходу, Урадам і іншымі дзяржаўнымі органамі, а таксама з грамадскімі аб’яднаннямі, органамі і арганізацыямі замежных дзяржаў, міжнароднымі арганізацыямі, каардынуе ўзаемадзеянне палаты Нацыянальнага сходу з указанымі органамі, аб’яднаннямі і арганізацыямі;

• накіроўвае і кантралюе дзейнасць сакратарыята палаты Нацыянальнага сходу;

• выдае распараджэнні па пытаннях, аднесеных да іх кампетэнцыі;

• ажыццяўляе іншыя паўнамоцтвы, прадугледжаныя Рэгламентам адпаведнай палаты Нацыянальнага сходу і іншымі актамі заканадаўства.

## Савет Палаты прадстаўнікоў і Прэзідыум Савета Рэспублікі

Для арганізацыі законапраектнай работы, папярэдняга разгляду і падрыхтоўкі пытанняў, якія адносяцца да ведання палат Нацыянальнага сходу, арганізацыі работы пастаянных камісій і іншых органаў палат Нацыянальнага сходу ствараюцца Савет Палаты прадстаўнікоў і Прэзідыум Савета Рэспублікі.

Савет Палаты прадстаўнікоў, Прэзідыум Савета Рэспублікі з’яўляюцца пастаянна дзеючымі калегіяльнымі органамі, падсправаздачнымі адпаведна Палаце прадстаўнікоў і Савету Рэспублікі.

У склад Савета Палаты прадстаўнікоў уваходзяць Старшыня Палаты прадстаўнікоў, яго намеснік, старшыні пастаянных камісій Палаты прадстаўнікоў і іншыя дэпутаты Палаты прадстаўнікоў.

У склад Прэзідыума Савета Рэспублікі ўваходзяць Старшыня Савета Рэспублікі, яго намеснік, старшыні пастаянных камісій Савета Рэспублікі.

Савет Палаты прадстаўнікоў, Прэзідыум Савета Рэспублікі:

• арганізуюць работу па падрыхтоўцы сесій адпаведных палат Нацыянальнага сходу;

• прымаюць рашэнні аб унясенні праекта парадку дня сесіі палаты Нацыянальнага сходу на разгляд адпаведнай палаты Нацыянальнага сходу;

• вырашаюць пытанні, звязаныя са скліканнем і правядзеннем сесій палат Нацыянальнага сходу;

• заслухоўваюць паведамленні па пытаннях работы пастаянных камісій, іншых органаў палат Нацыянальнага сходу;

• даюць сакратарыятам палат Нацыянальнага сходу даручэнні, звязаныя са скліканнем і правядзеннем сесій палат Нацыянальнага сходу, з законапраектнай дзейнасцю і іншымі пытаннямі, якія адносяцца да іх ведання;

• уносяць у выпадку неабходнасці прапановы аб стварэнні, рэарганізацыі або ліквідацыі пастаянных і часовых камісій палат Нацыянальнага сходу;

• прымаюць меры па арганізацыйнаму, прававому, метадычнаму і інфармацыйнаму забеспячэнню дзейнасці пастаянных камісій і іншых органаў палат Нацыянальнага сходу;

• хадайнічаюць перад Прэзідэнтам аб узнагароджанні адпаведна дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, членаў Савета Рэспублікі, работнікаў сакратарыятаў палат Нацыянальнага сходу дзяржаўнымі ўзнагародамі Рэспублікі Беларусь;

• прымаюць рашэнні аб узнагароджанні Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь;

• ажыццяўляюць кантроль за своечасовым разглядам запытаў, прапаноў і заўваг дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, членаў Савета Рэспублікі;

• ажыццяўляюць іншыя паўнамоцтвы, прадугледжаныя рэгламентамі палат Нацыянальнага сходу і іншымі актамі заканадаўства.

## Камісіі палат Парламента

Палата прадстаўнікоў і Савет Рэспублікі выбіраюць пастаянныя камісіі палат Нацыянальнага сходу для вядзення законапраектнай работы, папярэдняга разгляду і падрыхтоўкі пытанняў, якія адносяцца да ведання палат Нацыянальнага сходу.

Пастаянныя камісіі з'яўляюцца пастаянна дзеючымі органамі палат Нацыянальнага сходу і выбіраюцца з ліку дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, членаў Савета Рэспублікі адпаведнай палатай Нацыянальнага сходу на тэрмін паўнамоцтваў палаты ў складзе старшыні, намесніка (намеснікаў) старшыні і членаў пастаянных камісій.

Кожны дэпутат Палаты прадстаўнікоў, член Савета Рэспублікі абавязаны ўваходзіць у склад толькі адной з пастаянных камісій. Старшыні палат Нацыянальнага сходу і іх намеснікі не могуць уваходзіць у склад пастаянных камісій.

Пералік і склад пастаянных камісій, парадак іх фарміравання вызначаюцца палатамі Нацыянальнага сходу самастойна.

Палатай прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь трэцяга склікання былі ўтвораны наступныя пастаянныя камісіі:

- па заканадаўству і судова-прававых пытаннях;
- па нацыянальнай бяспецы;
- па дзяржаўнаму будаўніцтву, мясцоваму самакіраванню і рэгламенту;
- па аграрных пытаннях;
- па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічнаму прагрэсу;
- па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі;
- па міжнародных справах і сувязях з СНД;
- па праблемах чарнобыльскай катастрофы, экалогіі і прыродакарыстанню;
- па бюджэту, фінансах і падатковай палітыцы;
- па грашова-крэдытнай палітыцы і банкаўскай дзейнасці;
- па працы, сацыяльнай абароне, справах ветэранаў і інвалідаў;
- па ахове здароўя, фізічнай культуры, справах сям'і і моладзі;
- па жыллёвай палітыцы, будаўніцтву, гандлю і прыватызацыі;
- па прамысловасці, паліўна-энергетычнаму комплексу, транспарту, сувязі і прадпрымальніцтву.

Саветам Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь трэцяга склікання былі ўтвораны шэсць пастаянных камісій:

- па заканадаўству і дзяржаўнаму будаўніцтву;
- па эканоміцы, бюджэту і фінансах;
- па адукацыі, навуцы, культуры і гуманітарных пытаннях;
- па дэмаграфічнай бяспецы і сацыяльнаму развіццю;
- па рэгіянальнай палітыцы і мясцоваму самакіраванню;
- па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы.

У Рэгламенце Савета Рэспублікі замацавана кола пытанняў, якія ўваходзяць у кампетэнцыю кожнай з пастаянных камісій Савета Рэспублікі.

Пастаянныя камісіі палат Нацыянальнага сходу:

- рыхтуюць праекты законаў да разгляду палатамі Нацыянальнага сходу;
- папярэдне разглядаюць і рыхтуюць пытанні, якія адносяцца да кампетэнцыі палат Нацыянальнага сходу;
- ажыццяўляюць падрыхтоўку заключэнняў па праектах законаў і іншых нарматыўных прававых актаў, а таксама па іншых пытаннях, якія адносяцца да кампетэнцыі палат Нацыянальнага сходу;
- па даручэнню старшыняў палат Нацыянальнага сходу, а таксама па сваёй ініцыятыве распрацоўваюць праекты законаў і іншых нарматыўных прававых актаў;
- разглядаюць пісьмовыя звароты грамадзян і арганізацый, якія ўтрымліваюць прапановы па ўдасканаленню заканадаўства;
- арганізуюць правядзенне парламенцкіх слуханняў;
- запытваюць у дзяржаўных органах і іншых дзяржаўных арганізацыях, службовых асоб афіцыйныя дакументы, інфармацыйныя і іншыя матэрыялы, неабходныя для дзейнасці пастаяннай камісіі;
- ажыццяўляюць іншыя паўнамоцтвы, прадугледжаныя рэгламентамі палат Нацыянальнага сходу і іншымі актамі заканадаўства.

Палаты Нацыянальнага сходу пры неабходнасці могуць таксама ствараць часовыя камісіі. Часовая камісія падсправаздачная адпаведнай палаце Парламента і адказная перад ёй.

## Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў і члены Савета Рэспублікі

Ажыццяўленне Палатай прадстаўнікоў і Саветам Рэспублікі дзяржаўнай улады ў межах іх паўнамоцтваў грунтуецца на актыўным і раўнапраўным удзеле ў рабоце кожнага дэпутата Палаты прадстаўнікоў, члена Савета Рэспублікі.

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў ажыццяўляюць свае паўнамоцтвы ў Парламенце на прафесійнай аснове, калі іншае не прадугледжана Канстытуцыяй. Член Савета Рэспублікі ажыццяўляе свае паўнамоцтвы ў Парламенце на прафесійнай аснове або без адрыву ад вытворчай ці службовай дзейнасці.

Не дапускаецца сумяшчэнне абавязкаў дэпутата Палаты прадстаўнікоў з адначасовым займаннем пасады Прэзідэнта ці суддзі. Дэпутат Палаты прадстаўнікоў не можа быць адначасова членам Савета Рэспублікі, дэпутатам мясцовага Савета дэпутатаў, але можа быць членам Урада. Член Савета Рэспублікі не можа быць адначасова Прэзідэнтам, дэпутатам Палаты прадстаўнікоў, членам Урада або суддзёй.

Дэпутат Палаты прадстаўнікоў, член Савета Рэспублікі валодаюць усёй паўнатой правоў, якія забяспечваюць іх актыўны ўдзел у дзейнасці Палаты прадстаўнікоў, Савета Рэспублікі, пастаянных ці часовых камісій, што ўтвараюцца імі, іншых органаў палат Нацыянальнага сходу.

Асноўнымі формамі дзейнасці дэпутата Палаты прадстаўнікоў, члена Савета Рэспублікі з'яўляюцца:

- удзел адпаведна ў пасяджэннях Палаты прадстаўнікоў, Савета Рэспублікі, сумесных пасяджэннях Палаты прадстаўнікоў, Савета Рэспублікі;
- удзел у рабоце пастаянных камісій і іншых органаў палат Нацыянальнага сходу;
- удзел у рабоце пагаджальных камісій, якія ствараюцца Палатай

прадстаўнікоў і Саветам Рэспублікі ў адпаведнасці з часткай чацвёртай артыкула 100 Канстытуцыі;

• работа ў выбарчых акругах;
• удзел у рабоце міжпарламенцкіх органаў і органаў міждзяржаўных утварэнняў, у склад якіх уваходзіць Рэспубліка Беларусь;
• удзел у парламенцкіх слуханнях;
• удзел у рабоце дэпутацкіх груп Палаты прадстаўнікоў, аб'яднанняў, асацыяцый, клубаў і інш.

На пасяджэннях Палаты прадстаўнікоў, Савета Рэспублікі дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, члены Савета Рэспублікі на аснове калектыўнага, раўнапраўнага і свабоднага абмеркавання разглядаюць і вырашаюць пытанні, аднесеныя Канстытуцыяй адпаведна да ведання Палаты прадстаўнікоў, Савета Рэспублікі.

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў для калектыўнага абмеркавання і выказвання думак па законапраектах і іншых пытаннях, якія адносяцца да ведання Палаты прадстаўнікоў, а таксама па рэалізацыі перадвыбарных праграм маюць права аб'ядноўвацца ў пастаянныя ці часовыя дэпутацкія групы. Дэпутацкая група ўтвараецца пры наяўнасці не менш за 10 дэпутатаў, якія жадаюць увайсці ў яе склад. Дэпутаты могуць свабодна ўваходзіць у дэпутацкія групы і выходзіць з іх.

Дэпутат Палаты прадстаўнікоў, член Савета Рэспублікі як члены прадстаўнічага і заканадаўчага органа Рэспублікі Беларусь нясуць адказнасць перад выбаршчыкамі і адпаведна перад Палатай прадстаўнікоў, Саветам Рэспублікі.

Дэпутат Палаты прадстаўнікоў, член Савета Рэспублікі карыстаюцца недатыкальнасцю пры выказванні сваіх думак і ажыццяўленні сваіх паўнамоцтваў, за выключэннем выпадкаў абвінавачання іх у паклёпе і знявазе. На працягу ўсяго тэрміну сваіх паўнамоцтваў парламентарыі могуць быць арыштаваны, іншым чынам пазбаўлены асабістай свабоды толькі з папярэдняй згоды адпаведнай палаты, за выключэннем выпадкаў здзяйснення здрады дзяржаве ці іншага асабліва цяжкага злачынства, а таксама затрымання на месцы здзяйснення злачынства.

## Парламенцкая працэдура

Пасяджэнні палат Нацыянальнага сходу праводзяцца адкрыта, на беларускай ці рускай мове. Палаты, калі гэтага патрабуюць інтарэсы дзяржавы, могуць прыняць рашэнне аб правядзенні закрытага пасяджэння. Пасяджэнне адпаведнай палаты Нацыянальнага сходу лічыцца правамоцным пры ўмове, што на ім прысутнічае не менш як дзве трэці дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, членаў Савета Рэспублікі ад поўнага складу палаты.

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў і члены Савета Рэспублікі маюць права выбіраць і быць выбранымі ў органы палат Нацыянальнага сходу, уносіць прапановы і выказваць думку па персанальнаму складу гэтых органаў, а таксама па кандыдатурах службовых асоб, якія выбіраюцца, назначаюцца ці зацвярджаюцца палатамі Нацыянальнага сходу. Парламентарыі маюць права ўносіць прапановы і заўвагі па парадку дня сесіі, парадку разгляду і сутнасці пытанняў, што абмяркоўваюцца, прапаноўваць пытанні для разгляду на пасяджэннях палат Нацыянальнага сходу, удзельнічаць у спрэчках, задаваць пытанні, даваць даведкі, даводзіць да ведама парламентарыяў свой пункт гледжання і пункт гледжання сваіх выбаршчыкаў.

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў і члены Савета Рэспублікі карыстаюцца правам рашаючага голасу па ўсіх пытаннях, якія разглядаюцца ў адпаведнай палаце Нацыянальнага сходу. Галасаванне ў Палаце прадстаўнікоў і Савеце Рэспублікі адкрытае і ажыццяўляецца асабіста дэпутатам Палаты прадстаўнікоў, членам Савета Рэспублікі шляхам падачы голасу «за» або «супраць». Тайнае галасаванне праводзіцца пры вырашэнні кадравых пытанняў.

Рашэнні палат Нацыянальнага сходу лічацца прынятымі пры ўмове, што за іх прагаласавала большасць ад поўнага складу палат, калі іншае не прадугледжана Канстытуцыяй. Законы аб асноўных напрамках унутранай і знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь, аб ваеннай дактрыне Рэспублікі Беларусь з'яўляюцца праграмнымі і лічацца прынятымі пры ўмове, калі за іх прагаласавала не менш як дзве трэці ад поўнага складу палат.

Рашэнні Палаты прадстаўнікоў прымаюцца ў форме законаў і пастаноў. Рашэнні Савета Рэспублікі прымаюцца ў форме пастаноў.

Парадак дзейнасці Палаты прадстаўнікоў, Савета Рэспублікі, іх органаў, дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў і членаў Савета Рэспублікі вызначаецца рэгламентамі палат Нацыянальнага сходу.

## Заканадаўчы працэс

Законапраект, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных Канстытуцыяй, становіцца законам Рэспублікі Беларусь пасля прыняцця яго Палатай прадстаўнікоў і адабрэння Саветам Рэспублікі.

Заканадаўчы працэс пачынаецца з унясення праекта закона ў Палату прадстаўнікоў суб'ектамі права заканадаўчай ініцыятывы. Права заканадаўчай ініцыятывы належыць Прэзідэнту, дэпутатам Палаты прадстаўнікоў, Савету Рэспублікі, Ураду, а таксама грамадзянам Рэспублікі Беларусь, якія валодаюць выбарчым правам, у колькасці не менш як 50 тысяч чалавек.

Права заканадаўчай ініцыятывы па ўнясенню змяненняў і (ці) дапаўненняў у Канстытуцыю, аб тлумачэнні Канстытуцыі належыць Прэзідэнту або не менш як 150 тысячам грамадзян Рэспублікі Беларусь, якія валодаюць выбарчым правам.

Праект закона аб бюджэце Рэспублікі Беларусь на чарговы фінансавы год уносіцца Прэзідэнтам.

Акрамя таго, Канстытуцыя ўстанаўлівае асобы парадак для ўнясення законапраектаў, вынікам прыняцця якіх можа стаць скарачэнне дзяржаўных сродкаў, стварэнне або павелічэнне расходаў. У гэтым выпадку патрабуецца згода Прэзідэнта ці па яго даручэнню Урада.

Суб'ект права заканадаўчай ініцыятывы (упаўнаважаны ім прадстаўнік) мае права прымаць удзел у рабоце над законапраектам у Палаце прадстаўнікоў, Савеце Рэспублікі, прадстаўляць свой праект, выкладаць яго канцэпцыю і доказы на карысць яго прыняцця, а таксама адазваць унесены законапраект да яго разгляду ў Палаце прадстаўнікоў у другім чытанні.

Разгляд праектаў законаў Рэспублікі Беларусь, унесеных у Палату прадстаўнікоў, ажыццяўляецца, як правіла, у двух чытаннях.

У выніку разгляду праекта закона Рэспублікі Беларусь Палата прадстаўнікоў прымае законапраект або адхіляе яго.

Прынятыя Палатай прадстаўнікоў законапраекты на працягу пяці дзён перадаюцца на разгляд у Савет Рэспублікі, дзе могуць разглядацца не больш як дваццаць дзён, калі іншае не прадугледжана Канстытуцыяй.

Закон лічыцца адобраным Саветам Рэспублікі, калі за такое рашэнне прагаласавала большасць ад поўнага складу Савета Рэспублікі або калі на працягу дваццаці дзён, а пры абвяшчэнні законапраекта тэрміновым – дзесяці дзён з дня ўнясення ён не быў разгледжаны Саветам Рэспублікі.

Закон, прынятьі Палатай прадстаўнікоў і адобраны Саветам Рэспублікі, прадстаўляецца ў дзесяцідзённы тэрмін Прэзідэнту на подпіс.

Калі рашэнне аб адабрэнні не прынята, праект закона Рэспублікі Беларусь лічыцца адхіленым.

У выпадку адхілення законапраекта Саветам Рэспублікі палаты Нацыянальнага сходу могуць стварыць пагаджальную камісію, якая фарміруецца на парытэтнай аснове, для пераадолення рознагалоссяў, што ўзніклі. Тэкст законапраекта, выпрацаваны пагаджальнай камісіяй, прадстаўляецца на адабрэнне абедзвюх палат.

Калі пагаджальнай камісіяй не прыняты ўзгоднены тэкст законапраекта, Прэзідэнт або па яго даручэнню Урад могуць запатрабаваць, каб Палата прадстаўнікоў прыняла канчатковае рашэнне. Закон лічыцца прынятым Палатай прадстаўнікоў пры ўмове, што за яго прагаласавала не менш як дзве трэці ад поўнага складу Палаты прадстаўнікоў, і накіроўваецца на подпіс Прэзідэнту.

Канстытуцыя прадугледжвае асобую працэдуру разгляду некаторых законапраектаў. Так, па патрабаванню Прэзідэнта або з яго згоды Урада Палата прадстаўнікоў, Савет Рэспублікі прымаюць рашэнні, галасуючы за ўвесь унесены Прэзідэнтам або Урадам законапраект ці яго частку, захаваўшы толькі тыя папраўкі, якія прапанаваны ці прыняты Прэзідэнтам або Урадам. Акрамя таго, у адпаведнасці з часткай трэцяй артыкула 99 Канстытуцыі Прэзідэнт або па яго даручэнню Урад маюць права ўнесці ў Палату прадстаўнікоў і Савет Рэспублікі прапанову аб абвяшчэнні разгляду праекта закона тэрміновым. Палата прадстаўнікоў і Савет Рэспублікі ў гэтым выпадку павінны разгледзець дадзены законапраект на працягу дзесяці дзён з дня яго ўнясення на іх разгляд.

## Падпісанне законаў Прэзідэнтам

Калі Прэзідэнт згодны з тэкстам закона, прынятага Палатай прадстаўнікоў і адобранага Саветам Рэспублікі, ён яго падпісвае. Калі Прэзідэнт не вяртае які-небудзь закон на працягу двух тыдняў пасля таго, як ён быў яму прадстаўлены на подпіс, закон лічыцца падпісаным. Закон не лічыцца падпісаным і не ўступае ў сілу, калі ён не мог быць вернуты ў Парламент у сувязі з заканчэннем сесіі.

Пры нязгодзе з тэкстам закона Прэзідэнт вяртае яго са сваімі пярэчаннямі ў Палату прадстаўнікоў, якая павінна разгледзець закон з пярэчаннямі Прэзідэнта не пазней як праз трыццаць дзён у перыяд правядзення сесіі Палаты прадстаўнікоў. Калі закон будзе прыняты Палатай прадстаўнікоў большасцю не менш як дзве трэці галасоў ад поўнага складу, ён разам з пярэчаннямі Прэзідэнта ў пяцідзённы тэрмін накіроўваецца ў Савет Рэспублікі, які таксама павінен разгледзець яго паўторна не пазней як праз дваццаць дзён. Закон лічыцца прынятым, калі ён адобраны большасцю не менш як дзвюма трацямі галасоў ад поўнага складу Савета Рэспублікі. Закон пасля пераадолення Палатай прадстаўнікоў і Саветам Рэспублікі пярэчанняў Прэзідэнта падпісваецца Прэзідэнтам у пяцідзённы тэрмін. Закон уступае ў сілу і ў тым выпадку, калі ён не будзе падпісаны Прэзідэнтам у гэты тэрмін.

У такім жа парадку палатамі Нацыянальнага сходу разглядаюцца пярэчанні Прэзідэнта на асобныя палажэнні закона, якія вяртаюцца для паўторнага галасавання. У гэтым выпадку да прыняцця адпаведнага рашэння Палатай прадстаўнікоў і Саветам Рэспублікі закон падпісваецца Прэзідэнтам і ўступае ў сілу, за выключэннем тых палажэнняў, адносна якіх маюцца пярэчанні Прэзідэнта.

## Узаемадзеянне з органамі мясцовага самакіравання

Важным напрамкам у рабоце Парламента трэцяга склікання з'яўляецца ўзаемадзеянне з органамі мясцовага самакіравання. Пры Савеце Рэспублікі ўтвораны Савет па ўзаемадзеянню органаў мясцовага самакіравання. Гэта калегіяльны дарадчы орган, які ажыццяўляе распрацоўку прапаноў па ўдасканаленню дзейнасці органаў мясцовага самакіравання і каардынуе пытанні ўзаемадзеяння паміж імі і органамі дзяржаўнага кіравання. Сярод асноўных задач Савета – тлумачэнне і прапаганда дзяржаўнай палітыкі ў галіне мясцовага самакіравання, выпрацоўка рэкамендацый і прапаноў па фарміраванню і рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі ў гэтай сферы, садзейнічанне забеспячэнню збалансаванага падыходу да рэалізацыі дзяржаўных і мясцовых інтарэсаў пры распрацоўцы і ажыццяўленні сацыяльна-эканамічных праграм і інш.

У склад Савета па ўзаемадзеянню органаў мясцовага самакіравання ўваходзяць члены Савета Рэспублікі, прадстаўнікі органаў мясцовага самакіравання, дзяржаўных органаў Рэспублікі Беларусь.

Савет па ўзаемадзеянню органаў мясцовага самакіравання асаблівую ўвагу надае вывучэнню ходу выканання рашэнняў і даручэнняў Кіраўніка дзяржавы, накіраваных на павышэнне ролі органаў мясцовага кіравання і самакіравання ў вырашэнні пытанняў жыццезабеспячэння насельніцтва, распаўсюджанню перадавога вопыту іх работы. У мэтах разгляду актуальных праблем мясцовага жыцця і выпрацоўкі механізмаў іх вырашэння, паскарэння прыняцця неабходных арганізацыйных і прававых рашэнняў Саветам праводзяцца сустрэчы, у тым ліку ў фармаце «круглага стала», са старшынямі Саветаў дэпутатаў першаснага і базавага тэрытарыяльных узроўняў, а таксама з удзелам прадстаўнікоў органаў выканаўчай улады. Для вызначэння найлепшых форм і метадаў сумеснай работы органаў мясцовага кіравання і самакіравання Савет арганізуе і праводзіць рэспубліканскія тэматычныя семінары.

## Міжнароднае і міжпарламенцкае супрацоўніцтва

Асноўнай мэтай міжнароднай дзейнасці Нацыянальнага сходу з’яўляецца забеспячэнне нацыянальных інтарэсаў беларускай дзяржавы і ўмацаванне яе пазіцый на міжнароднай арэне. Для паглыблення кантактаў з міжпарламенцкімі арганізацыямі, а таксама пашырэння двухбаковых адносін у Нацыянальным сходзе працуюць 12 пастаянна дзеючых дэлегацый, 46 рабочых груп па супрацоўніцтву з парламентамі краін свету і міжпарламенцкія камісіі па супрацоўніцтву з заканадаўчымі органамі Украіны і Арменіі.

Актыўны ўдзел беларускіх парламентарыяў у рабоце міжпарламенцкіх арганізацый і эфектыўнае ўзаемадзеянне з калегамі з замежных краін садзейнічае ўдасканаленню нацыянальнага заканадаўства, выпрацоўцы кансалідаванага падыходу да вырашэння актуальных праблем сучаснасці і ўзбагачэнню практыкі міждзяржаўных адносін. Акрамя таго, Нацыянальны сход ратыфікуе міжнародныя дагаворы Рэспублікі Беларусь, заключаныя ў мэтах урэгулявання двухбаковых і шматбаковых адносін у палітычнай, гандлёва-эканамічнай, навукова-тэхнічнай, культурнай, гуманітарнай і іншых сферах дзейнасці.

## Парламенцкія слуханні

Адной з форм дзейнасці палат Нацыянальнага сходу з’яўляюцца парламенцкія слуханні, якія праводзяцца па канкрэтных праблемах ці пытаннях, што адносяцца да кампетэнцыі палат. Ініцыятарамі парламенцкіх слуханняў выступаюць, як правіла, пастаянныя камісіі палат Парламента. У слуханнях прымаюць удзел дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, члены Савета Рэспублікі, прадстаўнікі іншых дзяржаўных органаў, вучоныя, спецыялісты, практыкі, прадстаўнікі грамадскасці, іншыя зацікаўленыя.

У ходзе правядзення парламенцкіх слуханняў абмяркоўваюцца найбольш актуальныя пытанні дзяржаўнага і грамадскага жыцця. Па выніках слуханняў у рамках паўнамоцтваў палат Нацыянальнага сходу могуць быць прыняты адпаведныя рэкамендацыі дзяржаўным органам, іншым суб’ектам грамадскіх адносін.

## Формы ўзаемадзеяння з Урадам

У перыяд правядзення сесій палат Нацыянальнага сходу адно пасяджэнне ў месяц рэзервуецца для пытанняў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў і членаў Савета Рэспублікі і адказаў Урада.

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, члены Савета Рэспублікі, якія жадаюць накіраваць пытанні Ураду, падаюць іх у пісьмовай форме ў сакратарыят адпаведнай палаты не пазней чым за сем дзён да дня правядзення пасяджэння. У выпадку, калі член Урада не можа быць на пасяджэнні, ён мае права даць пісьмовы адказ на зададзеныя пытанні, які даводзіцца да ведама дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, членаў Савета Рэспублікі ўпаўнаважанай ім службовай асобай. Парламентарыі могуць пісьмова або вусна задаваць іншыя пытанні членам Урада Рэспублікі Беларусь, якія ўдзельнічаюць у пасяджэнні.





Пытанні да Урада – адна з форм ажыццяўлення кантрольных паўнамоцтваў Парламента. Прадстаўнікі заканадаўчай улады маюць магчымасць атрымаць кампетэнтныя адказы па шырокім коле палітычных, эканамічных і сацыяльных праблем. Адкрыты дыялог дазваляе абодвум бакам вызначыць задачы, якія павінны вырашацца ў першую чаргу ў інтарэсах народа, і садзейнічае павышэнню эфектыўнасці работы дзяржаўнага апарату наогул.

Парламентарыі таксама маюць права звярнуцца з запытам да Прэм’ер-міністра, членаў Урада і кіраўнікоў дзяржаўных органаў, што ўтвараюцца або выбіраюцца Парламентам, па пытаннях, якія ўваходзяць у кампетэнцыю гэтых органаў. Адказ на запыт павінен быць дадзены на працягу дваццаці сесіённых дзён.

Асобы, да якіх звернуты запыт, нясуць устаноўленую заканадаўствам адказнасць за своечасовасць яго разгляду, паўнату і дакладнасць прадстаўленай інфармацыі. Па выніках абмеркавання запыту і адказу на яго можа быць прынята пастанова палаты.

Парламентарыі таксама прымаюць актыўны ўдзел у пасяджэннях Прэзідыума Савета Міністраў. Гэта дазваляе ўлічваць інфармацыю аб праблемах правапрымяняльнай практыкі ў іх заканадаўчай дзейнасці, садзейнічае выпрацоўцы новых заканадаўчых ініцыятыў, якія адпавядаюць рэаліям і патрэбам сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны.

## Вучоба дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў і членаў Савета Рэспублікі

Адной з важнейшых складальных павышэння эфектыўнасці работы Парламента з’яўляецца вучоба дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў і членаў Савета Рэспублікі. Мэта яе заключаецца ў атрыманні паглыбленых ведаў па актуальных напрамках сацыяльна-эканамічнага і палітычнага жыцця грамадства і дзяржавы.

У цяперашні час паспяхова спалучаюцца дзве асноўныя формы навучання – тэарэтычная (пасяджэнні, «круглыя сталы», сустрэчы і інш.) і практычная (непасрэднае вывучэнне работы цэнтральных і мясцовых дзяржаўных органаў, дзейнасці гаспадарчых суб’ектаў, функцыянавання аб’ектаў аховы здароўя, культуры і інш.).

Тэарэтычнае навучанне, як правіла, праводзіцца па актуальных пытаннях сацыяльна-эканамічнага і палітычнага развіцця дзяржавы, у тым ліку па пытаннях, якія датычацца разгляду і прыняцця найбольш важных законапраектаў. Перад дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў і членамі Савета Рэспублікі выступаюць члены Урада, кіруючыя работнікі рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, іншых арганізацый, прадстаўнікі мясцовых органаў улады, вядомыя беларускія і замежныя вучоныя, спецыялісты-практыкі.

У мэтах паглыбленага вывучэння асобных пытанняў праводзяцца практычныя заняткі. Заключная частка заняткаў адводзіцца для падагульняючага абмеркавання тэмы. Удзельнікі дыскусіі ўносяць канкрэтныя прапановы па вырашэнню абмяркаваных пытанняў і вызначаюць магчымыя напрамкі заканадаўчага забеспячэння неабходных пераўтварэнняў.

Вучоба дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў і членаў Савета Рэспублікі садзейнічае павышэнню ўзроўню іх агульных ведаў і палітычнай культуры, стымулюе выкарыстанне новых падыходаў да ажыццяўлення сваіх паўнамоцтваў, паляпшае якасць заканатворчасці. Атрыманыя падчас вучобы веды і практычныя навыкі дазваляюць дэпутатам Палаты прадстаўнікоў і членам Савета Рэспублікі павысіць эфектыўнасць сваёй дзейнасці па наладжванню і развіццю міжнародных кантактаў і міжпарламенцкіх сувязяў і актыўна выкарыстоўваюцца імі пры ўзаемадзеянні з іншымі дзяржаўнымі органамі, а таксама ў рабоце з выбаршчыкамі.

# ПАРЛАМЕНТ – НАЦИОНАЛЬНОЕ СОБРАНИЕ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

## Правовой статус и структура Парламента

Согласно статье 90 Конституции Республики Беларусь, Парламент – Национальное собрание Республики Беларусь является представительным и законодательным органом Республики Беларусь.

Парламент Республики Беларусь:

- принимает законы;
- утверждает государственный бюджет и отчет о его исполнении;
- участвует в формировании органов исполнительной и судебной власти;
- реализует некоторые контрольные полномочия;
- осуществляет межпарламентское сотрудничество.

Срок полномочий Парламента – четыре года. Полномочия Парламента могут быть продлены на основании закона только в случае войны.

Парламент состоит из двух палат – Палаты представителей и Совета Республики. Состав Палаты представителей – 110 депутатов. Полный состав Совета Республики – 64 члена Совета Республики.

## Формирование палат Парламента

В соответствии с Конституцией выборы нового состава палат Парламента назначаются не позднее четырех месяцев и проводятся не позднее 30 дней до окончания полномочий палат действующего созыва. Подготовка и проведение выборов депутатов Палаты представителей, членов Совета Республики осуществляются открыто и гласно.

Депутатом Палаты представителей может быть избран гражданин Республики Беларусь, достигший 21 года и постоянно проживающий в Республике Беларусь. Избрание депутатов Палаты представителей осуществляется в соответствии с законом на основе всеобщего, свободного, равного, прямого избирательного права при тайном голосовании.

Совет Республики является палатой территориального представительства. От каждой области и города Минска тайным голосованием избираются на заседаниях депутатов местных Советов депутатов базового уровня каждой области и города Минска по восемь членов Совета Республики. Восемь членов Совета Республики назначаются Президентом.



Парламент – Нацыянальны сход Рэспублікі Беларусь

Кандидатом в члены Совета Республики может быть гражданин Республики Беларусь, достигший 30 лет и проживший на территории соответствующей области, города Минска не менее пяти лет. Выборы членов Совета Республики проводятся на основе равного и косвенного избирательного права при тайном голосовании.

## Компетенция Парламента

Компетенция Национального собрания реализуется посредством осуществления полномочий палат Национального собрания в формах и пределах, установленных Конституцией и законами Республики Беларусь.

Палата представителей:

1) рассматривает по предложению Президента или по инициативе не менее 150 тысяч граждан Республики Беларусь, обладающих избирательным правом, проекты законов о внесении изменений и дополнений в Конституцию, о толковании Конституции;

2) рассматривает проекты законов, в том числе об утверждении основных направлений внутренней и внешней политики Республики Беларусь; военной доктрины; о ратификации и денонсации международных договоров; об основном содержании и принципах осуществления прав, свобод и обязанностей граждан; о гражданстве, статусе иностранцев и лиц без гражданства; о правах национальных меньшинств; об утверждении республиканского бюджета и отчета о его исполнении; об установлении республиканских налогов и сборов; о принципах осуществления отношений собственности; об основах социальной защиты; о принципах регулирования труда и занятости; о браке, семье, детстве, материнстве, отцовстве, воспитании, образовании, культуре и здравоохранении; об охране окружающей среды и рациональном использовании природных ресурсов; об определении порядка решения вопросов административно-территориального устройства государства; о местном самоуправлении; о судоустройстве, судопроизводстве и статусе судей; об уголовной ответственности; об амнистии; об объявлении войны и о заключении мира; о правовом режиме военного и чрезвычайного положения; об установлении государственных наград; о толковании законов;

3) назначает выборы Президента;

4) дает согласие Президенту на назначение Премьер-министра;

5) заслушивает доклад Премьер-министра о программе деятельности Правительства и одобряет или отклоняет программу; повторное отклонение палатой программы означает выражение вотума недоверия Правительству;

6) рассматривает по инициативе Премьер-министра вопрос о доверии Правительству;

7) по инициативе не менее одной трети от полного состава Палаты представителей выражает вотум недоверия Правительству; вопрос об ответственности Правительства не может быть поставлен в течение года после одобрения программы его деятельности;

8) принимает отставку Президента;

9) выдвигает большинством голосов от полного состава Палаты представителей обвинение против Президента в совершении государственной измены или иного тяжкого преступления; на основании соответствующего решения Совета Республики принимает большинством не менее двух третей голосов от полного состава решение о смещении Президента с должности;

10) отменяет распоряжения Председателя Палаты представителей.

Совет Республики:

1) одобряет или отклоняет принятые Палатой представителей проекты законов о внесении изменений и дополнений в Конституцию; о толковании Конституции; проекты иных законов;

2) дает согласие на назначение Президентом Председателя Конституционного Суда, Председателя и судей Верховного Суда, Председателя и судей Высшего Хозяйственного Суда, Председателя Центральной комиссии по выборам и проведению республиканских референдумов, Генерального прокурора, Председателя и членов Правления Национального банка;

3) избирает шесть судей Конституционного Суда;

4) избирает шесть членов Центральной комиссии Республики Беларусь по выборам и проведению республиканских референдумов;

5) отменяет решения местных Советов депутатов, не соответствующие законодательству;

6) принимает решение о роспуске местного Совета депутатов в случае систематического или грубого нарушения им требований законодательства и в иных случаях, предусмотренных законом;

7) рассматривает выдвинутое Палатой представителей обвинение против Президента в совершении государственной измены или иного тяжкого преступления, принимает решение о его расследовании. При наличии оснований большинством не менее двух третей голосов от полного состава принимает решение о смещении Президента с должности;

8) рассматривает указы Президента о введении чрезвычайного положения, военного положения, полной или частичной мобилизации и не позднее чем в трехдневный срок после их внесения принимает соответствующее решение;

9) осуществляет право законодательной инициативы.

Палата представителей и Совет Республики совместно:

по предложению Президента принимают закон о делегировании ему законодательных полномочий на издание декретов, имеющих силу закона;

рассматривают вопросы о досрочном освобождении от должности или смещении с должности Президента;

принимают предложение о проведении республиканского референдума и вносят его на рассмотрение Президенту.

Палата представителей и Совет Республики также:

- рассматривают временные декреты Президента, имеющие силу закона;
- заслушивают ежегодные послания Президента Парламенту;
- избирают из своего состава Председателя соответствующей палаты Парламента, его заместителя, постоянные комиссии и иные органы для ведения законопроектной работы, предварительного рассмотрения и подготовки вопросов, относящихся к ведению палаты;
- проводят заседания для вопросов депутатов Палаты представителей и членов Совета Республики и ответов Правительства;
- обращаются в Конституционный Суд с предложениями о даче заключений о конституционности нормативных актов или их отдельных положений;
- дают согласие на возбуждение уголовного дела в отношении депутата Палаты представителей, члена Совета Республики, на привлечение их в качестве подозреваемых или обвиняемых по уголовному делу, возбужденному в отношении других лиц либо по факту совершенного преступления, а также на их задержание и иное лишение личной свободы;
- проводят парламентские слушания.

Палата представителей, Совет Республики могут принимать решения по другим вопросам, если это предусмотрено Конституцией.

Палаты Национального собрания при взаимодействии с другими государственными органами, органами территориального общественного самоуправления, иными организациями самостоятельны в пределах своих полномочий.

## Формы работы палат Парламента

Работа Палаты представителей осуществляется в форме заседаний, совместных заседаний с Советом Республики в период проведения сессии, парламентских слушаний, деятельности постоянных и временных комиссий, других органов Палаты представителей, депутатских групп, депутатов в Палате представителей, избирательных округах, а также в иных формах в соответствии с законодательством.

Работа Совета Республики осуществляется в форме заседаний, совместных заседаний с Палатой представителей в период проведения сессии, парламентских слушаний, деятельности постоянных и временных комиссий, других органов Совета Республики, консультативных и совещательных органов, создаваемых при Совете Республики, членов Совета Республики, а также в иных формах в соответствии с законодательством.

## Сессии палат Парламента

Палаты собираются на две очередные сессии в год.

Первая сессия открывается 2 октября; ее продолжительность не может быть более восьмидесяти дней. Вторая сессия открывается 2 апреля; ее продолжительность не может быть более девяноста дней.

Палата представителей, Совет Республики в случае особой необходимости созываются на внеочередную сессию по инициативе Президента, а также по требованию большинства не менее двух третей голосов от полного состава каждой из палат по определенной повестке дня. Внеочередные сессии созываются указами Президента.

## Председатели палат Парламента

Палата представителей, Совет Республики избирают из своего состава соответственно Председателя Палаты представителей и его заместителя и Председателя Совета Республики и его заместителя.

Председатель палаты Национального собрания:
• осуществляет общее руководство палатой Национального собрания и ведает ее внутренним распорядком работы;
• ведет заседания соответствующей палаты Национального собрания;
• возглавляет соответственно Совет Палаты представителей, Президиум Совета Республики;
• дает поручения постоянным комиссиям, секретариатам и иным органам палат Национального собрания по вопросам, относящимся к их ведению;
• подписывает постановления палаты Национального собрания и решения соответственно Совета Палаты представителей, Президиума Совета Республики;
• представляет палату Национального собрания во взаимоотношениях с Президентом, другой палатой Национального собрания, Правительством и иными государственными органами, а также с общественными объединениями, органами и организациями иностранных государств, международными организациями, координирует взаимодействие палаты Национального собрания с указанными органами, объединениями и организациями;
• направляет и контролирует деятельность секретариата палаты Национального собрания;
• издает распоряжения по вопросам, отнесенным к их компетенции;
• осуществляет иные полномочия, предусмотренные Регламентом соответствующей палаты Национального собрания и иными актами законодательства.

## Совет Палаты представителей и Президиум Совета Республики

Для организации законопроектной работы, предварительного рассмотрения и подготовки вопросов, относящихся к ведению палат Национального собрания, организации работы постоянных комиссий и иных органов палат Национального собрания создаются Совет Палаты представителей и Президиум Совета Республики.

Совет Палаты представителей, Президиум Совета Республики являются постоянно действующими коллегиальными органами, подотчетными соответственно Палате представителей и Совету Республики.

В состав Совета Палаты представителей входят Председатель Палаты представителей, его заместитель, председатели постоянных комиссий Палаты представителей и другие депутаты Палаты представителей.

## Анатоль Сцяпанавіч

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы**

*Баранавіцкая-Заходняя выбарчая акруга № 4*

Нарадзіўся 13 лістапада 1958 года ў вёсцы Ціхань Слуцкага раёна Мінскай вобласці. Закончыў Вільнюскае вышэйшае ваеннае вучылішча радыёэлектронікі проціпаветранай абароны па спецыяльнасці камандная, тактычная, аўтаматызаваныя сістэмы кіравання; Ваенную камандную Чырванасцяжную акадэмію проціпаветранай абароны імя Маршала Савецкага Саюза Г.К.Жукава па спецыяльнасці каманднa-штабная і аператыўна-тактычная войскаў проціпаветранай абароны; Акадэмію Генеральнага штаба Узброеных Сіл Расійскай Федэрацыі па спецыяльнасці ваеннае і дзяржаўнае кіраванне. Генерал-маёр.

Праходзіў ваенную службу ў якасці камандзіра ўзвода, роты, батальёна, брыгады, начальніка аператыўнага ўпраўлення, займаў пасаду камандуючага войскамі Заходняга аператыўна-тактычнага камандавання ваенна-паветранымі сіламі і войскамі праціпаветранай абароны. З 2003 года з’яўляецца начальнікам галоўнага штаба – першым намеснікам камандуючага ваенна-паветранымі сіламі і войскамі праціпаветранай абароны Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь.

Узнагароджаны ордэнам «За службу Радзіме» III ступені, медалямі «За баявыя заслугі», «За бездакорную службу» I, II, III ступені, юбілейнымі медалямі, Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



## ВЕРШАЛОВІЧ
## Ларыса Георгіеўна

**Член Пастаяннай камісіі па праблемах чарнобыльскай катастрофы, экалогіі і прыродакарыстанню**

*Лунінецкая выбарчая акруга № 12*

Нарадзілася 1 красавіка 1956 года ў вёсцы Лясок Карэліцкага раёна Гродзенскай вобласці. Закончыла Мінскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўны медыцынскі інстытут па спецыяльнасці лячэбная справа.

Працоўную дзейнасць пачала рабочай Беліцкай хлебапякарні Лідскага райспажыўсаюза Гродзенскай вобласці. Працавала ўрачом-інтэрнам Баранавіцкай гарадской бальніцы, участковым тэрапеўтам, загадчыкам тэрапеўтычнага аддзялення, загадчыкам Лунінецкай раённай паліклінікі. Займала пасаду намесніка галоўнага ўрача па амбулаторна-паліклінічнай рабоце Лунінецкага раённага тэрытарыяльна-медыцынскага аб’яднання Брэсцкай вобласці.

Узнагароджана юбілейным медалём «90 год Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, знакам «Выдатнік аховы здароўя Рэспублікі Беларусь».



## ВЯЛІЧКА
## Алег Іванавіч

**Старшыня Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, справах сям'і і моладзі**

*Брэсцкая-Заходняя выбарчая акруга № 1*

Нарадзіўся 6 сакавіка 1959 года ў вёсцы Масевічы Пружанскага раёна Брэсцкай вобласці. Закончыў Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі інстытут па спецыяльнасці лячэбная справа.

Працоўную дзейнасць пачаў урачом-інтэрнам па хірургіі. Працаваў урачом-траўматолагам, урачом-хірургам Брэсцкай гарадской бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі. Займаў пасады галоўнага ўрача Брэсцкай паліклінікі № 1, галоўнага ўрача Брэсцкай гарадской бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі.

Узнагароджаны медалямі «90 год Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь», «90 год на варце граніцы», «Дрэва жыцця» (Міжпарламенцкая Асамблея дзяржаў – удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў), Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Міністэрства спорту і турызму Рэспублікі Беларусь, знакам «Выдатнік аховы здароўя Рэспублікі Беларусь».



## ГАЙДУКЕВІЧ
## Сяргей Васільевіч

**Член Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і сувязях з СНД**

*Кастрычніцкая выбарчая акруга № 99*

Нарадзіўся 8 верасня 1954 года ў горадзе Мінску. Закончыў Мінскае вышэйшае інжынерна-ракетнае вучылішча войскаў проціпаветранай абароны па спецыяльнасці радыётэхнічныя сродкі; Ваенную камандную Чырванасцяжную акадэмію проціпаветранай абароны імя Маршала Савецкага Саюза Г.К.Жукава па спецыяльнасці каманднa-штабная і аператыўна-тактычная войскаў проціпаветранай абароны.

Працоўную дзейнасць пачаў ва Узброеных Сілах, служыў на розных камандных пасадах. Працаваў ва Упраўленні па пытаннях правоў грамадзян, грамадскай бяспекі і абароннай работы Апарату Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь. З'яўляўся выконваючым абавязкі старшыні, намесніка старшыні Камітэта па сацыяльнай абароне ваеннаслужачых, асоб радавога і начальніцкага саставу органаў унутраных спраў, воінаў-інтэрнацыяналістаў, звольненых у запас (адстаўку), і членаў іх сем'яў пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь. Быў старшынёй Народнага руху Беларусі. З 1995 года з'яўляецца старшынёй Ліберальна-дэмакратычнай партыі Рэспублікі Беларусь.

Узнагароджаны медалямі Узброеных Сіл СССР і Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь.



## ГЕРАСІМАЎ
## Віктар Васільевіч

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па прамысловасці, паліўна-энергетычнаму комплексу, транспарту, сувязі і прадпрымальніцтву**

*Бабруйская-Першамайская выбарчая акруга № 64*

Нарадзіўся 16 студзеня 1950 года ў сяле Вербы Ніжне-Серагозскага раёна Херсонскай вобласці Украінскай ССР. Закончыў Адэскі політэхнічны інстытут, інжынер-механік; Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, менеджэр-эканаміст.

Працоўную дзейнасць пачаў інжынерам-тэхнолагам чыгуналіцейнага цэха. Працаваў майстрам, інжынерам-канструктарам, механікам, старшым інжынерам-тэхнолагам, начальнікам тэхбюро, намеснікам начальніка цэха Бабруйскага машынабудаўнічага завода імя У.І.Леніна. Быў загадчыкам прамыслова-транспартнага аддзела Першамайскага райкама КПБ горада Бабруйска, загадчыкам прамыслова-транспартнага аддзела Бабруйскага гаркама КПБ, сакратаром парткама вытворчага аб’яднання «Бабруйскшына». Займаў пасады намесніка дырэктара Бабруйскага машынабудаўнічага завода імя У.І.Леніна, намесніка старшыні Бабруйскага гарвыканкама, дырэктара адкрытага акцыянернага таварыства «Бабруйскі машынабудаўнічы завод».

Мае Падзяку Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Узнагароджаны ордэнам Пашаны, юбілейнымі медалямі «60 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941 – 1945 гг.», «90 год Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі, Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.



## ГІЛЬ
## Святлана Вікенцьеўна

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па бюджэту, фінансах і падатковай палітыцы**

*Брэсцкая-Цэнтральная выбарчая акруга № 2*

Нарадзілася 16 сакавіка 1947 года ў горадзе Швянчоніс Літоўскай ССР. Закончыла Віцебскі тэхналагічны інстытут лёгкай прамысловасці, інжынер-тэхнолаг.

Працавала майстрам, старшым тэхнолагам, старшым інжынерам, старшынёй фабрычнага камітэта прафсаюза Брэсцкай фабрыкі верхняга трыкатажу, сакратаром камітэта КПБ Брэсцкага вытворчага дыванова-суконнага аб’яднання, старшынёй Ленінскага раённага Савета народных дэпутатаў горада Брэста, намеснікам генеральнага дырэктара па рабоце з моладдзю Брэсцкага вытворчага дывановага аб’яднання, дырэктарам адкрытага акцыянернага таварыства «Брэсцкая швейная фірма «Надзея».

Выбіралася дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь другога склікання.

Узнагароджана Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Савета Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў – удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў, Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.



## ГЛУХОЎСКІ
## Леанід Віктаравіч

**Член Пастаяннай камісіі па заканадаўству і судова-прававых пытаннях**

*Гомельская-Прамысловая выбарчая акруга № 37*

Нарадзіўся 6 лістапада 1961 года ў горадзе Чарджоў Туркменскай ССР. Закончыў Акадэмію Міністэрства ўнутраных спраў СССР, юрыст; Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь па спецыяльнасці міжнароднае права.

Працоўную дзейнасць пачаў рабочым на Гомельскім хімічным заводзе. Служыў у радах Узброеных Сіл. Працаваў следчым упраўлення ўнутраных спраў Гомельскага аблвыканкама, намеснікам начальніка Савецкага раённага аддзела ўнутраных спраў горада Гомеля, намеснікам начальніка следчага ўпраўлення Гомельскага аблвыканкама, намеснікам начальніка Следчага камітэта Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь. Займаў пасаду намесніка Міністра ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь – начальніка Галоўнага ўпраўлення папярэдняга расследавання.

Выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь трынаццатага склікання. З'яўляўся дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь першага склікання – старшынёй Пастаяннай камісіі па заканадаўству і другога склікання.

Узнагароджаны ордэнам «За службу Радзіме» III ступені, пятнаццаццю медалямі, Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.



## ГОЛУБЕВА
## Таццяна Генадзьеўна

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па жыллёвай палітыцы, будаўніцтву, гандлю і прыватызацыі, член Савета Палаты прадстаўнікоў**

*Смаргонская выбарчая акруга № 61*

Нарадзілася 27 чэрвеня 1947 года ў горадзе Крычаве Магілёўскай вобласці. Закончыла Белгародскі тэхналагічны інстытут будаўнічых матэрыялаў імя І.А.Грышманава, інжынер-хімік-тэхнолаг; Акадэмію народнай гаспадаркі пры Савеце Міністраў СССР, вядучы спецыяліст па кіраванню. Заслужаны будаўнік Рэспублікі Беларусь.

Працоўную дзейнасць пачала лабарантам на Крычаўскім цэментна-шыферным камбінаце. Працавала электразваршчыцай на Гродзенскім камбінаце будматэрыялаў, інжынерам-тэхнолагам, намеснікам начальніка цэха Смаргонскага камбіната сілікатабетонных вырабаў, сакратаром партыйнай арганізацыі, генеральным дырэктарам вытворчага аб'яднання «Смаргоньсілікатабетон», намеснікам Міністра прамысловасці будаўнічых матэрыялаў БССР, намеснікам Міністра архітэктуры і будаўніцтва Рэспублікі Беларусь.

Выбіралася дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь другога склікання – намеснікам старшыні Пастаяннай камісіі па жыллёвай палітыцы, будаўніцтву, гандлю і прыватызацыі.

Першы сакратар ЦК Кампартыі Беларусі.

Узнагароджана Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



# ГУДКОЎ
# Аляксандр Барысавіч

**Член Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і сувязях з СНД**

*Віцебская-Чкалаўская выбарчая акруга № 20*

Нарадзіўся 5 чэрвеня 1957 года ў горадзе Растоў-на-Доне РСФСР. Закончыў Разанскае вышэйшае ваеннае паветрана-дэсантнае каманднае вучылішча, афіцэр з вышэйшай спецыяльнай адукацыяй. Палкоўнік запасу.

Служыў у радах Узброеных Сіл у складзе абмежаванага кантынгенту савецкіх войскаў у Рэспубліцы Афганістан. Працаваў старшынёй Віцебскай асацыяцыі ветэранаў вайны ў Афганістане, старшынёй Віцебскага абласнога саюза ветэранаў вайны ў Афганістане, іншых войнаў і лакальных канфліктаў.

Выбіраўся дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь другога склікання.

Старшыня Віцебскай абласной арганізацыі грамадскага аб’яднання «Беларускі саюз ветэранаў вайны ў Афганістане».

Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалём «За баявыя заслугі», васьмю іншымі медалямі, Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі.







# ГУМІНСКІ
# Віктар Аляксандравіч

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы**

*Барысаўская гарадская выбарчая акруга № 77*

Нарадзіўся 3 жніўня 1955 года ў вёсцы Свадбічы Бярозаўскага раёна Брэсцкай вобласці. Закончыў Новасібірскае вышэйшае ваенна-палітычнае агульнавайсковае вучылішча, афіцэр-палітработнік з вышэйшай адукацыяй; Ваенна-палітычную акадэмію імя К.Готвальда (ЧССР) па вышэйшай ваенна-палітычнай спецыяльнасці; Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, менеджэр-эканаміст. Палкоўнік.

Праходзіў ваенную службу ў якасці намесніка камандзіра роты, батальёна, палка, намесніка начальніка палітаддзела танкавай дывізіі, намесніка камандзіра танкавай дывізіі, начальніка аддзела 7-й танкавай арміі, начальніка аддзела 65-га армейскага корпуса, намесніка камандзіра па выхаваўчай рабоце 65-га армейскага корпуса Рэспублікі Беларусь.

Выбіраўся дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь другога склікання.

Узнагароджаны ордэнам Пашаны, семнаццаццю медалямі, Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



## ДАВЫДЗЬКА
## Генадзь Браніслававіч

**Член Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічнаму прагрэсу**

*Купалаўская выбарчая акруга № 97*

Нарадзіўся 29 верасня 1955 года ў гарадскім пасёлку Сянно Віцебскай вобласці. Закончыў Далёкаўсходні педагагічны інстытут мастацтваў; Беларускую акадэмію мастацтваў, акцёр драматычнага тэатра і кіно, рэжысёр драмы. Заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь.

Працоўную дзейнасць пачаў артыстам Арэнбургскага абласнога драматычнага тэатра імя М.Горкага. Пасля службы ў радах Узброеных Сіл – артыст Магілёўскага абласнога тэатра драмы і камедыі імя В.І.Дуніна-Марцінкевіча. Працаваў артыстам у Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Янкі Купалы, генеральным дырэктарам дзяржаўнай установы «Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы» ў горадзе Мінску.

Намеснік старшыні спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва.

Узнагароджаны медалямі Францыска Скарыны, «90 год Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі.







## ДВАРАНІНОВІЧ
## Васіль Васільевіч

**Член Пастаяннай камісіі па аграрных пытаннях**

*Пінская сельская выбарчая акруга № 15*

Нарадзіўся 10 красавіка 1948 года ў вёсцы Высокае Пінскага раёна Брэсцкай вобласці. Закончыў Гродзенскі сельскагаспадарчы інстытут, вучоны заатэхнік.

Працоўную дзейнасць пачаў загадчыкам фермы саўгаса імя Мічурына Івацэвіцкага раёна Брэсцкай вобласці. Пасля службы ў радах Узброеных Сіл працаваў заатэхнікам, галоўным заатэхнікам, намеснікам старшыні калгаса «Дружба народаў», загадчыкам ветэрынарнай лячэбніцы Пінскага раёна, дырэктарам міжгаспадарчага прадпрыемства «Паўднёвае». Займаў пасады старшыні Пінскага райвыканкама, намесніка старшыні Брэсцкага аблвыканкама, старшыні Брэсцкага райвыканкама. Быў памочнікам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Міністрам сельскай гаспадаркі і харчавання Рэспублікі Беларусь. З’яўляўся начальнікам Смалявіцкага пагранічнага кантрольна-ветэрынарнага пункта «Аэрапорт Мінск-2».

Выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь дванаццатага склікання. З’яўляўся членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь першага склікання.

Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны», медалямі, Ганаровай граматай Міжпарламенцкай Асамблеі Еўразійскага эканамічнага супольніцтва, Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.



## ДЗЯЛЕНДЗІК
## Уладзімір Віктаравіч

**Член Пастаяннай камісіі па дзяржаўнаму будаўніцтву, мясцоваму самакіраванню і рэгламенту**

*Мінская сельская выбарчая акруга № 84*

Нарадзіўся 29 студзеня 1952 года ў вёсцы Зажэвічы Салігорскага раёна Мінскай вобласці. Закончыў Кіеўскі дзяржаўны эканамічны універсітэт, эканаміст.

Працаваў кінамеханікам раённай кінаперасоўкі ў горадзе Салігорску, слесарам мінскіх заводаў «Белмедпрэпараты» і «Белэлектрамантаж», інжынерам Мінскага інстытута мікрабіялогіі і эпідэміялогіі, генеральным дырэктарам унітарнага прыватнага прадпрыемства «Дарыда» Мінскага раёна.

Выбіраўся дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь другога склікання – намеснікам старшыні Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічнаму прагрэсу.

Мае Падзяку Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Узнагароджаны Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі.



## ДЗЯМКО
## Рыгор Аляксеевіч

**Член Пастаяннай камісіі па аграрных пытаннях**

*Столінская выбарчая акруга № 16*

Нарадзіўся 13 сакавіка 1946 года ў вёсцы Вялікае Малешава Столінскага раёна Брэсцкай вобласці. Закончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію, вучоны аграном. Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь.

Працоўную дзейнасць пачаў аграномам калгаса «40 гадоў Кастрычніка» Столінскага раёна Брэсцкай вобласці. Пасля службы ў радах Узброеных Сіл працаваў галоўным аграномам упраўлення сельскай гаспадаркі Брэсцкага аблвыканкама, намеснікам старшыні калгаса «40 гадоў Кастрычніка», старшынёй калгаса імя Кірава, старшынёй сельскагаспадарчага вытворчага кааператыва «Фядорскі» Столінскага раёна Брэсцкай вобласці.

Узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, Айчыны III ступені, медалямі «За працоўную доблесць», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



# ДУБОВІК
# Мікалай Мікалаевіч

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, справах сям'і і моладзі**

*Стаўбцоўская выбарчая акруга № 92*

Нарадзіўся 28 жніўня 1955 года ў вёсцы Слабада Уздзенскага раёна Мінскай вобласці. Закончыў Мазырскі дзяржаўны педагагічны інстытут, інжынер-педагог; Беларускі дзяржаўны універсітэт, юрыст.

Працоўную дзейнасць пачаў слесарам на вытворчым аб'яднанні «Інтэграл». Служыў у радах Узброеных Сіл. Працаваў майстрам вытворчага навучання Мінскага прафесійна-тэхнічнага вучылішча № 23 будаўнікоў, намеснікам дырэктара Мінскага прафесійна-тэхнічнага вучылішча № 55 будаўнікоў, намеснікам начальніка арганізацыйнага ўпраўлення Службы кантролю Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь трынаццатага склікання – старшынёй падкамісіі па справах моладзі Пастаяннай камісіі па сацыяльнай палітыцы і працы. З'яўляўся дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь першага склікання – намеснікам старшыні Пастаяннай камісіі па працы, сацыяльных пытаннях, ахове здароўя, фізічнай культуры і спорту, другога склікання – намеснікам старшыні Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, справах сям'і і моладзі.

Кіраўнік беларускага грамадскага аб'яднання «Рэспубліка без наркотыкаў», старшыня грамадскага аб'яднання «Рэспубліканскі турысцка-спартыўны саюз».

Мае Падзяку Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Узнагароджаны ордэнам Пашаны, медалём Пушкіна (Расійская Федэрацыя), пяццю юбілейнымі медалямі, Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі, медалём Рускай праваслаўнай царквы Прападобнага Сергія Раданежскага II ступені.



# ЖВІКАЎ
# Уладзімір Уладзіміравіч

**Член Пастаяннай камісіі па дзяржаўнаму будаўніцтву, мясцоваму самакіраванню і рэгламенту**

*Аршанская-Дняпроўская выбарчая акруга № 27*

Нарадзіўся 28 ліпеня 1950 года ў горадзе Оршы Віцебскай вобласці. Закончыў Беларускі інстытут інжынераў чыгуначнага транспарту, інжынер-механік. Падпалкоўнік запасу.

Служыў у ракетных войсках стратэгічнага назначэння Савецкай Арміі. Працаваў памочнікам машыніста, майстрам, старшынёй прафкама лакаматыўнага дэпо Орша. Выбіраўся сакратаром камітэта КПБ Аршанскага чыгуначнага вузла. Працаваў першым намеснікам старшыні, старшынёй Аршанскага гарвыканкама, намеснікам дырэктара Аршанскага вышэйшага тэхнічнага каледжа, начальнікам лакаматыўнага дэпо Орша.

Выбіраўся дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь другога склікання.

Узнагароджаны юбілейным медалём «90 год Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, знакам «Ганароваму чыгуначніку».



## ЖДАНЮК
## Ніна Уладзіміраўна

**Член Пастаяннай камісіі па працы, сацыяльнай абароне, справах ветэранаў і інвалідаў, член Савета Палаты прадстаўнікоў**

*Маладзечанская сельская выбарчая акруга № 86*

Нарадзілася 12 снежня 1954 года ў горадзе Мінску. Закончыла Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя А.М.Горкага, настаўнік беларускай мовы і літаратуры; Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь па спецыяльнасці дзяржаўнае кіраванне сацыяльнай сферай.

Працавала настаўнікам рускай мовы і літаратуры Філіпіняцкай васьмігадовай школы Валожынскага раёна Мінскай вобласці, выкладчыкам беларускай мовы і літаратуры Валожынскага ПТВ-208, інструктарам ідэалагічнага аддзела, загадчыкам кабінета палітасветы, загадчыкам ідэалагічнага аддзела Валожынскага райкама КПБ. Была намеснікам дырэктара па вучэбнай рабоце Валожынскага ПТВ-208, намеснікам загадчыка аддзела адукацыі Валожынскага райвыканкама. Займала пасаду дырэктара дзяржаўнай установы адукацыі «Валожынская агульнаадукацыйная школа-інтэрнат для дзяцей-сірот, якія засталіся без апекі бацькоў».

Узнагароджана Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Савета Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў – удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў, знакам «Выдатнік адукацыі».







## ЖУКОЎСКАЯ
## Людміла Лявонаўна

**Член Пастаяннай камісіі па прамысловасці, паліўна-энергетычнаму комплексу, транспарту, сувязі і прадпрымальніцтву**

*Мазырская выбарчая акруга № 44*

Нарадзілася 2 студзеня 1949 года ў вёсцы Харашкі Дзятлаўскага раёна Гродзенскай вобласці. Закончыла Віцебскі тэхналагічны інстытут лёгкай прамысловасці, інжынер-тэхнолаг.

Працавала інжынерам-нарміроўшчыкам, зменным майстрам, начальнікам трыкатажнага цэха № 2 Мазырскай трыкатажна-ткацкай фабрыкі імя Н.К.Крупскай, дырэктарам адкрытага акцыянернага таварыства «Мазырская швейная фабрыка «Надэкс».

Узнагароджана медалём «За працоўную доблесць», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі.



# ЗАБАЛОЦЕЦ
# Сяргей Макаравіч

**Намеснік Старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь**

*Аўтазаводская выбарчая акруга № 94*

Нарадзіўся 14 красавіка 1955 года ў вёсцы Таль Любанскага раёна Мінскай вобласці. Закончыў Вышэйшую камсамольскую школу пры ЦК ВЛКСМ, выкладчык гісторыі і грамадазнаўства; Беларускі дзяржаўны інстытут народнай гаспадаркі імя В.У.Куйбышава, эканаміст.

Працоўную дзейнасць пачаў паляводам у калгасе «Беларусь» Любанскага раёна. Служыў у радах Узброеных Сіл. Працаваў першым сакратаром Любанскага райкама камсамола, загадчыкам арганізацыйнага аддзела Любанскага райкама КПБ, старшынёй Любанскага раённага камітэта народнага кантролю, інструктарам Мінскага абкама КПБ, другім, першым сакратаром Бярэзінскага райкама КПБ Мінскай вобласці, намеснікам начальніка ўпраўлення матэрыяльнага забеспячэння вытворчага аб’яднання «БелаўтаМАЗ».

Выбіраўся дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь другога склікання – старшынёй Пастаяннай камісіі па прамысловасці, паліўна-энергетычнаму комплексу, транспарту, сувязі і прадпрымальніцтву.

Узнагароджаны ордэнам Пашаны, чатырма медалямі, Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі.







# ЗДАНОВІЧ
# Уладзімір Мацвеевіч

**Старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічнаму прагрэсу**

*Драгічынская выбарчая акруга № 9*

Нарадзіўся 15 сакавіка 1959 года ў вёсцы Застаўе Драгічынскага раёна Брэсцкай вобласці. Закончыў Беларускі дзяржаўны універсітэт, радыёфізік; Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, менеджэр сацыяльнай сферы. Заслужаны настаўнік Рэспублікі Беларусь. Магістр педагогікі.

Працаваў малодшым навуковым супрацоўнікам, інжынерам Беларускага дзяржаўнага універсітэта, выхавальнікам Бездзежскай сярэдняй школы, намеснікам дырэктара Крамноўскай васьмігадовай школы, настаўнікам Ліпніцкай васьмігадовай школы, Драгічынскай сярэдняй школы, дырэктарам гімназіі ў горадзе Драгічыне Брэсцкай вобласці.

Выбіраўся дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь другога склікання – намеснікам старшыні Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічнаму прагрэсу.

Мае Падзяку Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Узнагароджаны юбілейным медалём «90 год Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Савета Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў – удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў, знакам «Выдатнік адукацыі».



## ЗІНЧАНКА
## Аляксандр Мікалаевіч

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па аграрных пытаннях**

*Белавежская выбарчая акруга № 7*

Нарадзіўся 15 студзеня 1947 года ў вёсцы Пляхаўшчына Бярозаўскага раёна Брэсцкай вобласці. Закончыў Беларускі дзяржаўны інстытут народнай гаспадаркі імя В.У.Куйбышава, эканаміст; Акадэмію кіравання пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь, менеджэр-эканаміст.

Працоўную дзейнасць пачаў рабочым на Кобрынскім хлебакамбінаце. Служыў у радах Узброеных Сіл. Працаваў настаўнікам Параслянскай сярэдняй школы, тэхнікам вайсковай часці ў Пружанскім раёне, галоўным эканамістам калгаса «Ленінскі шлях», дырэктарам саўгаса «Кавалі» Пружанскага раёна.

Выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь трынаццатага склікання – сакратаром Пастаяннай камісіі па бюджэту, падатках, банках і фінансах. З'яўляўся дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь першага склікання – старшынёй Пастаяннай камісіі па бюджэту і фінансах, другога склікання – намеснікам старшыні Пастаяннай камісіі па аграрных пытаннях.

Узнагароджаны юбілейным медалём «90 год Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.



## ІВАНОЎ
## Глеб Анатольевіч

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па грашова-крэдытнай палітыцы і банкаўскай дзейнасці**

*Віцебская-Кастрычніцкая выбарчая акруга № 19*

Нарадзіўся 2 мая 1963 года ў горадзе Віцебску. Закончыў Віцебскі тэхналагічны інстытут лёгкай прамысловасці, інжынер-механік; Акадэмію Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь, юрыст.

Працоўную дзейнасць пачаў інжынерам-тэхнолагам завода заточных станкоў у горадзе Віцебску. Служыў у радах Узброеных Сіл. Працаваў у органах унутраных спраў Рэспублікі Беларусь, органах Дзяржаўнага камітэта фінансавых расследаванняў Рэспублікі Беларусь.

Выбіраўся дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь другога склікання.

Узнагароджаны Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



# ІСАЕЎ
# Уладзімір Міхайлавіч

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, справах сям'і і моладзі**

*Полацкая гарадская выбарчая акруга № 28*

Нарадзіўся 27 мая 1954 года ў вёсцы Трылесіна Шклоўскага раёна Магілёўскай вобласці. Закончыў Мінскі дзяржаўны медыцынскі інстытут, урач-хірург; Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, менеджэр сацыяльнай сферы.

Працоўную дзейнасць пачаў лабарантам у Нава-Брашчынскай сярэдняй школе. Служыў у радах Узброеных Сіл. Працаваў урачом, загадчыкам хірургічнага аддзялення, намеснікам галоўнага ўрача Полацкай гарадской бальніцы, галоўным урачом Полацкай гарадской паліклінікі, галоўным урачом тэрытарыяльнага медыцынскага аб'яднання горада Полацка.

Выбіраўся дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь другога склікання – намеснікам старшыні Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, справах сям'і і моладзі.

Намеснік старшыні Беларускай асацыяцыі ўрачоў.

Узнагароджаны юбілейным медалём «90 год Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, знакам «Выдатнік аховы здароўя».



# ІСАЧКІН
# Віктар Панцялеевіч

**Член Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, справах сям'і і моладзі (2004 – 2005)**

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па заканадаўству і судова-прававых пытаннях (2005 – 2008)**

*Магілёўская-Кастрычніцкая выбарчая акруга № 73*

Нарадзіўся 19 ліпеня 1960 года ў гарадскім пасёлку Краснаполле Магілёўскай вобласці. Закончыў Мінскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўны медыцынскі інстытут па спецыяльнасці лячэбная справа; Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь па спецыяльнасці дзяржаўнае кіраванне сацыяльнай сферай.

Працоўную дзейнасць пачаў урачом-інтэрнам акушэрам-гінеколагам медсанчасці Магілёўскага вытворчага аб'яднання «Хімвалакно». Працаваў урачом акушэрам-гінеколагам, загадчыкам родавага аддзялення, намеснікам галоўнага ўрача па родадапамозе, галоўным урачом установы аховы здароўя «Медыка-санітарная часць Магілёўскага вытворчага аб'яднання «Хімвалакно».

Узнагароджаны юбілейным медалём «90 год Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, знакам «Выдатнік аховы здароўя Рэспублікі Беларусь».



# КАБЕРНІК
# Ніна Аўгустаўна

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і сувязях з СНД**

*Жлобінская выбарчая акруга № 42*

Нарадзілася 12 верасня 1949 года ў горадзе Чэлябінску РСФСР. Закончыла Чэлябінскі політэхнічны інстытут, інжынер-металург.

Працавала кантралёрам аддзела тэхнічнага кантролю, зменным кантрольным майстрам участка тэрмічнага цэха, майстрам аддзела тэхнічнага кантролю Чэлябінскага металургічнага камбіната. Была старшым майстрам, намеснікам начальніка аддзела тэхнічнага кантролю, начальнікам упраўлення па забеспячэнню якасці рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства «Беларускі металургічны завод» горада Жлобіна. Займала пасаду дырэктара па забеспячэнню якасці рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства «Беларускі металургічны завод».

Узнагароджана Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Міжпарламенцкай Асамблеі Еўразійскага эканамічнага супольніцтва.







# КАВАЛЁВА
# Валянціна Іванаўна

**Член Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, справах сям'і і моладзі**

*Светлагорская выбарчая акруга № 48*

Нарадзілася 27 красавіка 1957 года ў вёсцы Міроненкі Калінкавіцкага раёна Гомельскай вобласці. Закончыла Беларускі дзяржаўны універсітэт, філолаг; Акадэмію кіравання пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь, менеджэр-эканаміст.

Працавала старшай піянерважатай, настаўнікам рускай мовы і літаратуры, намеснікам дырэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце сярэдняй школы № 7 горада Светлагорска, інструктарам ідэалагічнага аддзела Светлагорскага гаркама КПБ Гомельскай вобласці, намеснікам загадчыка аддзела адукацыі, намеснікам старшыні Светлагорскага гарвыканкама, намеснікам старшыні Светлагорскага райвыканкама.

Узнагароджана медалямі «За працоўную доблесць», «За працоўныя заслугі», «За вернасць абавязку і Айчыне» (Расійская Федэрацыя), Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



## КАЗІМІРЧЫК
## Яўгеній Аляксандравіч

**Член Пастаяннай камісіі па прамысловасці, паліўна-энергетычнаму комплексу, транспарту, сувязі і прадпрымальніцтву**

*Бярозаўская выбарчая акруга № 8*

Нарадзіўся 1 чэрвеня 1961 года ў вёсцы Скураты Івацэвіцкага раёна Брэсцкай вобласці. Закончыў Беларускі політэхнічны інстытут, інжынер-будаўнік; Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, менеджэр-эканаміст.

Працоўную дзейнасць пачаў сталяром Косаўскага мэблевага вытворчага аб'яднання Івацэвіцкага раёна Брэсцкай вобласці. Пасля службы ў радах Узброеных Сіл працаваў старшым інжынерам-электрыкам Івацэвіцкага «Райсельэнерга», старшым інжынерам праектна-каштарыснага бюро ўпраўлення капітальнага будаўніцтва Івацэвіцкага райвыканкама, інжынерам, галоўным інжынерам Івацэвіцкага райгаза, дырэктарам міжраённага вытворчага ўпраўлення газавай гаспадаркі «Бярозаміжрайгаз».

Узнагароджаны ордэнам Пашаны, юбілейным медалём «90 год Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



## КАЗЯК
## Вінцэнты Іванавіч

**Член Пастаяннай камісіі па дзяржаўнаму будаўніцтву, мясцоваму самакіраванню і рэгламенту**

*Шчучынская выбарчая акруга № 62*

Нарадзіўся 8 жніўня 1943 года ў вёсцы Куляшы Смаргонскага раёна Гродзенскай вобласці. Закончыў Мінскую вышэйшую партыйную школу; Гродзенскі сельскагаспадарчы інстытут, вучоны аграном.

Працоўную дзейнасць пачаў брыгадзірам паляводчай брыгады калгаса «Шлях камунізму» Смаргонскага раёна Гродзенскай вобласці. Пасля службы ў радах Узброеных Сіл працаваў інструктарам, загадчыкам арганізацыйнага аддзела Смаргонскага райкама КПБ. Быў намеснікам загадчыка аддзела арганізацыйна-партыйнай работы, другім сакратаром Гродзенскага абкама КПБ, першым сакратаром Шчучынскага райкама КПБ Гродзенскай вобласці. Займаў пасады старшыні Шчучынскага раённага Савета дэпутатаў, старшыні Шчучынскага райвыканкама, памочніка Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь – галоўнага інспектара па Гродзенскай вобласці.

Выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь дванаццатага склікання.

Мае Падзяку Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, «Знак Пашаны», Айчыны III ступені, трыма медалямі, Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Савета Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў – удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў, Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.



# КАЛУГІН Пётр Аляксеевіч

**Член Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і сувязях з СНД**

*Салігорская гарадская выбарчая акруга № 90*

Нарадзіўся 13 верасня 1941 года ў вёсцы Кудзіна Тарапецкага раёна Цвярской вобласці РСФСР. Закончыў Ленінградскі горны інстытут, горны інжынер-шахтабудаўнік. Кандыдат тэхнічных навук. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь.

Працоўную дзейнасць пачаў рабочым на Калінінскай чыгунцы. Служыў у радах Узброеных Сіл. Працаваў майстрам рудніка другога Салігорскага калійнага камбіната, сакратаром парткама другога рудаўпраўлення камбіната «Беларуськалій», старшынёй прафкама вытворчага аб'яднання «Беларуськалій», начальнікам рудніка другога рудаўпраўлення, дырэктарам чацвёртага рудаўпраўлення, галоўным інжынерам, генеральным дырэктарам вытворчага аб'яднання «Беларуськалій».

Выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь трынаццатага склікання. З'яўляўся дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь першага і другога скліканняў.

Узнагароджаны медалямі «Ветэран працы», «90 год Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь», Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, ордэнам Рускай праваслаўнай царквы Прападобнага Сергія Раданежскага II ступені.



# КАМЯНЕЦКІ Сяргей Уладзіміравіч

**Старшыня Пастаяннай камісіі па працы, сацыяльнай абароне, справах ветэранаў і інвалідаў**

*Гродзенская-Занёманская выбарчая акруга № 51*

Нарадзіўся 4 красавіка 1961 года ў горадзе Гродна. Закончыў Мінскае сувораўскае ваеннае вучылішча; Бакінскае вышэйшае агульна-вайсковае камандное вучылішча, інжынер па рамонту і эксплуатацыі гусенічных і колавых машын; Ваенную акадэмію імя М.В.Фрунзе, афіцэр з вышэйшай ваеннай адукацыяй; Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, эканаміст-міжнароднік. Палкоўнік.

Працоўную дзейнасць пачаў камандзірам дэсантна-штурмавога ўзвода ў Туркестанскай ваеннай акрузе. Служыў камандзірам дэсантна-штурмавога ўзвода ў Рэспубліцы Афганістан. Працаваў намеснікам ваеннага камісара Кастрычніцкага раённага ваеннага камісарыята горада Гродна, намеснікам ваеннага камісара Гродзенскага гарадскога ваеннага камісарыята, старшынёй гродзенскай абласной арганізацыі «Грамадскае аб'яднанне «Беларускі саюз ветэранаў вайны ў Афганістане».

Выбіраўся дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь другога склікання – старшынёй Пастаяннай камісіі па працы, сацыяльнай абароне, справах ветэранаў і інвалідаў.

Узнагароджаны двума ордэнамі Чырвонай Зоркі, ордэнам Пашаны, юбілейным медалём «90 год Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Савета Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў – удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў, Ганаровай граматай Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі.



# КАНАПЛЁЎ
# Уладзімір Мікалаевіч

**Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь (2004 – 2007)**
**Член Пастаяннай камісіі па дзяржаўнаму будаўніцтву, мясцоваму самакіраванню і рэгламенту (2007 – 2008)**

*Шклоўская выбарчая акруга № 75*

Нарадзіўся 3 студзеня 1954 года ў вёсцы Акулінцы Магілёўскага раёна Магілёўскай вобласці. Закончыў Магілёўскі дзяржаўны педагагічны інстытут, географ.

Працоўную дзейнасць пачаў выхавальнікам у Шклоўскай спецыяльнай школе-інтэрнаце. Служыў у радах Узброеных Сіл. Працаваў педагогам у горадзе Шклове, інспектарам па справах непаўналетніх аддзела ўнутраных спраў Шклоўскага райвыканкама, галоўным памочнікам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь трынаццатага склікання, быў членам Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, кіраўніком дэпутацкай фракцыі «Згода». З'яўляўся Намеснікам Старшыні Палаты прадстаўнікоў першага і другога скліканняў.

Узначальвае Беларускае аддзяленне Фонду адзінства праваслаўных народаў. Старшыня грамадскай арганізацыі «Беларуская федэрацыя па гандболу».

Узнагароджаны ордэнамі Айчыны III ступені, «Садружнасць» (Міжпарламенцкая Асамблея дзяржаў – удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў), юбілейнымі медалямі, ганаровымі граматамі дзяржаўных органаў і міжнародных арганізацый, ордэнам Рускай праваслаўнай царквы Святога благавернага князя Даніїла Маскоўскага III ступені, ордэнам Беларускай праваслаўнай царквы Крыжа прападобнай Ефрасінні, ігумені Полацкай, Граматай Патрыярха Маскоўскага і ўсяе Русі Алексія II.





# КАРПЕНКА
# Ігар Васільевіч

**Член Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, справах сям'і і моладзі**

*Ясенінская выбарчая акруга № 101*



Нарадзіўся 28 красавіка 1964 года ў горадзе Новакузнецку Кемераўскай вобласці РСФСР. Закончыў Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя А.М.Горкага, настаўнік гісторыі, грамадазнаўства і англійскай мовы; Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, спецыяліст у галіне міжнародных адносін.

Працоўную дзейнасць пачаў старшым піянерважатым Азінскай сярэдняй школы Полацкага раёна Віцебскай вобласці. Пасля службы ў радах Узброеных Сіл быў сакратаром камітэта камсамола, начальнікам аддзела, начальнікам упраўлення выхаваўчай работы Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя Максіма Танка. Працаваў начальнікам упраўлення выхаваўчай работы, прарэктарам па выхаваўчай і сацыяльнай рабоце ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка».

Узнагароджаны Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



## КАСЦЯН
## Сяргей Іванавіч

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і сувязях з СНД**

*Палеская выбарчая акруга № 45*

Нарадзіўся 15 студзеня 1941 года ў вёсцы Усохі Клічаўскага раёна Магілёўскай вобласці. Закончыў Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя А.М.Горкага, гісторык. Кандыдат гістарычных навук, дацэнт. Доктар паліталогіі, прафесар. Акадэмік Міжнароднай акадэміі інфармацыйных тэхналогій.

Працоўную дзейнасць пачаў цесляром Кіраўскага завода ў горадзе Чэлябінску. Служыў у радах Узброеных Сіл на Ціхаакіянскім флоце. Працаваў выхавальнікам, настаўнікам школы-інтэрната горада Чэлябінска, сакратаром камітэта камсамола саўгаса «Каменка» Мазырскага раёна, першым сакратаром Мазырскага райкама ЛКСМБ, загадчыкам аддзела Мазырскага райкама КПБ, загадчыкам кафедры Мазырскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута.

Выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь трынаццатага склікання. З'яўляўся дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь першага і другога скліканняў – намеснікам старшыні Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і сувязях з СНД.

Старшыня грамадскага аб'яднання «Беларускі славянскі камітэт», старшыня Славянскага парламенцкага саюза, член Міжнароднага славянскага камітэта, член Прэзідыума Еўрапейскага форуму міру.

Узнагароджаны ордэнам «Садружнасць» (Міжпарламенцкая Асамблея дзяржаў – удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў), медалямі «Ветэран працы», «90 год Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь» і іншымі медалямі, ганаровымі граматамі, знакам «Выдатнік народнай асветы БССР».





## КАТЛЯРОЎ
## Ігар Васільевіч

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічнаму прагрэсу**

*Пухавіцкая выбарчая акруга № 88*

Нарадзіўся 15 ліпеня 1948 года ў гарадскім пасёлку Відзы Браслаўскага раёна Віцебскай вобласці. Закончыў Віцебскі тэхналагічны інстытут лёгкай прамысловасці, інжынер-механік; Мінскую вышэйшую партыйную школу, палітолаг. Доктар сацыялагічных навук, прафесар.

Працоўную дзейнасць пачаў канструктарам Мінскага эксперыментальна-канструктарскага тэхналагічнага бюро. Служыў у радах Узброеных Сіл. Працаваў загадчыкам канструктарскага аддзела праектна-канструктарскага бюро Віцебскага аблмясцпрама, загадчыкам аддзела Кастрычніцкага райкама КПБ горада Віцебска, інструктарам Віцебскага гаркама КПБ, абкама КПБ, загадчыкам сектара па вывучэнню і прагназіраванню грамадскай думкі, першым намеснікам загадчыка ідэалагічнага аддзела ЦК КПБ, кіраўніком рабочай групы па вывучэнню праблем сацыялогіі палітыкі Інстытута сацыялогіі Акадэміі навук Беларусі, начальнікам Цэнтра эканамічнага і сацыяльна-палітычнага аналізу, намеснікам дырэктара Інстытута па навукова-аналітычнай рабоце, дырэктарам Беларускага інстытута інфармацыі і прагнозу пры Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь трынаццатага склікання – старшынёй Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных пытаннях, сродках масавай інфармацыі, сувязях з грамадскімі аб'яднаннямі і рэлігійнымі арганізацыямі. З'яўляўся дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь першага склікання – намеснікам старшыні Пастаяннай камісіі па правах чалавека і нацыянальных адносінах, другога склікання – старшынёй Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічнаму прагрэсу.

Узнагароджаны ордэнам Францыска Скарыны, трыма медалямі, Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



## КАЧАН
## Валянціна Іванаўна

**Член Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і сувязях з СНД**

*Брэсцкая-Усходняя выбарчая акруга № 3*

Нарадзілася 16 кастрычніка 1951 года ў горадзе Смаленску РСФСР. Закончыла Мінскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўны медыцынскі інстытут, санітарны ўрач; Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь па спецыяльнасці знешняя палітыка і дыпламатыя.

Працавала ўрачом-лабарантам, загадчыкам лабараторыі Пінскай гарадской санітарна-эпідэміялагічнай станцыі, намеснікам галоўнага ўрача Пінскага раённага цэнтра гігіены і эпідэміялогіі, галоўным дзяржаўным санітарным урачом Брэсцкай вобласці.

Выбіралася дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь другога склікання.

Галоўны дзяржаўны санітарны ўрач Рэспублікі Беларусь – намеснік Міністра аховы здароўя Рэспублікі Беларусь.

Узнагароджана медалямі «За працоўныя заслугі», «90 год Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Савета Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў – удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў, знакамі «Выдатнік аховы здароўя Рэспублікі Беларусь», «За мужнасць і любоў да Айчыны» Міжнароднага грамадскага фонду імя палкаводца Г.К.Жукава.



## КАШАНКОВА
## Лілія Васільеўна

**Член Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічнаму прагрэсу**

*Гродзенская сельская выбарчая акруга № 54*

Нарадзілася 2 студзеня 1951 года ў вёсцы Яскалды Бераставіцкага раёна Гродзенскай вобласці. Закончыла Магілёўскі дзяржаўны педагагічны інстытут, настаўнік геаграфіі; Мінскую вышэйшую партыйную школу.

Працоўную дзейнасць пачала настаўнікам Жыжэмскай васьмігадовай школы Воранаўскага раёна Гродзенскай вобласці. Была настаўнікам, старшай піянерважатай сярэдняй школы № 3 горада Ваўкавыска Гродзенскай вобласці, сакратаром, другім і першым сакратаром Ваўкавыскага райкама ЛКСМБ, загадчыкам аддзела прапаганды і агітацыі Ваўкавыскага гаркама КПБ. Працавала інструктарам аддзела навукі і навучальных устаноў Гродзенскага абкама КПБ, сакратаром Гродзенскага райкама КПБ, дырэктарам Путрышкаўскай сярэдняй школы Гродзенскага раёна.

Намеснік старшыні Гродзенскай абласной, старшыня Гродзенскай раённай арганізацый грамадскага аб’яднання «Беларускі саюз жанчын». Член рэспубліканскага і абласнога савета грамадскага аб’яднання «Белая Русь». Член бюро ЦК Кампартыі Беларусі.

Узнагароджана Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, знакам «Выдатнік адукацыі».



## КІСЯЛЁЎ
## Сяргей Антонавіч

**Старшыня Пастаяннай камісіі па бюджэту, фінансах і падатковай палітыцы**

*Пушкінская выбарчая акруга № 103*

Нарадзіўся 3 лютага 1961 года ў горадзе Мінску. Закончыў Беларускі дзяржаўны інстытут народнай гаспадаркі імя В.У.Куйбышава, эканаміст.

Служыў у радах Узброеных Сіл. Працаваў інжынерам у мінскім навукова-даследчым інстытуце «Агат», майстрам у вытворчым аб'яднанні «Інтэграл», намеснікам галоўнага бухгалтара ў праектна-прамыслова-будаўнічым аб'яднанні Міністэрства хлебапрадуктаў БССР, галоўным інспектарам дзяржаўнай падатковай інспекцыі па Кастрычніцкаму раёну горада Мінска, намеснікам начальніка ўпраўлення Галоўнай дзяржаўнай падатковай інспекцыі пры Міністэрстве фінансаў Рэспублікі Беларусь, начальнікам інспекцыі № 1 дзяржаўнага падатковага камітэта па Фрунзенскаму раёну горада Мінска.

Выбіраўся дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь другога склікання – старшынёй Пастаяннай камісіі па бюджэту, фінансах і падатковай палітыцы.

Узнагароджаны ордэнам Пашаны, юбілейным медалём «90 год Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Савета Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў – удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў, Ганаровай граматай Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі, Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.







## КОЗІК
## Леанід Пятровіч

**Член Пастаяннай камісіі па бюджэту, фінансах і падатковай палітыцы**

*Барысаўская сельская выбарчая акруга № 78*

Нарадзіўся 13 ліпеня 1948 года ў горадзе Барысаве Мінскай вобласці. Закончыў Беларускі дзяржаўны універсітэт, юрыст; Беларускі дзяржаўны інстытут народнай гаспадаркі імя В.У.Куйбышава, эканаміст. Доктар эканамічных навук, прафесар. Акадэмік Міжнароднай акадэміі інфармацыйных тэхналогій. Заслужаны работнік прамысловасці Рэспублікі Беларусь.

Працаваў токарам на заводзе аўтатрактарнага абсталявання горада Барысава Мінскай вобласці. Пасля службы ва Узброеных Сілах – шафёр Барысаўскага прадпрыемства электрычных сетак. Працаваў слесарам, старшым інжынерам-тэхнолагам, сакратаром камітэта камсамола Барысаўскага завода аўтатрактарнага электраабсталявання. Быў памочнікам пракурора горада Барысава, вызваленым старшынёй прафсаюзнага камітэта Барысаўскага завода аўтатрактарнага электраабсталявання, дырэктарам Барысаўскай швейнай фабрыкі, членам Калегіі Міждзяржаўнага эканамічнага камітэта Эканамічнага саюза СНД. Займаў пасады намесніка Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь, Паўнамоцнага прадстаўніка Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь – намесніка Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь, намесніка Кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь дванаццатага склікання – старшынёй Пастаяннай камісіі па эканамічнай рэформе, дасягненню эканамічнай самастойнасці і суверэнітэту рэспублікі.

Старшыня Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі.

Сустаршыня Савета Сабора славянскіх народаў Беларусі, Расіі і Украіны.

Мае дзве падзякі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Узнагароджаны ордэнам Пашаны і іншымі ордэнамі, юбілейнымі медалямі СССР, Рэспублікі Беларусь і іншых дзяржаў, Ганаровай граматай Савета Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў – удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў, Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.



# КОРАП
# Раман Леанідавіч

**Член Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, справах сям'і і моладзі**

*Чкалаўская выбарчая акруга № 98*

Нарадзіўся 8 студзеня 1952 года ў горадзе Мінску. Закончыў Віцебскі дзяржаўны медыцынскі інстытут па спецыяльнасці лячэбная справа; Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, менеджэр-эканаміст.

Працаваў урачом-анестэзіёлагам-рэаніматолагам медыка-санітарнай часці Магілёўскага камбіната сінтэтычных валокнаў імя У.І.Леніна, галоўным урачом санаторыя-прафілакторыя «Кіравец» Магілёўскага аўтазавода імя С.М.Кірава, урачом-анестэзіёлагам-рэаніматолагам медыка-санітарнай часці Магілёўскага вытворчага аб'яднання «Хімвалакно». Займаў пасады намесніка галоўнага ўрача па медыцынскай частцы 2-й клінічнай бальніцы, галоўнага ўрача лячэбна-прафілактычнай установы «Гарадская клінічная бальніца хуткай медыцынскай дапамогі» горада Мінска.

Узнагароджаны юбілейнымі медалямі «60 год Перамогі над Германіяй», «90 год Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь, знакам «Выдатнік аховы здароўя Рэспублікі Беларусь».







# КРАСУЦКІ
# Анатоль Віктаравіч

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і сувязях з СНД**

*Партызанская выбарчая акруга № 110*

Нарадзіўся 24 кастрычніка 1947 года ў горадзе Мінску. Закончыў Беларускі дзяржаўны універсітэт, юрыст; Мінскую вышэйшую партыйную школу, палітолаг; Расійскую акадэмію дзяржаўнай службы пры Прэзідэнце Расійскай Федэрацыі, менеджэр-эканаміст. Заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь. Акадэмік Міжнароднай акадэміі інфармацыйных тэхналогій.

Працоўную дзейнасць пачаў слесарам-інструментальшчыкам вытворчага аб'яднання цацак «Мір». Служыў у радах Узброеных Сіл. Працаваў памочнікам пракурора Савецкага раёна горада Мінска, кансультантам аддзела памілавання, старшым рэферэнтам прыёмнай Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР, загадчыкам аддзела, начальнікам Упраўлення пісем і прыёму грамадзян Сакратарыята Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь.

Выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь трынаццатага склікання – старшынёй Пастаяннай камісіі па рэгламенту, мандатах і дэпутацкай этыцы. З'яўляўся дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь першага склікання – старшынёй Пастаяннай камісіі па дзяржаўнаму будаўніцтву, мясцоваму самакіраванню і рэгламенту, другога склікання – намеснікам старшыні Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і сувязях з СНД.

Член Нацыянальнага алімпійскага камітэта Рэспублікі Беларусь. Старшыня грамадскага аб'яднання «Беларуская федэрацыя хакея на траве».

Узнагароджаны ордэнам «Садружнасць» (Міжпарламенцкая Асамблея дзяржаў – удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў), медалямі «Ветэран працы», «90 год Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Савета Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў – удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў, Ганаровай граматай Міжпарламенцкай Асамблеі Еўразійскага эканамічнага супольніцтва, Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.



# КРОТ
# Зоя Карпаўна

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па працы, сацыяльнай абароне, справах ветэранаў і інвалідаў**

*Віцебская-Горкаўская выбарчая акруга № 17*

Нарадзілася 12 лютага 1950 года ў вёсцы Іванькі Міёрскага раёна Віцебскай вобласці. Закончыла Даўгаўпілскі педагагічны інстытут, настаўнік гісторыі і грамадазнаўства; Акадэмію грамадскіх навук пры ЦК КПСС.

Працоўную дзейнасць пачала старшай піянерважатай Дворнасельскай сярэдняй школы Міёрскага раёна Віцебскай вобласці. Працавала метадыстам раённага Дома піянераў і школьнікаў, загадчыкам сектара ўліку і фінансаў, другім і першым сакратаром Міёрскага райкама ЛКСМБ, загадчыкам аддзела камсамольскіх арганізацый, другім і першым сакратаром Віцебскага абкама ЛКСМБ, інструктарам Віцебскага абкама КПБ, намеснікам старшыні, старшынёй Віцебскага абласнога аб'яднання прафсаюзаў. З'яўлялася намеснікам старшыні Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў, старшынёй савета па справах рэлігій і нацыянальнасцей, начальнікам упраўлення сацыяльнай абароны Віцебскага аблвыканкама. Займала пасаду старшыні камітэта па працы і сацыяльнай абароне Віцебскага аблвыканкама.

Узнагароджана ордэнам «Знак Пашаны», медалём «За працоўныя заслугі», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Міжпарламенцкай Асамблеі Еўразійскага эканамічнага супольніцтва.







# КРУК
# Уладзімір Уладзіміравіч

**Член Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і сувязях з СНД**

*Усходняя выбарчая акруга № 107*

Нарадзіўся 23 верасня 1957 года ў вёсцы Вызваленне Смалявіцкага раёна Мінскай вобласці. Закончыў Беларускую дзяржаўную політэхнічную акадэмію і аспірантуру, інжынер-эканаміст.

Працоўную дзейнасць пачаў электраманцёрам Мінскага камбіната сілікатных вырабаў. Служыў у радах Узброеных Сіл. Працаваў наладчыкам-брыгадзірам тэхналагічнага абсталявання Мінскага вытворча-тэхнічнага аб'яднання «Інтэграл», начальнікам арганізацыйнага аддзела творчага цэнтра савецка-амерыканскай праграмы «Дзеці – творцы XXI стагоддзя» прадпрыемства «Інтурсервіс» у горадзе Мінску, генеральным дырэктарам вытворчага прадпрыемства «Магма-1», старшынёй рэдакцыйнага савета газет «Дорожный патруль», «Гастроном», «Экспресс-контакт», выканаўчым дырэктарам закрытага акцыянернага таварыства «Гандлёвы Дом «ЛУКойл», намеснікам камерцыйнага дырэктара адкрытага акцыянернага таварыства «Палімір».

З'яўляўся членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь першага склікання – членам Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы і другога склікання – намеснікам старшыні Пастаяннай камісіі па заканадаўству і дзяржаўнаму будаўніцтву.

Узнагароджаны Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Савета Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў – удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў, Ганаровай граматай Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі, Граматай Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі.



## КУЖАНАЎ
## Уладзімір Іванавіч

**Член Пастаяннай камісіі па праблемах чарнобыльскай катастрофы, экалогіі і прыродакарыстанню**

*Буда-Кашалёўская выбарчая акруга № 40*

Нарадзіўся 27 чэрвеня 1952 года ў вёсцы Рагінь Буда-Кашалёўскага раёна Гомельскай вобласці. Закончыў Беларускі інстытут інжынераў чыгуначнага транспарту, інжынер; Мінскую вышэйшую партыйную школу, выкладчык грамадскіх дысцыплін; Інстытут дзяржаўнай бяспекі.

Пасля службы ў радах Узброеных Сіл працаваў у Мінскім лакаматыўным дэпо, служыў у органах Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь, Службе бяспекі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, быў афіцыйным прадстаўніком Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь ва Украіне.

Узнагароджаны сямю медалямі, Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



## КУЗНЯЦОВА
## Ларыса Фёдараўна

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічнаму прагрэсу**

*Гомельская-Савецкая выбарчая акруга № 36*

Нарадзілася 27 красавіка 1958 года ў горадзе Гомелі. Закончыла Гомельскі дзяржаўны універсітэт, гісторык.

Працоўную дзейнасць пачала лабарантам кафедры хіміі Гомельскага дзяржаўнага універсітэта. Працавала старшай піянерважатай, настаўнікам гісторыі сярэдняй школы № 39 горада Гомеля, загадчыкам сектара ўліку і фінансаў Гомельскага райкама ЛКСМБ, адказным сакратаром Гомельскай раённай арганізацыі таварыства «Веды», інструктарам ідэалагічнага аддзела Гомельскага райкама КПБ. З'яўлялася дырэктарам па вучэбна-выхаваўчай рабоце Урыцкай сярэдняй школы, дырэктарам Красненскай сярэдняй школы Гомельскага раёна, дырэктарам сярэдняй школы № 33 горада Гомеля. Займала пасады намесніка кіраўніка адміністрацыі Савецкага раёна горада Гомеля, начальніка аддзела адукацыі Гомельскага гарвыканкама.

Узнагароджана Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



# КУЛАКОЎСКІ Юрый Аляксандравіч

**Старшыня Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі**

*Бабруйская сельская выбарчая акруга № 65*

Нарадзіўся 29 сакавіка 1952 года ў вёсцы Дабранка Старадарожскага раёна Мінскай вобласці. Закончыў Магілёўскі дзяржаўны педагагічны інстытут, настаўнік гісторыі і грамадазнаўства; Мінскі інстытут паліталогіі і сацыяльнага кіравання КПБ, палітолаг.

Працоўную дзейнасць пачаў электраслесарам вайсковай часці ў горадзе Слуцку Мінскай вобласці, быў трэнерам дзіцяча-юнацкай спартыўнай школы горада Слуцка. Працаваў інструктарам арганізацыйнага аддзела Кіраўскага райкама КПБ Магілёўскай вобласці. Служыў у радах Узброеных Сіл намеснікам камандзіра па палітычнай часткі, намеснікам камандзіра роты па палітычнай частцы. Быў інструктарам арганізацыйнага аддзела Кіраўскага райкама КПБ, сакратаром парткама Жыліцкага саўгаса-тэхнікума Кіраўскага раёна, сакратаром Кіраўскага райкама КПБ. Займаў пасады дырэктара Жыліцкай сярэдняй школы Кіраўскага раёна, намесніка старшыні Кіраўскага райвыканкама. Быў памочнікам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь – галоўным інспектарам па Магілёўскай вобласці.

Выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь трынаццатага склікання. З'яўляўся дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь першага склікання – старшынёй Пастаяннай камісіі па правах чалавека і нацыянальных адносінах.

Мае Падзяку Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Узнагароджаны юбілейным медалём «90 год Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.







# КУЛІК Віталь Васільевіч

**Старшыня Пастаяннай камісіі па праблемах чарнобыльскай катастрофы, экалогіі і прыродакарыстанню**

*Хойніцкая выбарчая акруга № 49*

Нарадзіўся 5 ліпеня 1958 года ў вёсцы Завялёўе Драгічынскага раёна Брэсцкай вобласці. Закончыў Мінскі радыётэхнічны інстытут, інжынер-электрык; Беларускі дзяржаўны эканамічны універсітэт, эканаміст-менеджэр.

Працоўную дзейнасць пачаў рабочым у Драгічынскай раённай нарыхтоўчай канторы. Працаваў інжынерам, галоўным энергетыкам, дырэктарам Рэчыцкага камбіната хлебапрадуктаў.

Выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь трынаццатага склікання. З'яўляўся дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь першага і другога скліканняў – старшынёй Пастаяннай камісіі па праблемах чарнобыльскай катастрофы, экалогіі і прыродакарыстанню.

Узнагароджаны ордэнам Пашаны, юбілейным медалём «90 год Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Савета Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў – удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў, Ганаровай граматай Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі, Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.



# КУЦКО
# Мікалай Васільевіч

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па аграрных пытаннях**

*Рэчыцкая выбарчая акруга № 46*

Нарадзіўся 9 кастрычніка 1954 года ў вёсцы Табулкі Пінскага раёна Брэсцкай вобласці. Закончыў Беларускую ордэна Кастрычніцкай Рэвалюцыі і ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга сельскагаспадарчую акадэмію, інжынер-механік; Акадэмію кіравання пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь, менеджэр-эканаміст.

Працаваў галоўным інжынерам саўгаса «Навасёлкі» Петрыкаўскага раёна, дырэктарам саўгаса «Маканавічы» («Сцяг Перамогі») Рэчыцкага раёна, інструктарам Гомельскага абкама КПБ, першым намеснікам старшыні Рэчыцкага райвыканкама – начальнікам упраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання.

Выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь трынаццатага склікання. З'яўляўся дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь першага склікання – старшынёй Пастаяннай камісіі па аграрных пытаннях, другога склікання – намеснікам старшыні Пастаяннай камісіі па бюджэту, фінансах і падатковай палітыцы.

З'яўляўся кіраўніком вучобы дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў другога і трэцяга скліканняў.

Узнагароджаны медалямі «За працоўныя заслугі», «90 год Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі.







# КУЧЫНСКІ
# Віктар Францавіч

**Член Пастаяннай камісіі па дзяржаўнаму будаўніцтву, мясцоваму самакіраванню і рэгламенту**

*Кобрынская выбарчая акруга № 11*

Нарадзіўся 2 ліпеня 1958 года ў вёсцы Заброддзе Жыткавіцкага раёна Гомельскай вобласці. Закончыў Курганскае вышэйшае ваенна-палітычнае вучылішча, палітработнік з сярэдняй ваенна-палітычнай адукацыяй; Беларускі дзяржаўны універсітэт, гісторык, юрыст; Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, менеджэр-эканаміст. Палкоўнік.

Працоўную дзейнасць пачаў электраманцёрам у горадзе Кобрыне. Служыў у радах Узброеных Сіл на афіцэрскіх пасадах. Працаваў Начальнікам Сакратарыята Парламента – Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, памочнікам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па асобых даручэннях – дырэктарам Дэпартамента па гуманітарнай дзейнасці пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.

Выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь дванаццатага склікання – сакратаром Пастаяннай камісіі па справах моладзі, дэпутатам Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь трынаццатага склікання. З'яўляўся дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь першага і другога скліканняў.

Узнагароджаны ордэнам «За асабістую мужнасць», медалямі «За бездакорную службу», «70 год Узброеных Сіл СССР», «80 год Узброеных Сіл СССР», «90 год Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь», «90 год органам дзяржаўнай бяспекі Беларусі», «80 год Пракуратуры Рэспублікі Беларусь», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, імянной зброяй.



## ЛЕКТАРАЎ
## Валерый Мікалаевіч

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па працы, сацыяльнай абароне, справах ветэранаў і інвалідаў**

*Шумілінская выбарчая акруга № 32*

Нарадзіўся 25 студзеня 1947 года ў горадзе Бійску Алтайскага краю РСФСР. Закончыў Віцебскі дзяржаўны медыцынскі інстытут, урач-хірург. Кандыдат медыцынскіх навук.

Працоўную дзейнасць пачаў урачом бальніцы станцыі Віцебск Беларускай чыгункі. Працаваў клінічным ардынатарам, старшым лабарантам кафедры агульнай хірургіі Віцебскага дзяржаўнага медыцынскага інстытута, урачом-хірургам клінічнай бальніцы чыгуначнай станцыі Віцебск, намеснікам галоўнага ўрача па лячэбнай рабоце бальніцы № 3 горада Віцебска. Займаў пасады намесніка начальніка ўпраўлення, начальніка ўпраўлення аховы здароўя Віцебскага аблвыканкама.

Выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь трынаццатага склікання. З’яўляўся дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь першага і другога скліканняў – старшынёй Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, справах сям’і і моладзі.

Старшыня Беларускай асацыяцыі ўрачоў.

Узнагароджаны юбілейным медалём «90 год Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі, Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, знакам «Выдатнік аховы здароўя».



## ЛІС
## Анатоль Васільевіч

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па заканадаўству і судова-прававых пытаннях**

*Навагрудская выбарчая акруга № 59*

Нарадзіўся 1 сакавіка 1958 года ў вёсцы Рэўкі Мастоўскага раёна Гродзенскай вобласці. Закончыў Беларускі інстытут механізацыі сельскай гаспадаркі, інжынер-механік; магістратуру Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, магістр паліталогіі.

Працоўную дзейнасць пачаў газаэлектразваршчыкам аўтабазы № 5 горада Скідзеля Гродзенскага раёна. Пасля службы ў радах Узброеных Сіл працаваў галоўным інжынерам калгаса «Кастрычнік» Слонімскага раёна, выкладчыкам спецдысцыплін, старшым майстрам СПТВ № 199 горада Скідзеля. Быў інструктарам Гродзенскага райкама КПБ, вызваленым сакратаром парткама, намеснікам старшыні калгаса «Кастрычнік», намеснікам старшыні калектыўнага сельгаспрадпрыемства «Кастрычнік» Гродзенскага раёна. Займаў пасаду старшыні Навагрудскага райвыканкама.

Старшыня Мазырскага райвыканкама.

Узнагароджаны медалямі «За працоўныя заслугі», «90 год Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Савета Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў – удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў.



## ЛЯШЧАНКА
## Людміла Максімаўна

**Член Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічнаму прагрэсу**

*Бярэзінская выбарчая акруга № 76*

Нарадзілася 14 жніўня 1955 года ў вёсцы Галоўчын Бялыніцкага раёна Магілёўскай вобласці. Закончыла Беларускі дзяржаўны універсітэт, выкладчык гісторыі і грамадазнаўства.

Працавала настаўнікам пачатковых класаў, выхавацелем групы падоўжанага дня, настаўнікам гісторыі Каменнаборскай сярэдняй школы Бярэзінскага раёна Мінскай вобласці. Была сакратаром, выконваючым абавязкі старшыні выканкама Багушэвіцкага сельскага Савета дэпутатаў, настаўнікам гісторыі, дырэктарам Дзмітравіцкай сярэдняй школы Бярэзінскага раёна, дырэктарам Кандацкай сярэдняй школы Цюхтэцкага раёна Краснаярскага краю, настаўнікам пачатковых класаў Такучэцкай сярэдняй школы пасёлка Сплаўны Краснаярскага краю. Займала пасады дырэктара Любушанскай сярэдняй школы-садка Бярэзінскага раёна Мінскай вобласці, начальніка аддзела адукацыі Бярэзінскага райвыканкама.

Узнагароджана Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, медалём Святой прападобнай Ефрасінні, ігуменні Полацкай.







## МАЗУРКЕВІЧ
## Галіна Аляксееўна

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па дзяржаўнаму будаўніцтву, мясцоваму самакіраванню і рэгламенту, член Савета Палаты прадстаўнікоў**

*Свіслацкая выбарчая акруга № 96*

Нарадзілася 25 лістапада 1954 года ў вёсцы Мяшчэнцы Сенненскага раёна Віцебскай вобласці. Закончыла Беларускі дзяржаўны універсітэт, філосаф; Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, менеджэр-эканаміст.

Працавала сарціроўшчыцай Мінскага камбіната будматэрыялаў, адміністратарам кінатэатра «Масква» ўпраўлення кінафікацыі Мінскага гарвыканкама, намеснікам дырэктара вучэбна-курсавога камбіната Мінскага камвольнага камбіната, інструктарам аддзела прапаганды і агітацыі Ленінскага райкама КПБ горада Мінска, намеснікам старшыні Ленінскага райвыканкама горада Мінска, намеснікам кіраўніка адміністрацыі Ленінскага раёна горада Мінска.

Выбіралася дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь другога склікання.

Узнагароджана Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Савета Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў – удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў.



## МАЙСЮК
## Уладзімір Уладзіміравіч

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па прамысловасці, паліўна-энергетычнаму комплексу, транспарту, сувязі і прадпрымальніцтву**

*Баранавіцкая сельская выбарчая акруга № 6*

Нарадзіўся 22 жніўня 1949 года ў горадзе Ляхавічы Брэсцкай вобласці. Закончыў Брэсцкі інжынерна-будаўнічы інстытут, інжынер-будаўнік.

Працоўную дзейнасць пачаў вызваленым старшынёй прафкама Брэсцкага інжынерна-будаўнічага інстытута. Працаваў загадчыкам арганізацыйнага аддзела, другім сакратаром Брэсцкага гаркама ЛКСМБ, старшым інжынерам лабараторыі будаўнічага трэста № 8, прарабам будаўнічага ўпраўлення № 32 будаўнічага трэста № 8 Міністэрства прамысловага будаўніцтва БССР, намеснікам начальніка Ляхавіцкай перасоўнай механізаванай калоны № 13. З’яўляўся начальнікам Ляхавіцкай дарожна-будаўнічай перасоўнай механізаванай калоны № 185 Брэсцкага абласнога аб’яднання міжкалгасных будаўнічых арганізацый, начальнікам Баранавіцкага дарожнага рамонтна-будаўнічага ўчастка рэспубліканскага праектна-будаўнічага аб’яднання «Аўтамагістраль» Брэсцкай вобласці, начальнікам дарожна-эксплуатацыйнага ўпраўлення № 3 рэспубліканскага дзяржаўнага вытворчага прадпрыемства «Белаўтастрада» Брэсцкай вобласці. Займаў пасаду генеральнага дырэктара рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства аўтамабільных дарог «Брэстаўтадар».

Узнагароджаны Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, знакам «Ганаровы дарожнік» I і II ступені.







## МАЛЕЦ
## Уладзімір Міхайлавіч

**Член Пастаяннай камісіі па жыллёвай палітыцы, будаўніцтву, гандлю і прыватызацыі**

*Лідская гарадская выбарчая акруга № 56*

Нарадзіўся 18 кастрычніка 1955 года ў вёсцы Гераньёны Іўеўскага раёна Гродзенскай вобласці. Закончыў Беларускі політэхнічны інстытут, інжынер-будаўнік; Мінскі інстытут паліталогіі і сацыяльнага кіравання КПБ, палітолаг.

Працоўную дзейнасць пачаў інжынерам упраўлення капітальнага будаўніцтва Ашмянскага райвыканкама Гродзенскай вобласці. Пасля службы ў радах Узброеных Сіл працаваў інжынерам Лідскай майстэрні праектна-тэхналагічнага інстытута «Сельгастэхпраект» Гродзенскай вобласці, інжынерам, старшым інжынерам будаўнічага трэста № 19 горада Ліды, інструктарам, загадчыкам прамыслова-транспартнага аддзела Лідскага гаркама КПБ, галоўным інжынерам упраўлення капітальнага будаўніцтва Лідскага гарвыканкама, старшынёй Лідскага гарадскога Савета народных дэпутатаў, старшынёй Лідскага гарвыканкама, намеснікам старшыні Гродзенскага аблвыканкама.

Намеснік Міністра архітэктуры і будаўніцтва Рэспублікі Беларусь.

Узнагароджаны юбілейным медалём «90 год Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі, Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.



# МАРАХІН
# Віктар Іванавіч

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па бюджэту, фінансах і падатковай палітыцы**

*Уручская выбарчая акруга № 109*

Нарадзіўся 1 мая 1958 года ў горадзе Быхаве Магілёўскай вобласці. Закончыў Кіеўскае вышэйшае ваеннае інжынернае вучылішча сувязі, радыёінжынер; Ленінградскую ваенную акадэмію сувязі, інжынер аўтаматызаваных сістэм кіравання; Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь па спецыяльнасці дзяржаўнае рэгуляванне нацыянальнай эканомікі.

Праходзіў ваенную службу ў якасці намесніка начальніка цэнтра брыгады сувязі Туркестанскай ваеннай акругі, начальніка выязнога аддзялення па рамонту сродкаў сувязі брыгады матэрыяльнага забеспячэння ў Афганістане, старшага памочніка начальніка сувязі дывізіі гвардзейскай танкавай арміі групы савецкіх войскаў у Германіі, вядучага інжынера, начальніка групы Ваеннага прадстаўніцтва, намесніка начальніка Ваеннага прадстаўніцтва Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь.

Выбіраўся дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь другога склікання – намеснікам старшыні Пастаяннай камісіі па бюджэту, фінансах і падатковай палітыцы.

Мае Падзяку Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Узнагароджаны ордэнам «Садружнасць» (Міжпарламенцкая Асамблея дзяржаў – удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў), дванаццаццю медалямі СССР, Дэмакратычнай Рэспублікі Афганістан, Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета СССР, Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Савета Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў – удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў, Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.







# МАСКЕВІЧ
# Сяргей Аляксандравіч

**Член Пастаяннай камісіі па бюджэту, фінансах і падатковай палітыцы**

*Гродзенская-Цэнтральная выбарчая акруга № 52*

Нарадзіўся 1 жніўня 1953 года ў вёсцы Быкаўка Шчучынскага раёна Гродзенскай вобласці. Закончыў Гродзенскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя Я.Купалы, настаўнік фізікі. Доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар.

Працаваў лабарантам, старшым інжынерам Гродзенскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя Я.Купалы. Пасля службы ў радах Узброеных Сіл працаваў старшым навуковым супрацоўнікам, старшым выкладчыкам, дацэнтам, прарэктарам па навуковай рабоце, рэктарам установы адукацыі «Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Я.Купалы».

Узнагароджаны медалямі Францыска Скарыны, «90 год Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.



## МЫЧКО
## Іван Мікалаевіч

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па грашова-крэдытнай палітыцы і банкаўскай дзейнасці**

*Паўднёва-Заходняя выбарчая акруга № 100*

Нарадзіўся 1 жніўня 1949 года ў вёсцы Старыя Габы Мядзельскага раёна Мінскай вобласці. Закончыў Беларускі дзяржаўны універсітэт (двойчы), юрыст, выкладчык гісторыі і грамадска-палітычных дысцыплін; Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, юрыст міжнароднага права.

Працаваў наладчыкам Мінскага завода шасцерняў, электрамантажнікам у «ВілюйГЭСбудзе», старшым майстрам дарожна-эксплуатацыйнага ўчастка Ленінскага раёна горада Мінска, старшым інспектарам упраўлення ўліку і размеркавання жылой плошчы Мінскага гарвыканкама, загадчыкам аддзела Партызанскага райвыканкама горада Мінска, інструктарам Беларускага савета прафесійных саюзаў, кансультантам Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў, намеснікам начальніка ўпраўлення па эканамічнай рэформе Мінскага гарвыканкама, загадчыкам юрыдычнага аддзела Мінскага гарвыканкама, намеснікам кіраўніка адміністрацыі Маскоўскага раёна горада Мінска.

Выбіраўся дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь другога склікання – намеснікам старшыні Пастаяннай камісіі па грашова-крэдытнай палітыцы і банкаўскай дзейнасці.

Узнагароджаны медалём «За працоўныя заслугі», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі, Ганаровай граматай Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта.



## НАВАСАД
## Тамара Іванаўна

**Член Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічнаму прагрэсу**

*Ваўкавыская выбарчая акруга № 50*

Нарадзілася 1 кастрычніка 1952 года ў вёсцы Трухановічы Дзятлаўскага раёна Гродзенскай вобласці. Закончыла Гродзенскі дзяржаўны універсітэт, настаўнік рускай мовы і літаратуры.

Працоўную дзейнасць пачала старшай піянерважатай сярэдняй школы № 2 горада Ваўкавыска Гродзенскай вобласці. Працавала выхавацелем школьнага інтэрната Ліпскай сярэдняй школы Ляхавіцкага раёна Брэсцкай вобласці, старшай піянерважатай Краснасельскай сярэдняй школы Ваўкавыскага раёна Гродзенскай вобласці, дырэктарам Дома піянераў горада Ваўкавыска. Была арганізатарам пазакласнай і пазашкольнай выхаваўчай работы, дырэктарам сярэдняй агульнаадукацыйнай школы № 6 горада Ваўкавыска. Займала пасаду дырэктара установы адукацыі «Гімназія № 2 г. Ваўкавыска».

Узнагароджана Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



# ОРДА
# Міхаіл Сяргеевіч

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па дзяржаўнаму будаўніцтву, мясцоваму самакіраванню і рэгламенту**

*Лідская сельская выбарчая акруга № 57*

Нарадзіўся 28 верасня 1966 года ў гарадскім пасёлку Дзятлава Гродзенскай вобласці. Закончыў Віцебскі ветэрынарны інстытут, ветэрынарны ўрач; Расійскую акадэмію дзяржаўнай службы пры Прэзідэнце Расійскай Федэрацыі па спецыяльнасці муніцыпальнае кіраванне.

Працоўную дзейнасць пачаў слесарам у калгасе «Расія» Дзятлаўскага раёна. Служыў у радах Узброеных Сіл. З’яўляўся камандзірам абласнога штаба студэнцкіх атрадаў Віцебскай вобласці, дырэктарам абласной службы добраахвотнай працы моладзі, прэзідэнтам Рэспубліканскай асацыяцыі міжнародных маладзёжных абменаў і турызму. Працаваў другім сакратаром Цэнтральнага камітэта грамадскага аб’яднання «Беларускі патрыятычны саюз моладзі», першым сакратаром Цэнтральнага камітэта грамадскага аб’яднання «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі». Быў упаўнаважаным Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па Гродзенскай вобласці.

Выбіраўся дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь другога склікання – намеснікам старшыні Пастаяннай камісіі па дзяржаўнаму будаўніцтву, мясцоваму самакіраванню і рэгламенту.

Кіраўнік групы Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па супрацоўніцтву з Парламентам Рэспублікі Балгарыя.

Член Савета па каардынацыі кантрольнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь.

Мае Падзяку Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Узнагароджаны Ганаровай граматай Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



# ПАЛЯНСКАЯ
# Галіна Уладзіміраўна

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па жыллёвай палітыцы, будаўніцтву, гандлю і прыватызацыі**

*Коласаўская выбарчая акруга № 106*

Нарадзілася 10 чэрвеня 1950 года ў горадзе Валгаградзе РСФСР. Закончыла Беларускі політэхнічны інстытут, архітэктар. Кандыдат архітэктуры, дацэнт.

Працавала архітэктарам дзяржаўнага праектнага інстытута «Мінскпраект», асістэнтам кафедры горадабудаўніцтва Беларускага політэхнічнага інстытута, асістэнтам, старшым выкладчыкам, дацэнтам кафедры горадабудаўніцтва Беларускага політэхнічнага інстытута, дацэнтам кафедры, намеснікам дэкана архітэктурнага факультэта Беларускай політэхнічнай акадэміі, дэканам архітэктурнага факультэта Беларускага нацыянальнага тэхнічнага універсітэта.

Член Савета Беларускага саюза архітэктараў.

Узнагароджана Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



## ПАПЛАЎСКІ
## Міхаіл Іванавіч

**Член Пастаяннай камісіі па праблемах чарнобыльскай катастрофы, экалогіі і прыродакарыстанню**

*Рагачоўская выбарчая акруга № 47*

Нарадзіўся 2 студзеня 1946 года ў вёсцы Струмень Кармянскага раёна Гомельскай вобласці. Закончыў Кіеўскі політэхнічны інстытут па спецыяльнасці аптычныя прыборы і спектраскапія.

Працаваў майстрам, інжынерам-тэхнолагам завода «Арсенал» у горадзе Кіеве, старшым інжынерам-тэхнолагам, першым намеснікам галоўнага інжынера – галоўным тэхнолагам, галоўным інжынерам, дырэктарам завода «Дыяпраектар» у горадзе Рагачове Гомельскай вобласці.

Выбіраўся дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь другога склікання – намеснікам старшыні Пастаяннай камісіі па прамысловасці, паліўна-энергетычнаму комплексу, транспарту, сувязі і прадпрымальніцтву.

Узнагароджаны сярэбраным і двума бронзавымі медалямі ВДНГ СССР, юбілейным медалём «90 год Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



## ПАПОЎ
## Вадзім Аляксандравіч

**Старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і сувязях з СНД (2004 – 2007)**

**Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь (2007 – 2008)**

*Клічаўская выбарчая акруга № 68*

Нарадзіўся 5 ліпеня 1940 года ў горадзе Дзямідаве Смаленскай вобласці РСФСР. Закончыў Беларускі інстытут механізацыі сельскай гаспадаркі, інжынер-механік; Мінскую вышэйшую партыйную школу.

Працоўную дзейнасць пачаў рабочым у саўгасе «Бацішчаўскі» Смаленскай вобласці. Працаваў брыгадзірам, механікам саўгаса ў Алтайскім краі. Служыў у радах Узброеных Сіл. Выкладаў у прафесійна-тэхнічным вучылішчы ў горадзе Крычаве. Быў на камсамольскай рабоце, працаваў дырэктарам саўгаса імя Калініна Краснапольскага раёна, інструктарам ЦК КПБ, першым сакратаром Асіповіцкага гаркама КПБ, першым сакратаром Магілёўскага абкама КПБ, генеральным дырэктарам дзяржаўнага вытворчага аб’яднання «Магілёўаблаграпрамтэхзабеспячэнне», генеральным дырэктарам холдзінга ў форме адкрытага акцыянернага таварыства «Аграмашсервіс» Магілёўскай вобласці. Займаў пасады першага намесніка Міністра, Міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Рэспублікі Беларусь.

З’яўляўся Старшынёй Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь другога склікання.

Член Вышэйшага Дзяржаўнага Савета Саюзнай дзяржавы.

Узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, Айчыны III ступені, «Садружнасць» (Міжпарламенцкая Асамблея дзяржаў – удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў), медалямі, ганаровымі граматамі дзяржаўных органаў і міжнародных арганізацый.



## ПАЎЛОВІЧ
## Анатоль Уладзіміравіч

**Старшыня Пастаяннай камісіі па прамысловасці, паліўна-энергетычнаму комплексу, транспарту, сувязі і прадпрымальніцтву**

*Васняцоўская выбарчая акруга № 95*

Нарадзіўся 20 ліпеня 1953 года ў вёсцы Зароўцы Шклоўскага раёна Магілёўскай вобласці. Закончыў Магілёўскі машынабудаўнічы інстытут, інжынер-механік.

Працоўную дзейнасць пачаў інжынерам-тэхнолагам Адзінаццатага дзяржаўнага падшыпнікавага завода (ДПЗ-11) у горадзе Мінску. Працаваў намеснікам начальніка цэха, намеснікам начальніка аддзела, сакратаром парткама ДПЗ-11, намеснікам начальніка аддзела арэнднага прадпрыемства «Мінскі падшыпнікавы завод», галоўным тэхнолагам – начальнікам аддзела галоўнага тэхнолага адкрытага акцыянернага таварыства «Мінскі падшыпнікавы завод», намеснікам тэхнічнага дырэктара адкрытага акцыянернага таварыства «Мінскі падшыпнікавы завод».

Узнагароджаны юбілейным медалём «90 год Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.





## РУГАЛЬ
## Ніна Фёдараўна

**Член Пастаяннай камісіі па прамысловасці, паліўна-энергетычнаму комплексу, транспарту, сувязі і прадпрымальніцтву, член Савета Палаты прадстаўнікоў**

*Жодзінская выбарчая акруга № 81*

Нарадзілася 28 мая 1951 года ў вёсцы Высокая Слабада Смаленскай вобласці РСФСР. Закончыла Віцебскі тэхналагічны інстытут лёгкай прамысловасці, інжынер-тэхнолаг; Мінскі інстытут сучасных тэхналогій і маркетынгу, менеджэр.

Працоўную дзейнасць пачала швачкай Віцебскай швейнай фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі». Працавала майстрам, інжынерам па стандартызацыі Бабруйскай футравай фабрыкі Магілёўскай вобласці, інжынерам-канструктарам, інжынерам-тэхнолагам, начальнікам швейнага цэха Мінскага вытворчага трыкатажнага аб’яднання. Займала пасаду намесніка дырэктара па вытворчасці адкрытага акцыянернага таварыства «Світанак».

Узнагароджана ордэнам «Знак Пашаны», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



# РУСЫ
# Міхаіл Іванавіч

**Старшыня Пастаяннай камісіі па аграрных пытаннях**

*Жыткавіцкая выбарчая акруга № 41*

Нарадзіўся 23 лістапада 1954 года ў вёсцы Вароніна Жыткавіцкага раёна Гомельскай вобласці. Закончыў Беларускую ордэна Кастрычніцкай Рэвалюцыі і ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга сельскагаспадарчую акадэмію, вучоны аграном; Мінскую вышэйшую партыйную школу, выкладчык грамадскіх дысцыплін.

Працоўную дзейнасць пачаў галоўным аграномам калгаса імя Леніна Жыткавіцкага раёна Гомельскай вобласці. Працаваў намеснікам старшыні, старшынёй калгаса імя Леніна Жыткавіцкага раёна; першым намеснікам старшыні Карлянскага райвыканкама – начальнікам упраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання, другім сакратаром Карлянскага райкама КПБ, інструктарам аддзела арганізацыйна-партыйнай работы ЦК КПБ, першым сакратаром Стаўбцоўскага райкама КПБ Мінскай вобласці. Быў старшынёй Камітэта па зямельнай рэформе і землеўпарадкаванню пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь. Займаў пасады Міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь, Міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Рэспублікі Беларусь, кіраўніка аддзялення Пасольства Рэспублікі Беларусь у Расійскай Федэрацыі ў горадзе Санкт-Пецярбургу.

Узнагароджаны юбілейным медалём «90 год Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Савета Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў – удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў.







# САЙКО
# Аляксандр Аляксеевіч

**Член Пастаяннай камісіі па бюджэту, фінансах і падатковай палітыцы**

*Слуцкая выбарчая акруга № 89*

Нарадзіўся 26 жніўня 1951 года ў вёсцы Зубкі Клецкага раёна Мінскай вобласці. Закончыў Беларускую ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга сельскагаспадарчую акадэмію, вучоны аграном; Мінскую вышэйшую партыйную школу.

Працоўную дзейнасць пачаў мулярам ПМК-44 трэста «Магілёўбуд». Працаваў аграномам, аграномам-насеннядам калгаса «17 верасня» Нясвіжскага раёна Мінскай вобласці, аграномам Клецкай раённай станцыі аховы раслін, старшым аграномам-насеннядам упраўлення сельскай гаспадаркі Клецкага райвыканкама. Быў інструктарам арганізацыйнага аддзела Клецкага райкама КПБ, галоўным аграномам калгаса «Кастрычнік» Клецкага раёна, старшым юрысконсультам упраўлення сельскай гаспадаркі Клецкага райвыканкама, загадчыкам сельскагаспадарчага аддзела Клецкага райкама КПБ, інструктарам аддзела сельскай гаспадаркі і харчовай прамысловасці Мінскага абкама КПБ, другім сакратаром Слуцкага гаркама КПБ Мінскай вобласці. Займаў пасады старшыні Слуцкага гарадскога Савета народных дэпутатаў, старшыні Слуцкага гарвыканкама.

Узнагароджаны медалямі «За працоўныя заслугі», «90 год Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.



# САКАДЫНЕЦ
# Алег Сцяпанавіч

**Член Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, справах сям'і і моладзі**

*Быхаўская выбарчая акруга № 66*

Нарадзіўся 7 лістапада 1951 года ў вёсцы Баркі Кіраўскага раёна Магілёўскай вобласці. Закончыў Мінскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўны медыцынскі інстытут па спецыяльнасці лячэбная справа.

Пасля службы ў радах Узброеных Сіл працаваў урачом-інтэрнам, урачом-псіхіятрам, загадчыкам аддзялення, намеснікам галоўнага ўрача Магілёўскай абласной псіхіятрычнай бальніцы, першым намеснікам начальніка ўпраўлення аховы здароўя Магілёўскага аблвыканкама.

Узнагароджаны юбілейным медалём «90 год Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.







# САЛАМУХА
# Пётр Іванавіч

**Член Пастаяннай камісіі па грашова-крэдытнай палітыцы і банкаўскай дзейнасці**

*Наваполацкая выбарчая акруга № 25*

Нарадзіўся 16 ліпеня 1942 года ў сяле Ляўкоўка Стараканстанцінаўскага раёна Хмяльніцкай вобласці Украінскай ССР. Закончыў Сібірскі тэхналагічны інстытут, інжынер-механік. Заслужаны будаўнік Рэспублікі Беларусь.

Працоўную дзейнасць пачаў слесарам Астрапольскай і Стараканстанцінаўскай рамонтна-тэхнічных станцый ва Украінскай ССР. Працаваў слесарам-мантажнікам Хабараўскага мантажнага ўпраўлення ў горадзе Амурску, майстрам Камсамольскага мантажнага ўпраўлення ў горадзе Камсамольск-на-Амуры, намеснікам начальніка ўпраўлення, начальнікам Наваполацкага мантажнага ўпраўлення «Нафтазаводмантаж» Віцебскай вобласці, дырэктарам Наваполацкага спецыялізаванага прадпрыемства «Нафтазаводмантаж», генеральным дырэктарам адкрытага акцыянернага таварыства «Нафтазаводмантаж».

Выбіраўся членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь другога склікання.

Узнагароджаны юбілейным медалём «90 год Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь», ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

Ганаровы грамадзянін горада Наваполацка.



## САЛАЎЁЎ
## Анатоль Міхайлавіч

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па заканадаўству і судова-прававых пытаннях**

*Гомельская сельская выбарчая акруга № 39*

Нарадзіўся 9 снежня 1954 года ў вёсцы Лешчынец Гомельскага раёна Гомельскай вобласці. Закончыў Мінскую вышэйшую школу Міністэрства ўнутраных спраў СССР, юрыст. Палкоўнік міліцыі.

Працоўную дзейнасць пачаў выхавальнікам у Лазавіцкай школе. Служыў у радах Узброеных Сіл. Працаваў старшым інспектарам па дазнанню, старшым следчым, намеснікам начальніка следчага аддзялення аддзела ўнутраных спраў Савецкага райвыканкама горада Гомеля, начальнікам следчага аддзялення аддзела ўнутраных спраў Цэнтральнага райвыканкама горада Гомеля, начальнікам аддзела ўнутраных спраў Гомельскага райвыканкама, першым намеснікам начальніка ўпраўлення ўнутраных спраў Гомельскага аблвыканкама.

Выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь трынаццатага склікання. З’яўляўся дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь першага склікання – намеснікам старшыні Пастаяннай камісіі па заканадаўству, другога склікання – намеснікам старшыні Пастаяннай камісіі па заканадаўству і судова-прававых пытаннях.

Узнагароджаны медалямі «За бездакорную службу» I, II, III ступені, «80 гадоў Беларускай міліцыі», «90 год міліцыі Беларусі», «90 год органам дзяржаўнай бяспекі Беларусі», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.







## САСОНКА
## Міхаіл Паўлавіч

**Старшыня Пастаяннай камісіі па дзяржаўнаму будаўніцтву, мясцоваму самакіраванню і рэгламенту (2004 – 2008)**
**Член Пастаяннай камісіі па дзяржаўнаму будаўніцтву, мясцоваму самакіраванню і рэгламенту (2008)**

*Полацкая сельская выбарчая акруга № 29*

Нарадзіўся 28 кастрычніка 1953 года ў вёсцы Станіслаўцы Докшыцкага раёна Віцебскай вобласці. Закончыў Беларускі інстытут механізацыі сельскай гаспадаркі, інжынер-электрык; Мінскую вышэйшую партыйную школу, палітолаг.

Працоўную дзейнасць пачаў інжынерам-электрыкам у саўгасе «Краснаполле» Расонскага раёна Віцебскай вобласці. Працаваў галоўным інжынерам, старшынёй Расонскага раённага аб’яднання «Сельэнерга», першым сакратаром Расонскага райкама ЛКСМБ, старшынёй калгаса «Новы свет» Расонскага раёна, першым сакратаром Расонскага райкама КПБ, намеснікам дырэктара акцыянернага таварыства «Расоны», дырэктарам навукова-вытворчага прадпрыемства «Агат» у горадзе Наваполацку.

Выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь трынаццатага склікання. З’яўляўся дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь першага склікання – намеснікам старшыні Пастаяннай камісіі па дзяржаўнаму будаўніцтву, мясцоваму самакіраванню і рэгламенту, другога склікання – старшынёй Пастаяннай камісіі па дзяржаўнаму будаўніцтву, мясцоваму самакіраванню і рэгламенту.

З красавіка 2008 года – Першы намеснік Адказнага сакратара Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі.

Узнагароджаны ордэнам Пашаны, юбілейным медалём «90 год Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі, Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.



# САФРОНЕНКА
# Таццяна Мікалаеўна

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па прамысловасці, паліўна-энергетычнаму комплексу, транспарту, сувязі і прадпрымальніцтву**

*Масюкоўшчынская выбарчая акруга № 104*

Нарадзілася 24 лютага 1954 года ў горадзе Мінску. Закончыла Беларускі дзяржаўны інстытут народнай гаспадаркі імя В.У.Куйбышава, эканаміст; Армавірскі дзяржаўны педагагічны інстытут, настаўнік гісторыі і сусветнай мастацкай культуры.

Працоўную дзейнасць пачала сакратаром Усесаюзнага акцыянернага таварыства «Інтурыст» у горадзе Мінску. Пасля службы ў радах Узброеных Сіл працавала інжынерам планавага аддзела ўпраўлення капітальнага будаўніцтва Мінскага гарвыканкама, рабочай дыспетчарскай службы Мінскага вытворчага аб'яднання «Праца», загадчыкам аддзела Міністэрства плодаагародніннай гаспадаркі БССР. Была дырэктарам сумеснага прадпрыемства «Таня» ў горадзе Мінску, намеснікам дырэктара Магілёўскага акцыянернага таварыства «Стужка», камерцыйным дырэктарам сумеснага прадпрыемства «Корпак Інвест» у горадзе Мінску, камерцыйным дырэктарам сумеснага прадпрыемства «Табак Инвест». Займала пасады начальніка галоўнага ўпраўлення канцэрна «Белдзяржхарчпрам», намесніка дырэктара па камерцыйных пытаннях адкрытага акцыянернага таварыства «Дрожджавы камбінат» у горадзе Мінску, дырэктара кансультацыйна-адукацыйнай установы «Цэнтр сацыяльнай падтрымкі» грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз жанчын».

Узнагароджана юбілейным медалём «90 год Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь.







# СВІРЫД
# Аляксандр Уладзіміравіч

**Член Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі (2004 – 2007)**

**Член Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і сувязях з СНД (2007 – 2008)**

*Івацэвіцкая выбарчая акруга № 10*

Нарадзіўся 7 лістапада 1946 года ў вёсцы Начы Ганцавіцкага раёна Брэсцкай вобласці. Закончыў Магілёўскую савецка-партыйную школу пры ЦК КПБ, эканаміст-арганізатар; Мінскую вышэйшую партыйную школу; Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію, эканаміст-арганізатар сельскагаспадарчай вытворчасці; Расійскую акадэмію дзяржаўнай службы пры Прэзідэнце Расійскай Федэрацыі, менеджэр-эканаміст.

Працоўную дзейнасць пачаў у калгасе «Праўда» Ганцавіцкага раёна. Служыў у радах Узброеных Сіл. Працаваў старшынёй выканкама Дзяніскавіцкага сельскага Савета дэпутатаў працоўных, інструктарам, старшынёй партыйнай камісіі Ганцавіцкага райкама КПБ, старшынёй калгаса «Расія», намеснікам старшыні калгаса «Праўда» Ганцавіцкага раёна, дырэктарам філіяла аптовага і камісійнага гандлю «Брэстаптгандаль», старшынёй Ганцавіцкага райвыканкама.

Выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь трынаццатага склікання – сакратаром Пастаяннай камісіі па правах чалавека, сродках масавай інфармацыі, сувязях з грамадскімі аб'яднаннямі і рэлігійнымі арганізацыямі. З'яўляўся дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь першага склікання – намеснікам старшыні Пастаяннай камісіі па правах чалавека і нацыянальных адносінах, другога склікання – намеснікам старшыні Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі.

Узнагароджаны ордэнамі Пашаны, «Садружнасць» (Міжпарламенцкая Асамблея дзяржаў – удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў), юбілейным медалём «90 год Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь», ганаровымі граматамі.



# СЕМЯНЕНЯ
# Іван Георгіевіч

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па дзяржаўнаму будаўніцтву, мясцоваму самакіраванню і рэгламенту**

*Любанская выбарчая акруга № 83*

Нарадзіўся 12 чэрвеня 1956 года ў вёсцы Рэдкавічы Любанскага раёна Мінскай вобласці. Закончыў Смілавіцкі сельскагаспадарчы тэхнікум па спецыяльнасці заатэхнія; Беларускі дзяржаўны універсітэт, юрыст. Заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь.

Працоўную дзейнасць пачаў загадчыкам малочнатаварнай фермы калгаса «Чырвоная Змена» Любанскага раёна Мінскай вобласці. Працаваў юрыстам, галоўным юрысконсультам упраўлення сельскай гаспадаркі Любанскага райвыканкама, вядучым спецыялістам па дагаворна-прававой рабоце Любанскага раённага аграпрамысловага аб'яднання, адвакатам, загадчыкам Любанскай юрыдычнай кансультацыі.

Выбіраўся дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь другога склікання – намеснікам старшыні Пастаяннай камісіі па дзяржаўнаму будаўніцтву, мясцоваму самакіраванню і рэгламенту.

Узнагароджаны ордэнам Пашаны, юбілейным медалём «90 год Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.







# СЕРГІЕНКА
# Мікалай Васільевіч

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па праблемах чарнобыльскай катастрофы, экалогіі і прыродакарыстанню**

*Баранавіцкая-Усходняя выбарчая акруга № 5*

Нарадзіўся 23 красавіка 1952 года ў горадзе Ахтырка Сумскай вобласці Украінскай ССР. Закончыў Саратаўскае вышэйшае ваенна-хімічнае каманднае вучылішча, афіцэр хімічных войскаў, інжынер па ахове працы хімічных вытворчасцей; Ваенную акадэмію хімічнай абароны імя С.К.Цімашэнкі, афіцэр па баявому прымяненню часцей і злучэнняў хімічных войскаў. Палкоўнік.

Праходзіў ваенную службу ў якасці камандзіра ўзвода, роты, начальніка радыётэхнічнай групы палка засечкі і разведкі ядзерных выбухаў, намесніка камандзіра, камандзіра батальёна хімічнай абароны ў Афганістане, начальніка штаба – намесніка камандзіра палка хімічнай абароны. Выконваў абавязкі камандзіра палка хімічнай абароны ў перыяд ліквідацыі вынікаў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС. Працаваў начальнікам штаба грамадзянскай абароны горада Баранавічы.

Выбіраўся дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь другога склікання.

Мае Падзяку Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, «Знак Пашаны», «За службу Радзіме ва Узброеных Сілах СССР» III ступені, адзінаццаццю медалямі, Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



# СІМІРСКІ
# Валянцін Раманавіч

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і сувязях з СНД (2004 – 2007)**

**Старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і сувязях з СНД (2007 – 2008)**

*Касцюковіцкая выбарчая акруга № 69*

Нарадзіўся 26 красавіка 1946 года ў горадзе Барысаве Мінскай вобласці. Закончыў Беларускі дзяржаўны інстытут фізічнай культуры, выкладчык фізічнай культуры і спорту; Агульнавайсковае ваеннае вучылішча, афіцэр з вышэйшай спецыяльнай адукацыяй; Вышэйшую школу КДБ СССР. Палкоўнік.

Служыў у радах Узброеных Сіл. Працаваў старшым оперупаўнаважаным, начальнікам Асобага аддзела КДБ СССР дывізій, армій у гарадах Брэсце, Барысаве, Дрэздэне, Смаленску, у Афганістане, намеснікам начальніка Упраўлення ваеннай контрразведкі КДБ Рэспублікі Беларусь. Выконваў абавязкі кіраўніка аператыўнай групы ў перыяд ліквідацыі вынікаў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС. Быў віцэ-прэзідэнтам кампаніі «Рэгіён» у горадзе Смаленску, генеральным дырэктарам Швейцарскага прадстаўніцтва кампаніі «Нелант» у горадзе Мінску.

Выбіраўся дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь другога склікання – намеснікам старшыні Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы.

Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, «За службу Радзіме» III ступені, дваццаццю шасцю медалямі, Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета СССР, Ганаровай граматай Савета Міністраў СССР, Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, знакам «Ганаровы супрацоўнік КДБ».



# СКАВАРОДКА
# Уладзімір Юр’евіч

**Член Пастаяннай камісіі па грашова-крэдытнай палітыцы і банкаўскай дзейнасці**

*Міёрская выбарчая акруга № 24*

Нарадзіўся 1 кастрычніка 1954 года ў вёсцы Канахі Міёрскага раёна Віцебскай вобласці. Закончыў Велікалуцкі сельскагаспадарчы інстытут, вучоны аграном.

Працоўную дзейнасць пачаў памочнікам камбайнёра калгаса «Шлях да камунізму» Міёрскага раёна Віцебскай вобласці. Пасля службы ў радах Узброеных Сіл працаваў брыгадзірам, галоўным аграномам калгаса «Шлях да камунізму», намеснікам старшыні калгаса «Баявы партызан», загадчыкам сельскагаспадарчага аддзела Міёрскага райкама КПБ, старшынёй калгаса «1 Мая». Займаў пасады старшыні Міёрскага раённага аграпрамысловага аб’яднання, старшыні Міёрскага раённага Савета дэпутатаў, першага сакратара Міёрскага райкама КПБ, першага намесніка старшыні Міёрскага райвыканкама – начальніка ўпраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання, старшыні Міёрскага райвыканкама.

Узнагароджаны медалямі «За працоўныя заслугі», «90 год Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.



## СКРЫПКО
## Алена Віктараўна

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па праблемах чарнобыльскай катастрофы, экалогіі і прыродакарыстанню**

*Лагойская выбарчая акруга № 82*

Нарадзілася 14 мая 1971 года ў вёсцы Паплавы Клічаўскага раёна Магілёўскай вобласці. Закончыла Магілёўскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя А.А.Куляшова, настаўнік рускай мовы і літаратуры; Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, менеджэр-эканаміст.

Працавала настаўнікам рускай мовы і літаратуры, выхавацелем сярэдняй школы № 2 горада Клічава Магілёўскай вобласці. Выбіралася другім і першым сакратаром Клічаўскага раённага камітэта грамадскага аб’яднання «Беларускі патрыятычны саюз моладзі». Працавала начальнікам упраўлення, першым сакратаром Мінскага абласнога камітэта грамадскага аб’яднання «Беларускі патрыятычны саюз моладзі», першым сакратаром Мінскага абласнога камітэта грамадскага аб’яднання «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».

Узнагароджана Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.







## СТРЫКАЎ
## Фёдар Уладзіміравіч

**Член Пастаяннай камісіі па бюджэту, фінансах і падатковай палітыцы**

*Дзяржынская выбарчая акруга № 80*

Нарадзіўся 2 снежня 1947 года ў вёсцы Мадора Рагачоўскага раёна Гомельскай вобласці. Закончыў Гомельскі дарожнабудаўнічы тэхнікум; Беларускі політэхнічны інстытут, інжынер-будаўнік.

Працаваў тэхнікам, майстрам, прарабам, старшым інжынерам па тэхнічнаму нагляду, намеснікам дырэктара, дырэктарам завода жалезабетонных маставых канструкцый у гарадскім пасёлку Фаніпаль Дзяржынскага раёна Мінскай вобласці, кіраўніком дзяржаўнага прадпрыемства «Дартрэстбудіндустрыя», генеральным дырэктарам рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства «Дарбудіндустрыя».

Узнагароджаны ордэнам Пашаны, юбілейным медалём «90 год Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, знакам «Ганаровы дарожнік» I і II ступені.



## СЯМАШКА
## Сяргей Аляксандравіч

**Член Пастаяннай камісіі па прамысловасці, паліўна-энергетычнаму комплексу, транспарту, сувязі і прадпрымальніцтву**

*Віцебская-Чыгуначная выбарчая акруга № 18*

Нарадзіўся 12 кастрычніка 1960 года ў вёсцы Коцькі Дзятлаўскага раёна Гродзенскай вобласці. Закончыў Ленінградскі інстытут інжынераў чыгуначнага транспарту, інжынер шляхоў зносін – будаўнік; Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, менеджэр інфармацыйных сістэм.

Працаваў дарожным майстрам, галоўным інжынерам дыстанцыі пуці, начальнікам пуцявой машыннай станцыі № 94 Прыбалтыйскай чыгункі, галоўным інжынерам пуцявой машыннай станцыі № 118 Беларускай чыгункі, намеснікам начальніка дыстанцыі пуці па кадрах і быту Віцебскай дыстанцыі пуці Беларускай чыгункі.

Выбіраўся дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь другога склікання.

Узнагароджаны медалямі «За працоўныя заслугі», «90 год Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



## ТАЛКАЧОЎ
## Іван Іванавіч

**Член Пастаяннай камісіі па працы, сацыяльнай абароне, справах ветэранаў і інвалідаў**

*Гомельская-Юбілейная выбарчая акруга № 33*

Нарадзіўся 1 ліпеня 1953 года ў сяле Старая Гута Унецкага раёна Бранскай вобласці РСФСР. Закончыў Гомельскі дзяржаўны універсітэт, выкладчык гісторыі; Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, менеджэр-эканаміст.

Працоўную дзейнасць пачаў токарам на заводзе «Тэмбр» у горадзе Унеча Бранскай вобласці. Пасля службы ў радах Узброеных Сіл працаваў прасаўшчыком на вытворчым аб'яднанні «Гомсельмаш», настаўнікам гісторыі Старагутнянскай сярэдняй школы Бранскай вобласці, Падарэскай сярэдняй школы Мінскай вобласці, Зябраўскай сярэдняй школы Гомельскай вобласці, сярэдняй школы № 8 горада Гомеля. Быў намеснікам дырэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце ГПТВ № 6 горада Гомеля, дырэктарам сярэдняй школы № 25 горада Гомеля. Займаў пасады загадчыка аддзела адукацыі, намесніка кіраўніка адміністрацыі Чыгуначнага раёна горада Гомеля.

Узнагароджаны юбілейнымі медалямі «300 год Расійскаму флоту», «90 год Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, знакам «Выдатнік адукацыі».



# УНУЧКА
# Раман Іосіфавіч

**Старшыня Пастаяннай камісіі па грашова-крэдытнай палітыцы і банкаўскай дзейнасці**

*Лепельская выбарчая акруга № 23*

Нарадзіўся 13 мая 1944 года ў вёсцы Буйвічы Шчучынскага раёна Гродзенскай вобласці. Закончыў Гродзенскі сельскагаспадарчы інстытут, вучоны аграном; Мінскую вышэйшую партыйную школу. Кандыдат эканамічных навук.

Працоўную дзейнасць пачаў аўтаслесарам Шчучынскай аўтабазы № 12 Гродзенскай вобласці. Пасля службы ў радах Узброеных Сіл працаваў старшынёй выканкама Лядскага сельскага Савета дэпутатаў працоўных, старшынёй калгаса імя Дзяржынскага Шчучынскага раёна, намеснікам старшыні выканкама Шчучынскага раённага Савета народных дэпутатаў, старшынёй выканкама Смаргонскага раённага Савета народных дэпутатаў, першым сакратаром Навагрудскага гаркама КПБ. З'яўляўся старшынёй Праўлення Беларускага інвестыцыйнага банка АТ. Працаваў дацэнтам кафедры фінансаў і крэдыту вышэйшай школы кіравання і бізнесу Беларускага дзяржаўнага эканамічнага універсітэта, памочнікам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь – галоўным інспектарам па Віцебскай вобласці. Займаў пасаду намесніка Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь. Быў старшынёй наглядальнага савета адкрытага акцыянернага таварыства «Белаграпрамбанк».

Выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь дванаццатага склікання – старшынёй Пастаяннай планавай і бюджэтна-фінансавай камісіі, членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь другога склікання.

Узнагароджаны юбілейнымі медалямі «За доблесную працу. У азнаменаванне 100-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна», «Дваццаць гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941 – 1945 гг.», «90 год Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь», ганаровымі граматамі.







# ФЕДАРУК
# Ніна Фёдараўна

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, справах сям'і і моладзі**

*Мухавецкая выбарчая акруга № 13*

Нарадзілася 25 ліпеня 1951 года ў вёсцы Воля Камянецкага раёна Брэсцкай вобласці. Закончыла Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі інстытут па спецыяльнасці лячэбная справа. Заслужаны работнік аховы здароўя Рэспублікі Беларусь.

Працоўную дзейнасць пачала медсястрой Пялішчанскага ўрачэбнага ўчастка Камянецкага раёна Брэсцкай вобласці. Працавала ўрачом-інтэрнам Брэсцкай абласной бальніцы, участковым урачом-тэрапеўтам, загадчыкам тэрапеўтычнага аддзялення Мікашэвіцкай бальніцы Лунінецкага раёна, галоўным урачом Дамачаўскай гарадской пасялковай бальніцы Брэсцкага раёна. Займала пасаду галоўнага ўрача Брэсцкага раённага тэрытарыяльна-медыцынскага аб'яднання.

Мае Падзяку Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Узнагароджана юбілейным медалём «90 год Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, знакам «Выдатнік аховы здароўя Рэспублікі Беларусь».



# ХРОЛ
# Васіль Пятровіч

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па бюджэту, фінансах і падатковай палітыцы**

*Глыбоцкая выбарчая акруга № 22*

Нарадзіўся 12 студзеня 1957 года ў вёсцы Малыя Грыдзюшкі Шаркаўшчынскага раёна Віцебскай вобласці. Закончыў Мінскі радыётэхнічны інстытут, інжынер-канструктар – тэхнолаг ЭВА; Беларускі дзяржаўны універсітэт, юрыст; Расійскую акадэмію дзяржаўнай службы пры Прэзідэнце Расійскай Федэрацыі, менеджэр-эканаміст.

Працоўную дзейнасць пачаў інжынерам-электронікам на Мінскім механічным заводзе імя Вавілава. Служыў у радах Узброеных Сіл. Працаваў рэгуліроўшчыкам электра- і радыёвымяральнай апаратуры, намеснікам начальніка цэха Мінскага механічнага завода імя Вавілава, выканаўчым дырэктарам Беларускага рэспубліканскага цэнтра гандлю нерухомасцю, прэзідэнтам Беларускай асацыяцыі «Нерухомасць».

Выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь трынаццатага склікання – сакратаром Пастаяннай камісіі па прамысловасці, транспарту, будаўніцтву, энергетыцы, гандлю і іншых паслугах насельніцтву, сувязі і інфарматыцы. З'яўляўся дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь першага склікання – намеснікам старшыні Пастаяннай камісіі па пытаннях эканомікі, другога склікання – старшынёй Пастаяннай камісіі па жыллёвай палітыцы, будаўніцтву, гандлю і прыватызацыі.

Намеснік Дзяржаўнага сакратара – член Пастаяннага Камітэта Саюзнай дзяржавы.

Узнагароджаны юбілейным медалём «90 год Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі.







# ХУДАЯ
# Марыя Мікалаеўна

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па праблемах чарнобыльскай катастрофы, экалогіі і прыродакарыстанню**

*Нясвіжская выбарчая акруга № 87*

Нарадзілася 9 студзеня 1940 года ў вёсцы Сякерычы Клецкага раёна Мінскай вобласці. Закончыла Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію, бухгалтар-эканаміст; Маскоўскую сельскагаспадарчую акадэмію імя К.А.Ціміразева, выкладчык сельгастэхнікумаў; Мінскую вышэйшую партыйную школу, палітолаг.

Працавала галоўным бухгалтарам, галоўным эканамістам, намеснікам старшыні калгаса «Ленінскі шлях», старшынёй калгаса «1 Мая» Нясвіжскага раёна Мінскай вобласці, начальнікам упраўлення сельскай гаспадаркі Нясвіжскага раёна, старшынёй Нясвіжскага райвыканкама, першым сакратаром Нясвіжскага райкама КПБ, старшынёй Мінскага абласнога камітэта па экалогіі.

Выбіралася дэпутатам Вярхоўнага Савета Беларускай ССР восьмага склікання, дэпутатам Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь трынаццатага склікання – старшынёй Пастаяннай камісіі па экалогіі і прыродакарыстанню. З'яўлялася дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь першага і другога скліканняў – намеснікам старшыні Пастаяннай камісіі па праблемах чарнобыльскай катастрофы, экалогіі і прыродакарыстанню, была старшынёй Камісіі Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі па пытаннях экалогіі, прыродакарыстанню і ліквідацыі вынікаў аварыі.

Старшыня Беларускага аддзялення грамадскага аб'яднання «Міжнародны жаночы саюз «Адзінства». Намеснік старшыні праўлення грамадскага аб'яднання «Беларускі фонд міру».

Узнагароджана ордэнамі Кастрычніцкай Рэвалюцыі, Працоўнага Чырвонага Сцяга, Дружбы народаў, «Знак Пашаны», сямю медалямі, ганаровымі граматамі.



## ЦІХАНСКАЯ
## Раіса Аляксандраўна

**Член Пастаяннай камісіі па дзяржаўнаму будаўніцтву, мясцоваму самакіраванню і рэгламенту, член Савета Палаты прадстаўнікоў**

*Калінкавіцкая выбарчая акруга № 43*

Нарадзілася 2 студзеня 1951 года ў вёсцы Малоткавічы Жабчыцкага раёна Пінскай вобласці. Закончыла Гомельскі дзяржаўны універсітэт, выкладчык біялогіі і хіміі.

Працоўную дзейнасць пачала вучаніцай лабаранта Сызранскага хлебазавода. Працавала швачкай на гомельскай фабрыцы «8 Сакавіка», інструктарам Савецкага райкама камсамола горада Гомеля, намеснікам сакратара камітэта камсамола Гомельскага радыёзавода, інструктарам Савецкага райвыканкама горада Гомеля, загадчыкам арганізацыйна-інструктарскага аддзела Гомельскага гарвыканкама, інструктарам арганізацыйнага аддзела Цэнтральнага райкама КПБ горада Гомеля. Была намеснікам загадчыка аддзела арганізацыйнай і кадравай работы Гомельскага абласнога Савета народных дэпутатаў, намеснікам начальніка ўпраўлення, начальнікам упраўлення арганізацыйна-кадравай работы Гомельскага аблвыканкама. Займала пасаду намесніка старшыні Гомельскага аблвыканкама.

Мае Падзяку Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Узнагароджана Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.







## ЧУРСІН
## Мікалай Усцімавіч

**Старшыня Пастаяннай камісіі па жыллёвай палітыцы, будаўніцтву, гандлю і прыватызацыі**

*Маладзечанская гарадская выбарчая акруга № 85*

Нарадзіўся 1 студзеня 1947 года ў пасёлку Прыморскі Чэлябінскай вобласці РСФСР. Закончыў Магнітагорскі горна-металургічны інстытут, інжынер-будаўнік.

Працоўную дзейнасць пачаў прасаўшчыком завода металаканструкцый у горадзе Магнітагорску. Пасля службы ў радах Узброеных Сіл працаваў майстрам, старшым майстрам, начальнікам цэха, начальнікам вытворчага аддзела, галоўным інжынерам завода металаканструкцый у горадзе Магнітагорску. З'яўляўся дырэктарам завода трубчастых будаўнічых канструкцый, другім сакратаром гаркама КПСС горада Перваўральска. Быў намеснікам дырэктара па вытворчасці, галоўным інжынерам, дырэктарам завода лёгкіх металаканструкцый у горадзе Маладзечна. Займаў пасаду старшыні Маладзечанскага гарвыканкама.

Узнагароджаны юбілейным медалём «90 год Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Міжпарламенцкай Асамблеі Еўразійскага эканамічнага супольніцтва.



# ШАЎКО
# Аляксандр Аляксандравіч

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па прамысловасці, паліўна-энергетычнаму комплексу, транспарту, сувязі і прадпрымальніцтву**

*Гомельская-Цэнтральная выбарчая акруга № 35*

Нарадзіўся 15 чэрвеня 1950 года ў вёсцы Бяседкі Петрыкаўскага раёна Гомельскай вобласці. Закончыў Магілёўскі машынабудаўнічы інстытут, інжынер-механік. Заслужаны работнік прамысловасці Рэспублікі Беларусь.

Працаваў майстрам, начальнікам цэха, галоўным тэхнолагам Гомельскага станкабудаўнічага завода імя С.М.Кірава, намеснікам генеральнага дырэктара па вытворчасці, галоўным інжынерам Гомельскага станкабудаўнічага вытворчага аб’яднання імя С.М.Кірава. Займаў пасаду генеральнага дырэктара рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства «Гомельскі станкабудаўнічы завод імя С.М.Кірава».

Узнагароджаны юбілейным медалём «90 год Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Міжпарламенцкай Асамблеі Еўразійскага эканамічнага супольніцтва.







# ШАЦЬКО
# Аляксандр Віктаравіч

**Член Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічнаму прагрэсу**

*Гомельская-Навабеліцкая выбарчая акруга № 38*

Нарадзіўся 3 верасня 1963 года ў горадзе Магдэбургу (Германская Дэмакратычная Рэспубліка). Закончыў Гомельскі дзяржаўны універсітэт, выкладчык матэматыкі.

Працоўную дзейнасць пачаў інжынерам Гомельскага канструктарскага бюро сістэмнага праграміравання. Пасля службы ў радах Узброеных Сіл працаваў настаўнікам, намеснікам дырэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце сярэдніх школ № 19 і № 56 горада Гомеля, дырэктарам Гомельскай Ірынінскай гімназіі.

Узнагароджаны медалямі «За адзнаку ў воінскай службе», «70 гадоў Узброеных Сіл СССР», «90 год Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Савета Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў – удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў.



## ШЛОПАК
## Сяргей Юльянавіч

**Член Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі**

*Магілёўская-Прамысловая выбарчая акруга № 74*

Нарадзіўся 17 лютага 1952 года ў горадзе Полацку Віцебскай вобласці. Закончыў Наваполацкі політэхнічны інстытут, інжынер-будаўнік.

Пасля службы ў радах Узброеных Сіл працаваў майстрам, старшым прарабам, галоўным інжынерам, старшынёй аб’яднанага прафкама, сакратаром парткама, намеснікам кіраўніка трэста № 17 «Лаўсанбуд». Займаў пасаду старшыні выканкама Кастрычніцкага раённага Савета дэпутатаў горада Магілёва. Быў кіраўніком адміністрацыі Кастрычніцкага раёна горада Магілёва, намеснікам генеральнага дырэктара па капітальнаму будаўніцтву адкрытага акцыянернага таварыства «Магілёўхімвалакно».

Узнагароджаны юбілейным медалём «90 год Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.







## ШМІГІРА
## Часлаў Фаміч

**Член Пастаяннай камісіі па аграрных пытаннях**

*Слонімская выбарчая акруга № 60*

Нарадзіўся 2 студзеня 1949 года ў вёсцы Смаліха Шчучынскага раёна Гродзенскай вобласці. Закончыў Гродзенскі сельскагаспадарчы інстытут, вучоны заатэхнік.

Працоўную дзейнасць пачаў вучнем слесара Іўеўскага раённага аб’яднання «Сельгастэхніка» Гродзенскай вобласці. Пасля службы ў радах Узброеных Сіл працаваў ветсанітарам, загадчыкам жывёлагадоўчай фермы саўгаса «Навадворскі» Шчучынскага раёна Гродзенскай вобласці. Быў загадчыкам фермы саўгаса «Слонімскі», намеснікам старшыні калгаса «Перамога». Займаў пасаду старшыні сельскагаспадарчага вытворчага кааператыва імя Ф.Э.Дзяржынскага Слонімскага раёна Гродзенскай вобласці.

Узнагароджаны медалямі «За працоўную доблесць», «90 год Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



# ШОКАЎ
# Уладзімір Ільіч

**Член Пастаяннай камісіі па працы, сацыяльнай абароне, справах ветэранаў і інвалідаў**

*Старавіленская выбарчая акруга № 105*

Нарадзіўся 14 красавіка 1949 года ў горадзе Куйбышаве РСФСР. Закончыў Данецкае вышэйшае ваенна-палітычнае вучылішча па спецыяльнасці ваенна-палітычная інжынерных войскаў; Ваенна-палітычную акадэмію імя У.І.Леніна па спецыяльнасці ваенна-палітычная сухапутных войскаў. Палкоўнік запасу.

Пасля службы ў радах Узброеных Сіл працаваў начальнікам курса факультэта, намеснікам начальніка факультэта па палітычнай частцы, памочнікам начальніка факультэта па рабоце з асабовым складам Мінскага вышэйшага ваенна-палітычнага агульна-вайсковага вучылішча. Быў намеснікам начальніка факультэта па выхаваўчай рабоце, начальнікам кафедры Мінскага вышэйшага ваеннага каманднага вучылішча, менеджэрам таварыства з абмежаванай адказнасцю «Са-НОВ», начальнікам камерцыйнага аддзела фірмы «R-RAY», менеджэрам таварыства з абмежаванай адказнасцю «Белыя куранты». З'яўляўся намеснікам сустаршыні Беларускага саюза ветэранаў вайны ў Афганістане, старшынёй Мінскай асацыяцыі ветэранаў вайны ў Афганістане «Памяць».

Намеснік старшыні Беларускага саюза ветэранаў вайны ў Афганістане, старшыня Мінскай гарадской арганізацыі ветэранаў вайны ў Афганістане «Памяць». Член ЦК Кампартыі Беларусі, сакратар Мінскага гаркама КПБ. Член Геральдычнага Савета пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.

Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, «За службу Радзіме ва Узброеных Сілах СССР» III ступені, «Звезда» III ступені (Дэмакратычная Рэспубліка Афганістан), дваццаццю дзевяццю медалямі, Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



# ЮРГЕЛЕВІЧ
# Галіна Мікалаеўна

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічнаму прагрэсу**

*Шабаноўская выбарчая акруга № 93*

Нарадзілася 30 красавіка 1954 года ў вёсцы Валяр'янава Мінскага раёна Мінскай вобласці. Закончыла Беларускі дзяржаўны універсітэт, географ.

Працоўную дзейнасць пачала механазборшчыкам Мінскага гадзіннікавага завода. Працавала старшым тэхнікам інстытута «БелНДІпалівапраект», старшай піянерважатай Бараўлянскай сярэдняй школы Мінскага раёна, інжынерам інстытута «Сельгастэхпраект» у горадзе Мінску, настаўнікам Бараўлянскай сярэдняй школы Мінскага раёна і сярэдняй школы № 162 горада Мінска, інструктарам аддзела прапаганды Заводскага райкама КПБ горада Мінска, дырэктарам сярэдніх школ № 43 і № 162. Займала пасаду начальніка ўпраўлення адукацыі адміністрацыі Заводскага раёна горада Мінска.

Узнагароджана Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



## ЮШКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч

**Член Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі**

*Крычаўская выбарчая акруга № 70*

Нарадзіўся 12 мая 1972 года ў горадзе Магілёве. Закончыў Магілёўскі тэхналагічны інстытут па спецыяльнасці аўтаматызацыя тэхналагічных працэсаў і вытворчасцей; Беларускі інстытут правазнаўства па спецыяльнасці юрыст-прававед.

Працаваў другім і першым сакратаром Магілёўскага абласнога камітэта грамадскага аб’яднання «Беларускі патрыятычны саюз моладзі», першым сакратаром Магілёўскага абласнога камітэта грамадскага аб’яднання «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі», выканаўчым дырэктарам філіяла № 700 Магілёўскага абласнога ўпраўлення адкрытага акцыянернага таварыства «Ашчадны банк «Беларусбанк».

Старшыня рэспубліканскага саюза грамадскіх аб’яднанняў «Беларускі камітэт маладзёжных арганізацый».

Мае Падзяку Дзяржаўнага сакратара Саюзнай дзяржавы.



## ЯНУКОВІЧ Ванда Фердзінантаўна

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па грашова-крэдытнай палітыцы і банкаўскай дзейнасці, член Савета Палаты прадстаўнікоў**

*Пастаўская выбарчая акруга № 30*

Нарадзілася 21 чэрвеня 1948 года ў вёсцы Пятровічы Пастаўскага раёна Віцебскай вобласці. Закончыла Беларускі дзяржаўны інстытут народнай гаспадаркі імя В.У.Куйбышава, эканаміст.

Працавала намеснікам галоўнага бухгалтара, эканамістам, намеснікам старшыні калгаса «Чырвоны сцяг» Пастаўскага раёна Віцебскай вобласці, старшынёй выканкама Воцкавіцкага сельскага Савета дэпутатаў Пастаўскага раёна. Была старшынёй раённай планавай камісіі выканкама Пастаўскага раённага Савета народных дэпутатаў. Займала пасады намесніка старшыні, першага намесніка старшыні, старшыні Пастаўскага райвыканкама.

Мае Падзяку Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Узнагароджана ордэнам Пашаны, Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.




# ЧЛЕНЫ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ

## Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь трэцяга склікання

*Біяграфічныя даведкі*



## АБЛАУХАВА
## Святлана Аляксандраўна

**Член Пастаяннай камісіі па дэмаграфічнай бяспецы і сацыяльнаму развіццю**

*Выбрана ад Брэсцкай вобласці*

Нарадзілася 16 жніўня 1962 года ў пасёлку Балбасава Аршанскага раёна Віцебскай вобласці. Скончыла Смаленскі дзяржаўны медыцынскі інстытут, урач-стаматолаг.

Працоўную дзейнасць пачала камплектоўшчыцай на Аршанскім заводзе «Чырвоны Кастрычнік». Пасля заканчэння вучобы працавала ўрачом-стаматолагам стаматалагічнага аддзялення, загадчыкам хірургічнага кабінета 61-й стаматалагічнай паліклінікі гарнізона Мілавіцы Цэнтральнай групы войскаў (ЧССР), урачом-стаматолагам першага тэрапеўтычнага аддзялення Брэсцкай абласной стаматалагічнай паліклінікі.

Намеснік галоўнага ўрача ўстановы аховы здароўя «Брэсцкая абласная стаматалагічная паліклініка».

Узнагароджана юбілейным медалём «90 год Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, нагрудным знакам Міністэрства аховы здароўя «Выдатнік аховы здароўя Рэспублікі Беларусь».







## АБРАМОВІЧ
## Аляксандр Міхайлавіч

**Намеснік Старшыні Савета Рэспублікі**

*Выбраны ад Гродзенскай вобласці*

Нарадзіўся 10 красавіка 1944 года ў вёсцы Забалоцце Нясвіжскага раёна Мінскай вобласці. Скончыў Беларускі дзяржаўны універсітэт, юрыст; аспірантуру Інстытута філасофіі і права Акадэміі навук БССР, доктар юрыдычных навук, прафесар. Заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь. Аўтар звыш 100 навуковых прац, у тым ліку 5 кніг.

Працаваў аграномам калгасаў «Улада Саветаў» і «Іскра» Лідскага раёна Гродзенскай вобласці, інструктарам Лідскага райвыканкама, пасля заканчэння аспірантуры – навуковым супрацоўнікам, выконваючым абавязкі загадчыка аддзела Інстытута філасофіі і права Акадэміі навук БССР, членам Камітэта Канстытуцыйнага нагляду СССР, Старшынёй Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенню рэспубліканскіх рэферэндумаў, Намеснікам Кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. З 1998 года па цяперашні час загадчык кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права юрыдычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

Член Камісіі Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі па заканадаўству і Рэгламенту.

Член расійска-беларускай камісіі па падрыхтоўцы праекта Канстытуцыйнага Акта Саюзнай дзяржавы.

Мае Падзяку Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Узнагароджаны ордэнам Пашаны, юбілейным медалём «90 год Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі, Ганаровай граматай Эканамічнага Суда Садружнасці Незалежных Дзяржаў, Ганаровай граматай Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.



# АВІН
# Іван Іванавіч

**Член Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы**

*Назначаны Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь*

Нарадзіўся 17 красавіка 1942 года ў вёсцы Свілелі Пастаўскага раёна Віцебскай вобласці.

Закончыў Беларускі інстытут механізацыі сельскай гаспадаркі, інжынер-механік; Мінскую вышэйшую партыйную школу.

Пасля заканчэння тэхнікума працаваў механікам і загадчыкам гаража саўгаса «Шаркаўшчынскі», старшым інжынерам Дзяржтэхнагляду раённага аб'яднання «Сельгастэхніка», начальнікам лінейнага будаўніча-мантажнага ўчастка раённага аб'яднання «Сельгастэхніка», кіраўніком Асінаўскага аддзялення аб'яднання «Сельгастэхніка». Быў выбраны другім сакратаром Міёрскага райкама КПБ, першым сакратаром Лёзненскага райкама КПБ, сакратаром Камісіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь па пытаннях архітэктуры, будаўніцтва, вытворчасці будаўнічых матэрыялаў і жыллёва-камунальнай гаспадаркі вёскі і горада. Працаваў намеснікам, першым намеснікам Старшыні Дзяржаўнага мытнага камітэта Рэспублікі Беларусь.

Саветнік генеральнага дырэктара Беларускага рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства экспартна-імпартнага страхавання «Белэксімгарант».

Выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь дванаццатага склікання.

Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, чатырма медалямі, Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.







# АКРУЖНАЯ
# Святлана Арцёмаўна

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і гуманітарных пытаннях**

*Выбрана ад Віцебскай вобласці*

Нарадзілася 26 студзеня 1947 года ў горадзе Чарнаўцы Украінскай ССР. Закончыла Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут, актрыса драматычнага тэатра і кіно. Народная артыстка Беларусі. Заслужаная артыстка БССР. Лаўрэат міжнародных тэатральных фестываляў (г. Бранск, 1990), «Белая вежа» (г. Брэст, 2004), Міжнароднага фестывалю «Славянскія тэатральныя сустрэчы» (г. Гомель, 2003). Узнагароджана галоўным прызам «Крыштальная Паўлінка» Беларускага саюза тэатральных дзеячаў. Прызнана жанчынай года (г. Кембрыдж, Англія, 1997 – 1998). Член Саюза тэатральных дзеячаў Беларусі, член рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз кінематаграфістаў». Аўтар біяграфічнай кнігі «Все прожить – и чтобы сердце не разбилось». Яе імя ўключана ў міжнародныя біяграфічныя даведнікі «Хто ёсць хто. Дзелавы свет СНД» (2002 – 2004), «Хто ёсць хто» Амерыканскага біяграфічнага інстытута (2004) і зборнік «Жанчыны Беларусі» (2004).

Актрыса дзяржаўнай установы «Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Я.Коласа» ў г. Віцебску.

Выбіралася членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь другога склікання.

Намеснік кіраўніка дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у Міжпарламенцкай Асамблеі праваслаўя, старшыня Камісіі МАП па культуры.

Мае Падзяку Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Узнагароджана ордэнам і медалём Францыска Скарыны, Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Камітэта па справах рэлігій і нацыянальнасцей пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь, Ганаровай Міжнароднай Прэміяй міру Аб'яднанай Культурнай Канвенцыі пры Амерыканскім біяграфічным інстытуце. Прысуджана прэмія Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне» 2005 года, прэмія імя Героя Савецкага Саюза Тусналобавай-Марчанка «За мацярынскую мужнасць».



## АНДРЭЙЧАНКА
## Уладзімір Паўлавіч

**Член Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэту і фінансах**

*Выбраны ад Віцебскай вобласці*

Нарадзіўся 2 студзеня 1949 года ў вёсцы Мар'янава Лёзненскага раёна Віцебскай вобласці. Закончыў Велікалуцкі сельскагаспадарчы інстытут, вучоны-аграном; Мінскую вышэйшую партыйную школу, палітолаг. Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь.

Пасля заканчэння Лужаснянскага саўгаса-тэхнікума служыў у радах Савецкай Арміі. Працаваў аграномам калгаса «Перамога сацыялізму» Верхнядзвінскага раёна, старшым аграномам Зубкаўскага спецаддзялення Лёзненскай райсельгастэхнікі, інструктарам, загадчыкам арганізацыйнага аддзела Лёзненскага райкама ЛКСМБ, інструктарам Лёзненскага райкама Кампартыі Беларусі, сакратаром парткама саўгаса «Адаменкі», старшынёй калгаса імя Данукалава, начальнікам упраўлення сельскай гаспадаркі, старшынёй Лёзненскага райвыканкама, першым сакратаром Верхнядзвінскага райкама Кампартыі Беларусі, першым намеснікам, старшынёй камітэта па сельскай гаспадарцы і забеспячэнню насельніцтва харчаваннем – намеснікам старшыні Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта.

Выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь дванаццатага склікання, членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь першага і другога скліканняў.

Старшыня Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта.

Мае дзве падзякі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Узнагароджаны ордэнам Айчыны III ступені, трыма юбілейнымі медалямі, Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР, Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, ордэнам Беларускай Праваслаўнай Царквы Крыжа прападобнай Ефрасінні, ігуменні Полацкай.







## АНДРЭЙЧЫК
## Наталля Іосіфаўна

**Старшыня Пастаяннай камісіі па заканадаўству і дзяржаўнаму будаўніцтву**

*Выбрана ад горада Мінска*

Нарадзілася 5 снежня 1945 года ў горадзе Мінску. Закончыла Беларускі дзяржаўны універсітэт, юрыст. Заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь.

Працавала стажорам, адвакатам Мінскай абласной калегіі адвакатаў, адвакатам юрыдычнай кансультацыі Кастрычніцкага раёна Мінскай гарадской калегіі адвакатаў, загадчыкам юрыдычнай кансультацыі Партызанскага раёна горада Мінска. Выбіралася прэзідэнтам Саюза адвакатаў Беларусі.

Выбіралася членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь другога склікання – старшынёй Пастаяннай камісіі па заканадаўству і дзяржаўнаму будаўніцтву.

Старшыня Рэспубліканскай калегіі адвакатаў.

Намеснік старшыні Камісіі па пытаннях памілавання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.

Намеснік старшыні Камісіі Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі па заканадаўству і Рэгламенту.

Член расійска-беларускай камісіі па падрыхтоўцы праекта Канстытуцыйнага Акта Саюзнай дзяржавы.

Намеснік кіраўнікоў дэлегацый Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у Парламенцкай Асамблеі Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе і па ажыццяўленню кантактаў з Парламенцкай Асамблеяй Савета Еўропы.

Узнагароджана трыма юбілейнымі медалямі, Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



# АСІПЕНКА Васілій Сямёнавіч

**Член Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцоваму самакіраванню**

*Выбраны ад Віцебскай вобласці*

Нарадзіўся 15 студзеня 1947 года ў вёсцы Алісаўка Краснагорскага раёна Бранскай вобласці РСФСР. Закончыў Курскі сельскагаспадарчы інстытут, інжынер-механік. Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь.

Працоўную дзейнасць пачаў рабочым Гардзееўскага камбіната будаўнічых матэрыялаў Бранскай вобласці. Пасля заканчэння вучобы працаваў інжынерам па ахове працы і тэхніцы бяспекі Краснагорскага раённага вытворчага ўпраўлення сельскай гаспадаркі Бранскай вобласці. Пасля службы ў радах Савецкай Арміі быў галоўным інжынерам-механікам калгаса «Зара камунізму» Краснагорскага раёна, кіраўніком Краснагорскага міжкалгаснага аб'яднання па арашэнню, галоўным інжынерам Краснагорскага транспартнага прадпрыемства «Транссельгастэхніка», галоўным інжынерам Краснагорскага раённага аб'яднання «Сельгастэхніка», старшынёй Краснагорскага раённага вытворчага аб'яднання па аграхімічнаму абслугоўванню сельскай гаспадаркі Бранскай вобласці. Працаваў старшым інжынерам па тэхналагічнаму абсталяванню, начальнікам комплекса – намеснікам дырэктара, намеснікам дырэктара саўгаса «Гарадоцкі» Гарадоцкага раёна, дырэктарам Гарадоцкага камбіната кааператыўнай прамысловасці, дырэктарам саўгаса «Гарадоцкі», дырэктарам саўгаса-камбіната «Паўночны» Гарадоцкага раёна Віцебскай вобласці.

Дырэктар камунальнага унітарнага сельскагаспадарчага прадпрыемства «Паўночны» Гарадоцкага раёна.

Узнагароджаны юбілейным медалём «90 год Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.







# БАРАНАВА Наталля Пятроўна

**Член Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы**

*Выбрана ад горада Мінска*

Нарадзілася 23 чэрвеня 1950 года ў горадзе Навазыбкаў Бранскай вобласці РСФСР. Закончыла Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут замежных моў і аспірантуру гэтага інстытута, настаўнік англійскай і нямецкай моў, кандыдат педагагічных навук. Аўтар звыш 40 навуковых прац.

Працоўную дзейнасць пачала малодшым прадаўцом магазіна № 50 Лідскага гархарчпрамгандлю. Пасля заканчэння вучобы працавала перакладчыкам Хелуанскага металургічнага камбіната (г. Каір, Арабская Рэспубліка Егіпет). Выбіралася намеснікам сакратара камітэта камсамола па ідэалагічнай рабоце Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута замежных моў, працавала выкладчыкам, вучылася ў аспірантуры, затым была старшым выкладчыкам, загадчыкам кафедры педагогікі Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута замежных моў (Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага універсітэта), прарэктарам па вучэбнай рабоце Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага універсітэта.

Рэктар установы адукацыі «Мінскі дзяржаўны лінгвістычны універсітэт».

Член дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па ажыццяўленню кантактаў з Парламенцкай Асамблеяй НАТО, уваходзіць у склад Каардынацыйнага камітэта Нарады жанчын-парламентарыяў (МПС). Прысвоена ганаровае званне «Мінчанін года – 2007».

Узнагароджана Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.



## БАТУРА Барыс Васільевіч

**Член Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэту і фінансах**

*Выбраны ад Магілёўскай вобласці*

Нарадзіўся 28 ліпеня 1947 года ў горадзе Ваўкавыску Гродзенскай вобласці. Закончыў Беларускі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга політэхнічны інстытут, інжынер-тэхнолаг. Заслужаны работнік сферы абслугоўвання Рэспублікі Беларусь.

Працаваў майстрам цэха, інжынерам-тэхнолагам, выконваючым абавязкі начальніка аддзела тэхнічнага кантролю ўстановы УЖ-15/11 Гродзенскага аблвыканкама, начальнікам Ваўкавыскага камбіната камунальных прадпрыемстваў, намеснікам начальніка, начальнікам аддзела механікі і энергетыкі ўпраўлення жыллёва-камунальнай гаспадаркі Гродзенскага аблвыканкама, намеснікам начальніка, першым намеснікам начальніка, начальнікам вытворчага ўпраўлення жыллёва-камунальнай гаспадаркі пры Гродзенскім аблвыканкаме. Быў намеснікам Міністра жыллёва-камунальнай гаспадаркі Беларускай ССР, намеснікам старшыні Гродзенскага аблвыканкама, Міністрам жыллёва-камунальнай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь, намеснікам Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь.

Назначаўся Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь другога склікання.

Старшыня Магілёўскага абласнога выканаўчага камітэта.

Узнагароджаны ордэнамі «Знак Пашаны», Айчыны III ступені, Айчыны II ступені, юбілейным медалём «90 год Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, ордэнам свяціцеля Кірылы Тураўскага.



## БАШМЕТАЎ Валерый Сцяпанавіч

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па заканадаўству і дзяржаўнаму будаўніцтву**

*Выбраны ад Віцебскай вобласці*

Нарадзіўся 8 красавіка 1947 года ў вёсцы Канец Суражскага раёна Віцебскай вобласці. Закончыў Віцебскі тэхналагічны інстытут лёгкай прамысловасці, інжынер; аспірантуру Маскоўскага тэкстыльнага інстытута, доктар тэхнічных навук, прафесар. Заслужаны работнік адукацыі Рэспублікі Беларусь. Аўтар 114 навуковых прац, 28 вынаходстваў.

Працаваў наладчыкам швейных машын фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі», механікам ГПТВ-19, старшым лабарантам, вучэбным майстрам Віцебскага тэхналагічнага інстытута лёгкай прамысловасці. Пасля заканчэння аспірантуры працаваў асістэнтам, старшым выкладчыкам, дацэнтам кафедры «Механічная тэхналогія валакністых матэрыялаў», намеснікам дэкана, дэканам эканоміка-тэхналагічнага факультэта Віцебскага тэхналагічнага інстытута лёгкай прамысловасці, загадчыкам кафедры ткацтва Віцебскага тэхналагічнага інстытута лёгкай прамысловасці (Віцебскага дзяржаўнага тэхналагічнага універсітэта).

Рэктар установы адукацыі «Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны універсітэт».

Член Пастаяннай камісіі Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў – удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў па навуцы і адукацыі.

Узнагароджаны медалём «За працоўныя заслугі», юбілейным медалём «90 год Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Савета Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў – удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў.



# БЛАХІНА
# Наталля Віктараўна

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцоваму самакіраванню**

*Выбрана ад Мінскай вобласці*

Нарадзілася 5 ліпеня 1960 года ў вёсцы Балотчыцы Слуцкага раёна Мінскай вобласці. Закончыла Беларускі дзяржаўны інстытут народнай гаспадаркі імя В.У.Куйбышава, таваразнавец; Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь па спецыяльнасці «дзяржаўнае і мясцовае кіраванне».

Працавала таваразнаўцам, дырэктарам магазіна № 6 Слуцкага гархарчпрамгандлю, дырэктарам універмага «Слуцк».

Выбіралася членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь другога склікання.

Дырэктар камунальнага гандлёва-вытворчага унітарнага прадпрыемства «Універмаг «Слуцк».

Член грамадскага аб’яднання «Беларускі саюз жанчын».

Мае Падзяку Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Узнагароджана Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, дзвюма ганаровымі граматамі Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, знакам «Выдатнік гандлю СССР» і нагрудным знакам «Выдатнік гандлю БССР».







# БЯРЭЗІНА
# Зінаіда Мікалаеўна

**Член Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэту і фінансах**

*Выбрана ад Брэсцкай вобласці*

Нарадзілася 21 мая 1950 года ў вёсцы Марозавічы Пінскага раёна Брэсцкай вобласці. Закончыла Ленінградскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга інстытут воднага транспарту, інжынер-эканаміст.

Пасля заканчэння Пінскага ўлікова-крэдытнага тэхнікума працавала бухгалтарам, старшым бухгалтарам Клецкага аддзялення Дзяржаўнага банка БССР, бухгалтарам Пінскага будаўніча-мантажнага ўпраўлення, бухгалтарам, старшым бухгалтарам, старшым інспектарам апошняга кантролю, крэдытным інспектарам, эканамістам аддзела фінансавання капіталаўкладанняў Пінскага аддзялення Дзяржаўнага банка БССР, намеснікам галоўнага бухгалтара, галоўным бухгалтарам праектнага інстытута «Саюзгіпрамеліяводгас», г. Пінск; эканамістам па планаванню заработнай платы, намеснікам начальніка эканамічнага ўпраўлення па фінансавай рабоце, начальнікам эканамічнага ўпраўлення – галоўным эканамістам, намеснікам генеральнага дырэктара па эканоміцы – начальнікам эканамічнага ўпраўлення, намеснікам генеральнага дырэктара па эканоміцы Пінскага вытворчага дрэваапрацоўчага аб’яднання (закрытага акцыянернага таварыства «Пінскдрэў»).

Дырэктар па эканоміцы і фінансах закрытага акцыянернага таварыства «Холдынгавая кампанія «Пінскдрэў».

Намеснік дэлегата ад Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у Парламенцкай Асамблеі Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе.

Узнагароджана медалём «За працоўныя заслугі», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



## ДАЛЖЭЎСКІ
## Аляксандр Пятровіч

**Член Пастаяннай камісіі па дэмаграфічнай бяспецы і сацыяльнаму развіццю**

*Выбраны ад Магілёўскай вобласці*

Нарадзіўся 5 мая 1971 года ў вёсцы Баранавічы Бабруйскага раёна Магілёўскай вобласці. Закончыў Магілёўскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя А.А.Куляшова, настаўнік гісторыі, сацыяльна-палітычных дысцыплін і асноў права; Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь па спецыяльнасці «дзяржаўнае і мясцовае кіраванне».

Працаваў сакратаром камітэта камсамола, сакратаром камітэта Саюза моладзі Беларусі Магілёўскага педагагічнага вучылішча, настаўнікам гісторыі Дасавіцкай і Буйніцкай сярэдніх школ Магілёўскага раёна, загадчыкам аддзела сацыяльна-культурных ініцыятыў моладзі Магілёўскага абласнога камітэта Беларускага саюза моладзі. Быў першым сакратаром Магілёўскага абласнога камітэта і другім сакратаром Цэнтральнага камітэта грамадскага аб’яднання «Беларускі патрыятычны саюз моладзі».

Сакратар Цэнтральнага камітэта грамадскага аб’яднання «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».

Член Пастаяннай камісіі Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў – удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў па прававых пытаннях.

Намеснік старшыні грамадскага аб’яднання «Беларуская федэрацыя самба».

Узнагароджаны Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



## ДАМАШКЕВІЧ
## Мікалай Фёдаравіч

**Член Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і гуманітарных пытаннях**

*Выбраны ад Мінскай вобласці*

Нарадзіўся 4 верасня 1949 года ў гарадскім пасёлку Жыткавічы Гомельскай вобласці. Закончыў Магілёўскі машынабудаўнічы інстытут, інжынер-механік; Мінскую вышэйшую партыйную школу.

Працаваў сакратаром камсамольскай арганізацыі саўгаса «Жыткавічы» Гомельскай вобласці, аўтаслесарам Жыткавіцкага будаўніча-мантажнага ўпраўлення меліярацыі, галоўным механікам ПМК-86 трэста «Мазырсельбуд», першым сакратаром Жыткавіцкага райкама ЛКСМБ. Служыў у радах Савецкай Арміі. Быў інструктарам арганізацыйнага аддзела Жыткавіцкага райкама Кампартыі Беларусі, намеснікам начальніка УМ-3, ПМК-90 «Віліямінскводбуд» у г.п. Заслаўі Мінскай вобласці, намеснікам начальніка, начальнікам Сенненскай МПК-33 трэста «Віцебскводбуд», намеснікам старшыні, начальнікам упраўлення сельскай гаспадаркі, першым намеснікам старшыні Сенненскага райвыканкама, старшынёй савета РАПА, старшынёй выканкама Сенненскага раённага Савета дэпутатаў, першым сакратаром Сенненскага райкама Кампартыі Беларусі, галоўным кантралёрам інспекцыі па Віцебскай вобласці Кантрольнай палаты Рэспублікі Беларусь, Начальнікам Службы кантролю Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Старшынёй Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь, старшынёй Мінскага абласнога выканаўчага камітэта.

Кіраўнік справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь дванаццатага склікання, членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь другога склікання.

Мае чатыры падзякі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Узнагароджаны ордэнам Айчыны III ступені, медалём «За адзнаку ў ахове грамадскага парадку», трыма юбілейнымі медалямі, Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, трыма ганаровымі граматамі Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, нагрудным знакам Міністэрства адукацыі «Выдатнік адукацыі», медалём свяціцеля Кірылы Тураўскага.



## ДВОРНІК
## Уладзімір Андрэевіч

**Член Пастаяннай камісіі па заканадаўству і дзяржаўнаму будаўніцтву**

*Выбраны ад Гомельскай вобласці*

Нарадзіўся 16 красавіка 1963 года ў вёсцы Ровенская Слабада Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці. Закончыў Віцебскі ветэрынарны інстытут, ветэрынарны ўрач. Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь.

Працаваў трактарыстам калгаса «Дзяржынскі» Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці. Пасля заканчэння Рэчыцкага зааветтэхнікума быў галоўным ветэрынарным урачом калгаса «Усход» Нараўлянскага раёна, намеснікам старшыні калгаса «Дружба» Мазырскага раёна, галоўным дзяржаўным ветэрынарным урачом Мазырскай унітарнай ветэрынарнай станцыі.

Дырэктар саўгаса-камбіната «Зара» Мазырскага раёна Гомельскай вобласці.

Узнагароджаны ордэнам Пашаны, Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, ордэнам Рускай Праваслаўнай Царквы прападобнага Серафіма Capoўскага III ступені.







## ДРАЖЫН
## Уладзімір Несцеравіч

**Член Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы**

*Назначаны Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь*

Нарадзіўся 25 верасня 1947 года ў вёсцы Дражна Старадарожскага раёна Мінскай вобласці. Закончыў ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга Беларускі політэхнічны інстытут, інжынер-механік; Мінскую вышэйшую партыйную школу.

Працаваў настаўнікам Прускай васьмігадовай школы Старадарожскага раёна Мінскай вобласці. Служыў у радах Савецкай Арміі. Выбіраўся сакратаром камітэта камсамола ГПТВ-75 металістаў, намеснікам сакратара, сакратаром камітэта камсамола Беларускага аўтазавода, намеснікам сакратара парткама Беларускага аўтазавода (г. Жодзіна). Пасля вучобы ў партыйнай школе быў сакратаром, другім сакратаром, першым сакратаром Нясвіжскага райкама Кампартыі Беларусі, старшынёй Нясвіжскага райвыканкама, намеснікам, першым намеснікам старшыні Мінскага абласнога выканаўчага камітэта, Намеснікам Прэм’ер-міністра Рэспублікі Беларусь.

Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Беларусь у Літоўскай Рэспубліцы, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Беларусь у Фінляндскай Рэспубліцы па сумяшчальніцтву.

Выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь дванаццатага склікання.

Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны», васьмю медалямі, Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, трыма ганаровымі граматамі Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.



# ЕЛІЗАР’ЕЎ
# Валянцін Мікалаевіч

**Член Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і гуманітарных пытаннях**

*Выбраны ад горада Мінска*

Нарадзіўся 30 кастрычніка 1947 года ў горадзе Баку. Пасля заканчэння Ленінградскага акадэмічнага харэаграфічнага вучылішча імя А.Я.Ваганавай (артыст балета) атрымаў вышэйшую адукацыю ў Ленінградскай дзяржаўнай кансерваторыі імя М.А.Рымскага-Корсакава, балетмайстар-пастаноўшчык, прафесар Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі. Член Савета Еўропы па культуры, акадэмік Міжнароднай славянскай акадэміі і Пятроўскай акадэміі навук і мастацтваў. Заслужаны дзеяч мастацтваў БССР. Народны артыст БССР. Народны артыст СССР. Лаўрэат Усесаюзнага і міжнародных конкурсаў артыстаў балета і харэографаў. Лаўрэат прэміі прыза БЕНУА ДЭ ЛА ДАНС (г. Парыж, за балет «Страсці (Рагнеда)») – лепшы харэограф (1996). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь (1996).

Працаваў выконваючым абавязкі галоўнага балетмайстра, галоўным балетмайстрам-пастаноўшчыкам, мастацкім кіраўніком балета Дзяржаўнага ордэна У.І.Леніна акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета БССР.

Дырэктар – мастацкі кіраўнік Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра балета Рэспублікі Беларусь.

Выбіраўся членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь другога склікання.

Намеснік дэлегата ад Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па ажыццяўленню кантактаў з Парламенцкай Асамблеяй Савета Еўропы.

Член падкамітэта па Дзяржаўных прэміях Рэспублікі Беларусь у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры.

Удастоены звання «Ганаровы грамадзянін горада Мінска».

Мае Падзяку Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Узнагароджаны ордэнамі Айчыны III ступені, Айчыны II ступені, Дружбы народаў, Францыска Скарыны, «За выдатны ўклад у развіццё расійскай культуры і супрацоўніцтва», медалямі «Дружба» (Сацыялістычная Рэспубліка В’етнам), Пушкіна (Расійская Федэрацыя), дзвюма ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР, Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Літоўскай ССР, дзвюма ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. Чалавек года ў галіне музычнага мастацтва – уладальнік прыза «Залатая Неферціці».







# ЕРМАКОВА
# Надзея Андрэеўна

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэту і фінансах**

*Выбрана ад Магілёўскай вобласці*

Нарадзілася 19 красавіка 1953 года ў вёсцы Разульмоў Хоцімскага раёна Магілёўскай вобласці. Закончыла Беларускі дзяржаўны інстытут народнай гаспадаркі імя В.У.Куйбышава, эканаміст. Заслужаны эканаміст Рэспублікі Беларусь. Ганаровы работнік банкаўскай сістэмы Беларусі.

Пасля заканчэння Пінскага ўлікова-крэдытнага тэхнікума працавала крэдытным інспектарам, старшым крэдытным інспектарам, намеснікам кіраўніка Хоцімскага аддзялення Дзяржбанка Магілёўскай вобласці, намеснікам кіраўніка Кіраўскага аддзялення Дзяржбанка Магілёўскай вобласці, намеснікам старшыні райвыканкама, старшынёй планавай камісіі, загадчыкам фінансавага аддзела Шклоўскага райвыканкама, кіраўніком філіяла камерцыйнага банка «Северо-Запад» у г. Шклове, намеснікам Старшыні Праўлення акцыянернага ашчаднага банка «Беларусбанк».

Старшыня Праўлення адкрытага акцыянернага таварыства «Ашчадны банк «Беларусбанк».

Выбіралася членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь першага і другога скліканняў.

Член Праўлення Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь.

Старшыня грамадскага аб’яднання «Беларускі саюз жанчын».

Узнагароджана ордэнам Пашаны, дзвюма ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



# ЖЫГАР
# Віктар Аляксандравіч

**Член Пастаяннай камісіі па заканадаўству і дзяржаўнаму будаўніцтву**

*Выбраны ад Гомельскай вобласці*

Нарадзіўся 6 верасня 1954 года ў вёсцы Слабада Жыткавіцкага раёна Гомельскай вобласці. Закончыў Беларускі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга політэхнічны інстытут, інжынер-электрык; Акадэмію кіравання пры Кабінеце Міністраў Рэспублікі Беларусь, менеджэр-эканаміст.

Пасля заканчэння Канатопскага індустрыяльна-педагагічнага тэхнікума працаваў інжынерам-канструктарам, намеснікам галоўнага канструктара, намеснікам галоўнага інжынера, галоўным інжынерам, дырэктарам Гомельскага завода «Электраапаратура».

Дырэктар адкрытага акцыянернага таварыства «Электраапаратура» (г. Гомель).

Член Пастаяннай камісіі Міжпарламенцкай Асамблеі Еўразійскага эканамічнага супольніцтва па мытнаму рэгуляванню і пагранічнай палітыцы.

Узнагароджаны медалём «За працоўныя заслугі», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Міжпарламенцкай Асамблеі Еўразійскага эканамічнага супольніцтва.







# ЗАЙЦАВА
# Наталля Андрэеўна

**Член Пастаяннай камісіі па заканадаўству і дзяржаўнаму будаўніцтву**

*Выбрана ад Гродзенскай вобласці*

Нарадзілася 13 снежня 1954 года ў горадзе Лідзе Гродзенскай вобласці. Закончыла Смаленскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя К.Маркса, настаўнік англійскай мовы. Заслужаны настаўнік Рэспублікі Беларусь.

Працавала старшай піянерважатай сярэдняй школы № 11 г. Ліды, сакратаром камітэта камсамола Лідскага індустрыяльнага тэхнікума, арганізатарам пазакласнай і пазашкольнай работы, намеснікам дырэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце, дырэктарам сярэдняй школы № 7, дырэктарам сярэдняй школы – гімназіі № 7.

Дырэктар дзяржаўнай установы адукацыі «Гімназія № 1 горада Ліды».

Член Камісіі Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі па інфармацыйнай палітыцы і ўзаемадзеянню з грамадскімі аб’яднаннямі.

Занесена ў Кнігу славы Гродзенскай вобласці.

Прызнана лепшым кіраўніком у сферы адукацыі Гродзенскай вобласці за 2006 год.

Мае Падзяку Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Узнагароджана Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі, знакам «Выдатнік адукацыі БССР».



## ЗІМОЎСКІ
## Аляксандр Леанідавіч

**Член Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэту і фінансах**

*Назначаны Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь*

Нарадзіўся 10 студзеня 1961 года ў горадзе Майнінгене (Германская Дэмакратычная Рэспубліка). Закончыў Палескі дзяржаўны універсітэт па спецыяльнасці «фінансы і крэдыт».

Працаваў рабочым Барысаўскай райагратэхнікі, карэспандэнтам часопіса «Дзелавы веснік», аглядальнікам аб'яднанай рэдакцыі «Чалавек і эканоміка» і «Нацыянальная эканамічная газета», аглядальнікам «Нацыянальнай эканамічнай газеты» закрытага акцыянернага таварыства «Белбізнеспрэс», старшым рэдактарам, спецыяльным карэспандэнтам, палітычным аглядальнікам, намеснікам старшыні Белтэлерадыёкампаніі, генеральным дырэктарам закрытага акцыянернага таварыства «Сталічнае тэлебачанне».

Старшыня Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Рэспублікі Беларусь.

Узнагароджаны ордэнамі «За службу Радзіме» III ступені, Францыска Скарыны, юбілейным медалём «90 год Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.







## ІВАНОЎ
## Валерый Мікалаевіч

**Член Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы**

*Выбраны ад Магілёўскай вобласці*

Нарадзіўся 27 ліпеня 1955 года ў вёсцы Папехінка Клімавіцкага раёна Магілёўскай вобласці. Закончыў Беларускую ордэна Кастрычніцкай Рэвалюцыі і ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга сельскагаспадарчую акадэмію, зоаінжынер; Беларускі дзяржаўны універсітэт, палітолаг; Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь па спецыяльнасці «кіраванне прадпрыемствамі аграпрамысловага комплексу».

Пасля службы ў радах Савецкай Арміі закончыў Клімавіцкі саўгас-тэхнікум. Працаваў галоўным заатэхнікам, старшынёй калгаса «Кастрычнік» Круглянскага раёна, першым намеснікам старшыні Круглянскага райвыканкама – начальнікам упраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання, старшынёй калгаса імя Дзімітрава Круглянскага раёна, старшынёй калгаса «Рассвет» імя К.П.Арлоўскага Кіраўскага раёна Магілёўскай вобласці, старшынёй Кіраўскага раённага выканаўчага камітэта.

Старшыня Шклоўскага раённага выканаўчага камітэта.

Выбіраўся членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь другога склікання.

Член Камісіі Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі па бяспецы, абароне і барацьбе са злачыннасцю.

Узнагароджаны ордэнам Пашаны, медалём «За працоўную адзнаку», юбілейным медалём «90 год Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі.



# ІЛЬНІЦКІ
## Мікалай Мікалаевіч

*Выбраны ад Віцебскай вобласці*

Нарадзіўся 4 студзеня 1949 года ў вёсцы Баранава Полацкага раёна Віцебскай вобласці. Закончыў Беларускі дзяржаўны універсітэт, філолаг, выкладчык рускай мовы і літаратуры; Інстытут паліталогіі і сацыяльнага кіравання Камуністычнай партыі Беларусі, палітолаг.

Пасля заканчэння Полацкага політэхнічнага тэхнікума Белкаапсаюза працоўную дзейнасць пачаў тэхнікам па рамонту халадзільнага абсталявання Віцебскага райспажыўсаюза. Служыў у радах Савецкай Арміі. Працаваў інструктарам Віцебскага райкама ЛКСМБ, машыністам кампрэсарных установак Полацкага ліцейна-механічнага завода, сакратаром камітэта камсамола ТВ-2, інструктарам, загадчыкам аддзела, сакратаром Полацкага гаркама КПБ, дырэктарам сярэдняй школы № 13 г. Полацка. Быў дырэктарам навукова-даследчай і асветніцкай установы культуры «Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік».

З'яўляўся членам Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і гуманітарных пытаннях, членам Пастаяннай камісіі Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў – удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў па культуры, інфармацыі, турызму і спорту.

Уладальнік прэміі года Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За дасягненні ў эстэтычным і маральным выхаванні беларускага народа і прапаганду духоўных каштоўнасцей» (1998). Узнагароджаны Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, нагрудным знакам Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь «За ўклад у развіццё культуры Беларусі».

Памёр 6 лістапада 2006 года.





# КОБРУСЕЎ
## Аркадзій Тарасавіч

**Член Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцоваму самакіраванню**



*Выбраны ад Гомельскай вобласці*

Нарадзіўся 24 ліпеня 1937 года ў пасёлку Івашкава Буда-Кашалёўскага раёна Гомельскай вобласці. Закончыў Беларускую ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга сельскагаспадарчую акадэмію, агранометанаміст; Міжнародны інстытут менеджменту, менеджэр. Герой Сацыялістычнай Працы. Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі БССР.

Працаваў у калгасе імя У.І.Леніна Уваравіцкага раёна, затым інструктарам, сакратаром Уваравіцкага райкама ЛКСМБ Гомельскай вобласці, старшым эканамістам па працы і заработнай плаце Рэчыцкага вытворчага калгасна-саўгаснага ўпраўлення Гомельскай вобласці, інспектарам-арганізатарам Гомельскага вытворчага калгасна-саўгаснага ўпраўлення, намеснікам начальніка ўпраўлення сельскай гаспадаркі Гомельскага райвыканкама, намеснікам старшыні Гомельскага райвыканкама – начальнікам упраўлення сельскай гаспадаркі.

Выбіраўся членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь другога склікання.

Дырэктар камунальнага сельскагаспадарчага унітарнага прадпрыемства «Брылёва» Гомельскага раёна.

Мае Падзяку Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Узнагароджаны залатым медалём «Серп і Молат», двума ордэнамі Леніна, двума ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, ордэнам «Знак Пашаны», пяццю медалямі, дзвюма ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР, дзвюма ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, дзвюма ганаровымі граматамі Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.



## КОСІНЕЦ
## Аляксандр Мікалаевіч

**Член Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы (2004 –2005)**

*Выбраны ад Віцебскай вобласці*

Нарадзіўся 27 мая 1959 года ў вёсцы Роскі-Сялец Аршанскага раёна Віцебскай вобласці. Закончыў Віцебскі дзяржаўны медыцынскі інстытут; клінічную ардынатуру, аспірантуру, факультэт педагогікі і псіхалогіі Віцебскага дзяржаўнага медыцынскага універсітэта; эканамічны факультэт (магістратура) Беларускага дзяржаўнага універсітэта; магістр эканомікі, доктар медыцынскіх навук, прафесар. Заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь. Аўтар 350 навуковых прац, у тым ліку 17 манаграфій і вучэбных дапаможнікаў, 8 вынаходстваў. Ганаровы акадэмік Польскай акадэміі медыцыны.

Працаваў намеснікам сакратара камітэта камсамола, сакратаром камітэта камсамола Віцебскага дзяржаўнага медыцынскага інстытута. Быў асістэнтам, дацэнтам, прафесарам кафедры шпітальнай хірургіі, прафесарам кафедры хірургіі факультэта павышэння кваліфікацыі спецыялістаў Віцебскага дзяржаўнага медыцынскага універсітэта, кіраўніком рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра «Інфекцыя ў хірургіі», рэктарам установы адукацыі «Віцебскі дзяржаўны ордэна Дружбы народаў медыцынскі універсітэт».

Мае Падзяку Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Узнагароджаны медалём «За працоўную доблесць», чатырма юбілейнымі медалямі, залатым медалём Альберта Швейцара, нагрудным знакам Міністэрства аховы здароўя «Выдатнік аховы здароўя Рэспублікі Беларусь», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

У сувязі з назначэннем Намеснікам Прэм’ер-міністра Рэспублікі Беларусь паўнамоцтвы члена Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь датэрмінова спынены з 27 снежня 2005 года.







## КРАЎЧАНКА
## Таццяна Аляксандраўна

**Член Пастаяннай камісіі па дэмаграфічнай бяспецы і сацыяльнаму развіццю**

*Выбрана ад горада Мінска*

Нарадзілася 13 красавіка 1946 года ў горадзе Аха Сахалінскай вобласці РСФСР. Закончыла Беларускі дзяржаўны інстытут народнай гаспадаркі імя В.У.Куйбышава, эканаміст.

Працавала лабарантам сярэдняй школы № 10 г. Феадосія (Крым), электрапрыбарыстам-вымяральнікам вайсковай часці 78384 Чырванасцяжнага Чарнаморскага флоту, прыбарыстам цэха № 23 Мінскага завода паўправадніковых прыбораў імя Ф.Э.Дзяржынскага, надомніцай швейнага ўчастка Мінскага камбіната надомнай працы, інжынерам, старшым інжынерам навукова-даследчай лабараторыі навуковай арганізацыі працы рэспубліканскага праектна-канструктарскага бюро Міністэрства харчовай прамысловасці БССР, эканамістам аддзела эканамічных даследаванняў і навуковай арганізацыі працы, эканамістам групы эканамічных даследаванняў навуковага вытворчага аб’яднання «Белхарчпрамтэхніка» (навуковага вытворчага аб’яднання «Хартэк» Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Рэспублікі Беларусь).

Старшыня грамадскага аб’яднання «Беларуская асацыяцыя шматдзетных бацькоў».

Член Пастаяннай камісіі Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў – удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў па сацыяльнай палітыцы і правах чалавека.

Старшыня Рэспубліканскай грамадскай наглядальнай камісіі пры Міністэрстве юстыцыі Рэспублікі Беларусь.

Член Нацыянальнай камісіі па правах дзіцяці.

Узнагароджана медалямі «Медаль мацярынства» II ступені, «За працоўныя заслугі», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Савета Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў – удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў.



# КУРЭК
# Наталля Алегаўна

**Член Пастаяннай камісіі па заканадаўству і дзяржаўнаму будаўніцтву**

*Выбрана ад горада Мінска*

Нарадзілася 19 снежня 1951 года ў горадзе Мінску. Закончыла Мінскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўны медыцынскі інстытут, урач-лячэбнік.

Працоўную дзейнасць пачала медыцынскім рэгістратарам 9-й паліклінікі г. Мінска. Пасля заканчэння інстытута працавала ўрачом-інтэрнам 8-й гарадской гінекалагічнай бальніцы, урачом акушэрам-гінеколагам 17-й жаночай кансультацыі і 8-й гарадской гінекалагічнай бальніцы. Была клінічным ардынатарам спецардынатуры кафедры акушэрства і гінекалогіі Мінскага дзяржаўнага медыцынскага інстытута. Затым працавала ўрачом акушэрам-гінеколагам і загадчыкам гінекалагічнага аддзялення 3-й клінічнай бальніцы, намеснікам галоўнага ўрача па родадапамозе 6-й клінічнай бальніцы.

Галоўны ўрач установы аховы здароўя «Гарадскі клінічны радзільны дом № 2» г. Мінска.

Член дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у Міжпарламенцкай Асамблеі праваслаўя.

Узнагароджана медалём «За працоўныя заслугі», юбілейным медалём «90 год Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, нагрудным знакам Міністэрства аховы здароўя «Выдатнік аховы здароўя Рэспублікі Беларусь».







# ЛІС
# Святаслаў Мікалаевіч

**Член Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы**

*Выбраны ад Гродзенскай вобласці*

Нарадзіўся 22 кастрычніка 1951 года ў вёсцы Падбор’е Навагрудскага раёна Гродзенскай вобласці. Закончыў Беларускі дзяржаўны універсітэт, географ; Свярдлоўскае вышэйшае ваенна-палітычнае танкава-артылерыйскае вучылішча, палітработнік танкавых войскаў; Ваенна-палітычную акадэмію імя У.І.Леніна, выкладчык грамадскіх навук. Палкоўнік запасу. Заслужаны спецыяліст Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь.

Працаваў сакратаром камітэта ВЛКСМ танкавага палка, старшым інструктарам палітычнага аддзела танкавай арміі, палітычнага ўпраўлення Беларускай ваеннай акругі, намеснікам камандзіра гвардзейскага мотастралковага палка, намеснікам начальніка палітаддзела гвардзейскай танкавай дывізіі. Быў намеснікам начальніка палітаддзела мотастралковай дывізіі ў складзе абмежаванага кантынгенту савецкіх войскаў у Рэспубліцы Афганістан, начальнікам аддзялення арганізацыйна-партыйнай работы палітаддзела, сакратаром парткама агульнавайсковай арміі, намеснікам камандзіра па выхаваўчай рабоце армейскага корпуса, намеснікам камандуючага войскамі па маральна-псіхалагічнаму забеспячэнню Заходняга аператыўнага камандавання Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь.

Памочнік рэктара ўстановы адукацыі «Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы».

Выбіраўся членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь другога склікання.

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў – удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў па пытаннях абароны і бяспекі.

Член Пастаяннай камісіі Парламенцкай Асамблеі Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы па пытаннях абароны і бяспекі.

Член Аб’яднанай камісіі па гарманізацыі заканадаўства ў сферы барацьбы з тэрарызмам, злачыннасцю і наркабізнесам у Садружнасці Незалежных Дзяржаў.

Член савета Рэспубліканскага грамадскага аб’яднання «Белая Русь».

Член рэспубліканскага грамадскага аб’яднання «Беларускі саюз ветэранаў вайны ў Афганістане».

Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, Чырвонага Сцяга (Рэспубліка Афганістан), васемнаццацю медалямі, Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета СССР, Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Савета Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў – удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў.



## МАІСЕЕЎ
## Леанід Сяргеевіч

**Член Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцоваму самакіраванню**

*Выбраны ад Магілёўскай вобласці*

Нарадзіўся 23 красавіка 1950 года ў вёсцы Міхайлавічы Горацкага раёна Магілёўскай вобласці. Закончыў Віцебскі ветэрынарны інстытут, заатэхнік. Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь.

Пасля службы ў радах Савецкай Арміі працаваў брыгадзірам будаўнічай брыгады, галоўным заатэхнікам калгаса «Перамога», дырэктарам саўгаса «Барок», старшынёй калгаса «Зара», дырэктарам закрытага акцыянернага таварыства «Зара», старшынёй калгаса «Зара» Магілёўскага раёна.

Генеральны дырэктар закрытага акцыянернага таварыства «Агракамбінат «Зара» Магілёўскага раёна.

Член дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па ажыццяўленню кантактаў з Парламенцкай Асамблеяй НАТО.

Член Пастаяннай камісіі Міжпарламенцкай Асамблеі Еўразійскага эканамічнага супольніцтва па аграпрамысловай палітыцы, прыродакарыстанню і экалогіі.

Узнагароджаны ордэнамі «Знак Пашаны», Айчыны III ступені, Айчыны II ступені, юбілейным медалём «90 год Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.







## МАЛАФЕЕЎ
## Анатолій Аляксандравіч

**Старшыня Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцоваму самакіраванню**

*Выбраны ад Гомельскай вобласці*

Нарадзіўся 14 мая 1933 года ў горадзе Гомелі. Закончыў Беларускі дзяржаўны інстытут народнай гаспадаркі імя В.У.Куйбышава, эканаміст; Вышэйшую партыйную школу пры ЦК КПСС.

Працаваў слесарам на Мінскім, Гомельскім вагонарамонтных заводах. Служыў у Ваенна-Марскім флоце. Працаваў у чыгуначным райкаме КПБ г. Гомеля, загадчыкам сектара Гомельскага абкама КПБ, інструктарам ЦК КПБ, першым сакратаром Мазырскага гаркама КПБ, сакратаром Гомельскага абкама КПБ, старшынёй Гомельскага аблвыканкама, першым сакратаром Гомельскага і Мінскага абкамаў КПБ, першым сакратаром ЦК КПБ, намеснікам начальніка Галоўнага ўпраўлення па дзяржаўных матэрыяльных рэзервах.

Выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета СССР, народным дэпутатам СССР, дэпутатам Вярхоўнага Савета Беларускай ССР дзевятага і дзесятага скліканняў, дэпутатам Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь трынаццатага склікання. Быў Старшынёй Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь першага склікання, старшынёй Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах і сувязях з СНД другога склікання.

Член Камісіі Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі па эканамічнай палітыцы.

Член Кантрольна-бюджэтнай камісіі Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў – удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў, член парламенцкай групы Міжпарламенцкай Асамблеі СНД дзяржаў – удзельніц Пагаднення аб фарміраванні Адзінай эканамічнай прасторы па пытаннях дзяржаўнага рэгулявання эканомікі, член Пастаяннай камісіі Міжпарламенцкай Асамблеі Еўразійскага эканамічнага супольніцтва па гандлёвай палітыцы і міжнароднаму супрацоўніцтву. Дэлегат ад Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у Парламенцкай Асамблеі Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе.

Узнагароджаны двума ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, ордэнамі Айчыны III ступені, Айчыны II ступені, «Садружнасць» (Міжпарламенцкая Асамблея дзяржаў – удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў), юбілейным медалём «90 год Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Міжпарламенцкай Асамблеі Еўразійскага эканамічнага супольніцтва.



# МАЛЬЦАЎ
# Уладзімір Рыгоравіч

**Член Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцоваму самакіраванню**

*Выбраны ад Гомельскай вобласці*

Нарадзіўся 29 студзеня 1947 года ў вёсцы Каравацічы Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці. Закончыў Беларускі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга політэхнічны інстытут, інжынер-будаўнік. Заслужаны будаўнік Рэспублікі Беларусь.

Працаваў рабочым, майстрам будаўнічага ўпраўлення № 112 будаўнічага трэста № 20 г. Светлагорска. Пасля службы ў радах Савецкай Арміі быў майстрам, прарабам будаўнічага ўпраўлення № 112 будаўнічага трэста № 20, начальнікам упраўлення капітальнага будаўніцтва – намеснікам старшыні Светлагорскага гарадскога выканаўчага камітэта.

Дырэктар адкрытага акцыянернага таварыства «Светлагорскі домабудаўнічы камбінат».

Узнагароджаны юбілейным медалём «90 год Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.







# МАРТЫНАЎ
# Мікалай Васільевіч

**Член Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэту і фінансах**

*Выбраны ад Віцебскай вобласці*

Нарадзіўся 1 жніўня 1957 года ў вёсцы Гудава Дубровенскага раёна Віцебскай вобласці. Закончыў Інстытут паліталогіі і сацыяльнага кіравання Камуністычнай партыі Беларусі, паліталаг.

Працаваў памочнікам майстра па абслугоўванню круглапанчошнага абсталявання, намеснікам начальніка аддзела забеспячэння на Віцебскай ордэна Леніна панчошна-трыкатажнай фабрыцы імя КІМ. Пасля заканчэння Мінскай вышэйшай партыйнай школы працаваў экспертам камерцыйнага аддзела сумеснага савецка-заходнегерманскага прадпрыемства «Белвест», дырэктарам МКП «ЛМ + МК», генеральным дырэктарам ПКФ «ЛМ + МК».

Генеральны дырэктар сумеснага беларуска-германскага таварыства з абмежаванай адказнасцю «Марка».

Член Пастаяннай камісіі Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў – удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў па вывучэнню вопыту дзяржаўнага будаўніцтва і мясцовага самакіравання.

Член Савета па развіццю прадпрымальніцтва ў Рэспубліцы Беларусь.

Узнагароджаны медалём «За працоўныя заслугі», юбілейнымі медалямі «60 год Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941 – 1945 гг.», «90 год Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.



# МАРЫЕЎ
# Павел Лук’янавіч

**Член Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэту і фінансах**

*Выбраны ад Мінскай вобласці*

Нарадзіўся 14 чэрвеня 1938 года ў вёсцы Дулава Яраслаўскага раёна Яраслаўскай вобласці РСФСР. Закончыў Беларускі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга політэхнічны інстытут, інжынер-механік. Герой Беларусі. Заслужаны работнік прамысловасці Рэспублікі Беларусь, доктар тэхнічных навук. Аўтар (сааўтар) 28 навуковых публікацый, 5 аўтарскіх пасведчанняў і 4 патэнтаў.

Член Камісіі Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі па эканамічнай палітыцы.

Працаваў тэхнікам-канструктарам Уральскага аўтамабільнага завода, тэхнікам-тэхнолагам, інжынерам-тэхнолагам, старшым тэхнолагам, старшым інжынерам-тэхнолагам, начальнікам тэхчасці механазборачнага цэха, начальнікам тэхнічнага бюро, намеснікам галоўнага тэхнолага, начальнікам тэхнічнага аддзела станкоў з ЧПК, намеснікам галоўнага інжынера, галоўным інжынерам, дырэктарам, генеральным дырэктарам Беларускага аўтамабільнага завода, затым генеральным дырэктарам вытворчага аб’яднання «БелАЗ» – дырэктарам Беларускага аўтамабільнага завода, генеральным дырэктарам вытворчага аб’яднання «Беларускі аўтамабільны завод» – дырэктарам рэспубліканскага унітарнага вытворчага прадпрыемства «Беларускі аўтамабільны завод», генеральным дырэктарам вытворчага аб’яднання «БелАЗ» – генеральным дырэктарам рэспубліканскага унітарнага вытворчага прадпрыемства «Беларускі аўтамабільны завод» (г. Жодзіна).

Дырэктар навукова-тэхнічнага цэнтра кар’ернай тэхнікі і тэхналогій дзяржаўнай навуковай установы «Аб’яднаны інстытут машынабудавання Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі».

Член савета рэспубліканскага грамадскага аб’яднання «Беларуская навукова-прамысловая асацыяцыя».

Член савета Міжнароднай канфедэрацыі прамыслоўцаў і прадпрымальнікаў.

Прысвоена званне «Ганаровы грамадзянін горада Жодзіна».

Узнагароджаны ордэнамі «Знак Пашаны», Айчыны III ступені, Дружбы народаў, шасцю медалямі, дзвюма ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай ВДНГ БССР, ордэнам прападобнага Сергія Раданежскага III ступені, ордэнам Беларускай Праваслаўнай Царквы Крыжа прападобнай Ефрасінні, ігуменні Полацкай.







# МІРОНАВА
# Валянціна Іванаўна

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па заканадаўству і дзяржаўнаму будаўніцтву**

*Выбрана ад Мінскай вобласці*

Нарадзілася 4 лютага 1953 года ў вёсцы Грэбень Пухавіцкага раёна Мінскай вобласці. Закончыла Беларускі дзяржаўны інстытут народнай гаспадаркі імя В.У.Куйбышава, эканаміст.

Пасля заканчэння вучобы працавала інспектарам аддзела па перасяленню і арганізаванаму набору рабочых, інжынерам-эканамістам аддзела пераразмеркавання і перападрыхтоўкі рабочых, старшым інжынерам-эканамістам аддзела хімічнай, лёгкай і мясцовай прамысловасці, вядучым эканамістам, начальнікам аддзела прамысловасці саюзнарэспубліканскага і рэспубліканскага падпарадкавання Дзяржкампрацы БССР. Была начальнікам аддзела працы і заработнай платы трэста № 6, намеснікам начальніка аддзела працы і заработнай платы аб’яднання «Мінскаблсельбуд», начальнікам аддзела прававога забеспячэння працы, сацыяльнай абароны і ўзроўню жыцця насельніцтва ўпраўлення па працы і сацыяльнай абароне насельніцтва Мінскага абласнога выканаўчага камітэта, намеснікам начальніка ўпраўлення па працы і сацыяльнай абароне насельніцтва Мінскага абласнога выканаўчага камітэта, намеснікам старшыні камітэта па працы і занятасці насельніцтва Мінскага абласнога выканаўчага камітэта – начальнікам упраўлення абласной службы занятасці, начальнікам упраўлення абласной службы занятасці насельніцтва пры камітэце па працы Мінскага абласнога выканаўчага камітэта, начальнікам упраўлення абласной службы занятасці насельніцтва Мінскага абласнога выканаўчага камітэта.

Намеснік старшыні камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінскага абласнога выканаўчага камітэта.

Старшыня абласной арганізацыі грамадскага аб’яднання «Беларускі саюз жанчын».

Мае Падзяку Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Узнагароджана юбілейнымі медалямі «60 год вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў», «60 год Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941 – 1945 гг.», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, нагрудным знакам «За актыўную працу ў сістэме Дзяржкампрацы СССР».



## НАВІЦКІ
## Генадзій Васільевіч

**Старшыня Савета Рэспублікі**

*Выбраны ад Магілёўскай вобласці*

Нарадзіўся 2 студзеня 1949 года ў горадзе Магілёве. Закончыў Беларускі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга політэхнічны інстытут, інжынер-будаўнік; Акадэмію грамадскіх навук пры ЦК КПСС.

Працаваў майстрам, начальнікам участка БУ-56, галоўным інжынерам БУ-92 будтрэста № 12 у г. Магілёве, інструктарам аддзела будаўніцтва Магілёўскага абкама Кампартыі Беларусі, галоўным інжынерам Магілёўскага аблміжкалгасбуда, загадчыкам аддзела будаўніцтва Магілёўскага абкама Кампартыі Беларусі, старшынёй праўлення Магілёўскага аблсельбуда, Міністрам архітэктуры і будаўніцтва Рэспублікі Беларусь, Намеснікам Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь, Прэм'ер-міністрам Рэспублікі Беларусь.

Выбіраўся Старшынёй Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь другога склікання.

Член Вышэйшага Дзяржаўнага Савета Саюзнай дзяржавы. Намеснік Старшыні Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі.

Член Савета Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў – удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў, намеснік старшыні Міжпарламенцкай Асамблеі Еўразійскага эканамічнага супольніцтва, член Савета Парламенцкай Асамблеі Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы, кіраўнік дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у парламенцкай структуры Цэнтральнаеўрапейскай ініцыятывы.

Мае Падзяку Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Узнагароджаны ордэнам «Садружнасць» (Міжпарламенцкая Асамблея дзяржаў – удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў), юбілейным медалём «90 год Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Міжпарламенцкай Асамблеі Еўразійскага эканамічнага супольніцтва.







## НІКІЦІНА
## Надзея Паўлаўна

**Член Пастаяннай камісіі па дэмаграфічнай бяспецы і сацыяльнаму развіццю**

*Выбрана ад Брэсцкай вобласці*

Нарадзілася 20 кастрычніка 1970 года ў вёсцы Парэчча Пінскага раёна Брэсцкай вобласці. Закончыла Беларускі дзяржаўны інстытут народнай гаспадаркі імя В.У.Куйбышава, эканаміст.

Пасля заканчэння вучобы працавала эканамістам крэдытнага аддзела аддзялення Аграпрамбанка, старшым эканамістам крэдытнага аддзела, намеснікам кіраўніка аддзялення адкрытага акцыянернага таварыства «Белаграпрамбанк».

Кіраўнік аддзялення адкрытага акцыянернага таварыства «Белаграпрамбанк», г. Камянец Брэсцкай вобласці.

Член дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у Міжпарламенцкай Асамблеі праваслаўя.

Узнагароджана Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



# НОВІКАЎ
## Анатолій Мікалаевіч

**Старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і гуманітарных пытаннях**

*Выбраны ад Мінскай вобласці*

Нарадзіўся 13 лютага 1941 года ў горадзе Бароўску Калужскай вобласці РСФСР. Закончыў Вышэйшае агульнавайсковае каманднае вучылішча імя Вярхоўнага Савета РСФСР, агульнавайсковы камандзір; Ваенна-палітычную акадэмію імя У.І.Леніна, палітработнік; Акадэмію грамадскіх навук пры ЦК КПСС, палітолаг. Генерал-лейтэнант у адстаўцы.

Працаваў на розных пасадах у Маскоўскай, Прыбалтыйскай, Прыкарпацкай ваенных акругах, Групе савецкіх войскаў у Германіі, затым членам ваеннага савета танкавай арміі ў г. Барысаве, членам ваеннага савета Закаўказскай і Беларускай ваенных акруг, начальнікам інспекцыі Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь.

Выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета Беларускай ССР адзінаццатага склікання, дэпутатам Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь дванаццатага склікання – старшынёй Пастаяннай камісіі па пытаннях нацыянальнай бяспекі, абароны і барацьбы са злачыннасцю, членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь другога склікання – старшынёй Пастаяннай камісіі па сацыяльных пытаннях.

Старшыня Рэспубліканскага савета Беларускага грамадскага аб'яднання ветэранаў.

Член Камісіі па пытаннях памілавання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.

Намеснік старшыні Камісіі Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі па сацыяльнай палітыцы, навуцы, культуры і гуманітарных пытаннях.

Член дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па ажыццяўленню кантактаў з Асамблеяй Заходнееўрапейскага Саюза – Міжпарламенцкай Асамблеяй па еўрапейскай бяспецы і абароне.

Узнагароджаны ордэнамі Айчыны III ступені, Пашаны, Чырвонай Зоркі, «За службу Радзіме ва Узброеных Сілах СССР» III ступені, васемнаццацю медалямі, Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Міжпарламенцкай Асамблеі Еўразійскага эканамічнага супольніцтва.







# ПАСТАЯЛКА
## Людміла Андрэеўна

*Назначана Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь*

Нарадзілася 17 жніўня 1941 года ў сяле Жданы Палтаўскай вобласці Украінскай ССР. Закончыла Кіеўскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга медыцынскі інстытут, урач-педыятр. Заслужаны ўрач Рэспублікі Беларусь.

Працавала ўчастковым педыятрам Брэсцкай дзіцячай паліклінікі, урачом-ардынатарам Брэсцкай дзіцячай бальніцы, загадчыкам аддзялення, намеснікам галоўнага ўрача па лячэбнай частцы, галоўным урачом Брэсцкай абласной дзіцячай бальніцы. Была назначана першым намеснікам Міністра і Міністрам аховы здароўя Рэспублікі Беларусь.

Была старшынёй Пастаяннай камісіі па дэмаграфічнай бяспецы і сацыяльнаму развіццю.

З'яўлялася Памочнікам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па пытаннях удасканалення сістэмы аховы здароўя, арганізацыі закупак лекавых сродкаў, медыцынскай тэхнікі і вырабаў медыцынскага прызначэння на тэндарнай аснове, а таксама супрацоўніцтва з Міжнароднай Федэрацыяй таварыстваў Чырвонага Крыжа і Чырвонага Паўмесяца, старшынёй Рэспубліканскай тэндарнай камісіі па закупцы медыцынскай тэхнікі і вырабаў медыцынскага прызначэння, старшынёй Беларускага Таварыства Чырвонага Крыжа.

Узнагароджана ордэнам Пашаны, Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, нагрудным знакам Міністэрства аховы здароўя «Выдатнік аховы здароўя Рэспублікі Беларусь».

Памерла 6 сакавіка 2007 года.



## ПАЎЛАЎ
## Міхаіл Якаўлевіч

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы**

*Выбраны ад горада Мінска*

Нарадзіўся 1 верасня 1952 года ў вёсцы Ордаць Шклоўскага раёна Магілёўскай вобласці. Закончыў Магілёўскі машынабудаўнічы інстытут, інжынер-механік; Акадэмію народнай гаспадаркі пры Урадзе Расійскай Федэрацыі, менеджэр вышэйшай кваліфікацыі. Кандыдат тэхнічных навук. Заслужаны работнік прамысловасці Рэспублікі Беларусь. Аўтар 13 навуковых прац, 4 вынаходстваў.

Працаваў электразваршчыкам магілёўскага завода «Будмашына» імя 50-годдзя Вялікага Кастрычніка, электразваршчыкам Валожынскага міжкалгасбуда. Служыў у радах Савецкай Арміі. Быў электразваршчыкам, старшым майстрам, інжынерам-тэхнолагам, начальнікам аддзела тэхнічнага кантролю, галоўным інжынерам, дырэктарам завода сянажных вежаў Баранавіцкага камбіната сянажных вежаў Брэсцкай вобласці, генеральным дырэктарам Беларускага вытворчага аб’яднання гандлёвага машынабудавання (г. Баранавічы), старшынёй Баранавіцкага гарадскога выканаўчага камітэта.

Старшыня Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта.

Назначаўся Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь другога склікання.

Мае дзве падзякі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Узнагароджаны ордэнам Пашаны, Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, міжнароднай узнагародай «Факел Бірмінгема».







## ПЕСЦІС
## Вітольд Казіміравіч

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы**

*Выбраны ад Гродзенскай вобласці*

Нарадзіўся 22 лютага 1949 года ў вёсцы Парэчча Гродзенскага раёна Гродзенскай вобласці. Закончыў Гродзенскі сельскагаспадарчы інстытут, вучоны-заатэхнік; аспірантуру Беларускага навукова-даследчага інстытута жывёлагадоўлі, доктар сельскагаспадарчых навук. Прафесар, член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Заслужаны работнік адукацыі Рэспублікі Беларусь. Ганаровы прафесар Міжнароднага Венскага універсітэта. Аўтар больш як 200 навуковых і вучэбна-метадычных артыкулаў, 12 вучэбных дапаможнікаў, 7 манаграфій і 25 вынаходстваў, абароненых аўтарскімі пасведчаннямі і патэнтамі.

Працоўную дзейнасць пачаў заатэхнікам-селекцыянерам Гродзенскай абласной станцыі па племянной рабоце ў свінагадоўлі. Пасля службы ў радах Савецкай Арміі працаваў галоўным заатэхнікам саўгаса «Скідзельскі», калгаса «Сцяг камунізму» Гродзенскага раёна. Закончыўшы аспірантуру Беларускага навукова-даследчага інстытута жывёлагадоўлі, быў малодшым навуковым супрацоўнікам аддзела кармлення гэтага інстытута, затым асістэнтам, дацэнтам, загадчыкам кафедры кармлення і фізіялогіі сельскагаспадарчай жывёлы, прарэктарам па навуковай рабоце, рэктарам Гродзенскага сельскагаспадарчага інстытута.

Рэктар установы адукацыі «Гродзенскі дзяржаўны аграрны універсітэт».

Выбіраўся членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь другога склікання.

Член Пастаяннай камісіі Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў – удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў па культуры, інфармацыі, турызму і спорту, член парламенцкай групы Міжпарламенцкай Асамблеі СНД дзяржаў – удзельніц Пагаднення аб фарміраванні Адзінай эканамічнай прасторы па міжнародна-прававых пытаннях і мытна-тарыфнаму рэгуляванню.

Намеснік старшыні Рэспубліканскага грамадскага аб’яднання «Белая Русь».

Старшыня Гродзенскага абласнога грамадскага аб’яднання «Белая Русь».

Узнагароджаны чатырма юбілейнымі медалямі, Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Ганаровай граматай Савета Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў – удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў, Ганаровай граматай Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь, ганаровымі граматамі Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Рэспублікі Беларусь.



# ПІСАРЭВІЧ
# Сцяпан Канстанцінавіч

**Старшыня Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэту і фінансах**

*Выбраны ад горада Мінска*

Нарадзіўся 24 кастрычніка 1947 года ў вёсцы Пераруб Іванаўскага раёна Брэсцкай вобласці. Закончыў Беларускі дзяржаўны інстытут народнай гаспадаркі імя В.У.Куйбышава, эканаміст; Мінскую вышэйшую партыйную школу.

Працаваў аўтаслесарам, вадзіцелем-інструктарам аўтабазы № 13 у г. Іванава, майстрам, старшым інжынерам эксплуатацыйна-мантажнай канторы па газіфікацыі ў г. Пінску, інструктарам арганізацыйнага аддзела Іванаўскага райкама Кампартыі Беларусі, інструктарам аддзела аргпартработы Брэсцкага абкама Кампартыі Беларусі, другім сакратаром Івацэвіцкага райкама Кампартыі Беларусі, старшынёй Івацэвіцкага райвыканкама, першым сакратаром Івацэвіцкага райкама Кампартыі Беларусі, старшынёй Праўлення банка «БелБалтыя», саветнікам прэзідэнта, начальнікам сакратарыята прэзідэнта канцэрна «Белнафтахім», першым намеснікам Кіраўніка справамі Выканаўчага камітэта Саюза Беларусі і Расіі, намеснікам Дзяржаўнага сакратара – членам Пастаяннага Камітэта Саюзнай дзяржавы, начальнікам Галоўнага эканамічнага ўпраўлення Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь дванаццатага склікання – намеснікам старшыні і старшынёй Пастаяннай планавай і бюджэтна-фінансавай камісіі.

Член Камісіі Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі па бюджэту і фінансах.

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў – удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў па эканоміцы і фінансах, член парламенцкай групы Міжпарламенцкай Асамблеі СНД дзяржаў – удзельніц Пагаднення аб фарміраванні Адзінай эканамічнай прасторы па пытаннях макраэканамічнай і фінансавай палітыкі.

Узнагароджаны ордэнамі «Знак Пашаны», «Садружнасць» (Міжпарламенцкая Асамблея дзяржаў – удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў), юбілейным медалём «90 год Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі, Ганаровай граматай Савета Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў – удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў.







# ПРЫГОЖАЯ
# Таццяна Іванаўна

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па дэмаграфічнай бяспецы і сацыяльнаму развіццю**

*Выбрана ад Гомельскай вобласці*

Нарадзілася 27 верасня 1959 года ў горадзе Саснагорску Ухцінскага раёна Комі АССР. Закончыла Віцебскі дзяржаўны медыцынскі інстытут, урач-анколаг.

Працавала ўрачом-інтэрнам бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі, урачом-хірургам паліклінікі № 10 г. Гомеля, урачом-анколагам радыехірургічнага аддзялення, намеснікам галоўнага ўрача па лячэбнай частцы Гомельскага абласнога анкалагічнага дыспансера.

Галоўны ўрач установы «Гомельскі абласны клінічны анкалагічны дыспансер».

Член дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у Міжпарламенцкай Асамблеі праваслаўя.

Узнагароджана юбілейнымі медалямі «60 год Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941 – 1945 гг.», «90 год Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь, нагрудным знакам Міністэрства аховы здароўя «Выдатнік аховы здароўя Рэспублікі Беларусь», Ганаровай граматай Рэспубліканскага камітэта Беларускага прафсаюза работнікаў аховы здароўя.



# РАЛЬКЕВІЧ
# Ала Васільеўна

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па дэмаграфічнай бяспецы і сацыяльнаму развіццю**

*Выбрана ад Мінскай вобласці*

Нарадзілася 24 чэрвеня 1950 года ў вёсцы Слабада Пухавіцкага раёна Мінскай вобласці. Закончыла Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут замежных моў, настаўнік англійскай і французскай моў.

Працавала настаўнікам англійскай мовы, арганізатарам пазакласнай і пазашкольнай выхаваўчай работы, дырэктарам Пухавіцкай сярэдняй школы, дырэктарам сярэдняй школы № 5, дырэктарам школы-гімназіі № 5 г. Мар'іна Горка Пухавіцкага раёна Мінскай вобласці.

Дырэктар установы адукацыі «Мар'інагорская дзяржаўная гімназія» Пухавіцкага раёна Мінскай вобласці.

Выбіралася членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь другога склікання, з'яўлялася членам Камісіі Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі па пытаннях знешняй палітыкі.

Член Камісіі Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі па пытаннях знешняй палітыкі, член Мандатнай камісіі.

Член Нацыянальнай камісіі па правах дзіцяці.

Член праўлення грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз жанчын».

Узнагароджана ордэнам «Знак Пашаны», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі, знакам «Выдатнік адукацыі БССР».







# РАХАТКА
# Казімір Уладзіслававіч

**Член Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэту і фінансах**

*Выбраны ад Гродзенскай вобласці*

Нарадзіўся 15 верасня 1952 года ў вёсцы Няцеч Лідскага раёна Гродзенскай вобласці. Закончыў Ленінградскі сельскагаспадарчы інстытут, інжынер-механік; Беларускі дзяржаўны эканамічны універсітэт, эканаміст-менеджэр. Кандыдат эканамічных навук. Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь.

Працоўную дзейнасць пачаў падсобным рабочым, размеркавальнікам работ вытворчага аддзела Лідскага аўтарамонтнага завода. Пасля службы ў радах Савецкай Арміі працаваў аўтаслесарам, майстрам цэха зборкі аўтамашын Лідскага аўтарамонтнага завода, інжынерам па тэхніцы бяспекі, галоўным інжынерам саўгаса «Тарнова», дырэктарам саўгаса «М.Мажэйкава», генеральным дырэктарам аграфірмы «Мажэйкава» Лідскага раёна Гродзенскай вобласці.

Дырэктар Лідскага раённага сельскагаспадарчага унітарнага прадпрыемства «Мажэйкава».

Выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь дванаццатага склікання, членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь другога склікання.

Намеснік дэлегата ад Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па ажыццяўленню кантактаў з Парламенцкай Асамблеяй Савета Еўропы.

Член Пастаяннай камісіі Парламенцкай Асамблеі Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы па сацыяльна-эканамічных і прававых пытаннях.

Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны», юбілейным медалём «90 год Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



## САЎЧАНКА
## Уладзімір Ягоравіч

**Член Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы**

*Выбраны ад Гродзенскай вобласці*

Нарадзіўся 26 лютага 1952 года ў вёсцы Фралоўка Касцюковіцкага раёна Магілёўскай вобласці. Закончыў Беларускую ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга сельскагаспадарчую акадэмію, інжынер-землеўпарадчык.

Працоўную дзейнасць пачаў выкладчыкам Брасаўскага сельскагаспадарчага тэхнікума Бранскай вобласці. Служыў у радах Савецкай Арміі. Працаваў прарабам, начальнікам Круглянскага дарожна-эксплуатацыйнага ўчастка Магілёўскага абласнога вытворчага ўпраўлення будаўніцтва і эксплуатацыі аўтамабільных дарог, старшынёй калгаса «Шлях камунізму» Круглянскага раёна Магілёўскай вобласці, старшынёй Круглянскага райвыканкама, намеснікам старшыні Магілёўскага аблвыканкама, першым намеснікам старшыні Гродзенскага аблвыканкама.

Старшыня Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта.

Назначаўся Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь другога склікання.

Узнагароджаны ордэнамі Айчыны III ступені, Пашаны, медалём «За працоўную адзнаку», трыма юбілейнымі медалямі, Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.







## САХАНЬКО
## Уладзімір Якаўлевіч

**Член Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцоваму самакіраванню**

*Выбраны ад Магілёўскай вобласці*

Нарадзіўся 27 чэрвеня 1946 года ў горадзе Магілёве. Закончыў Магілёўскі машынабудаўнічы інстытут, інжынер-механік.

Працаваў вучнем слесара, слесарам па рамонту рухомага саставу Магілёўскага паравознага дэпо. Пасля службы ў радах Савецкай Арміі працаваў слесарам-мантажнікам, слесарам-зборшчыкам, майстрам Магілёўскага завода «Строммашына», майстрам, старшым майстрам, начальнікам участка, начальнікам вытворчага дыспетчарскага бюро, намеснікам начальніка цэха, начальнікам цэха, намеснікам начальніка, начальнікам вытворчасці лябёдак Магілёўскага ліфтабудаўнічага завода, намеснікам дырэктара Магілёўскага завода сельскагаспадарчага машынабудавання «Магілёўсельмаш» (Магілёўскага завода транспартнага машынабудавання «Магілёўтрансмаш»), галоўным інжынерам – першым намеснікам дырэктара, намеснікам генеральнага дырэктара Магілёўскага завода «Магілёўтрансмаш».

Генеральны дырэктар рэспубліканскага вытворчага унітарнага прадпрыемства «Магілёўскі завод «Строммашына».

Удастоены ганаровага звання «Чалавек года» (2000 г.).

Узнагароджаны медалём «За працоўныя заслугі», юбілейным медалём «90 год Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.



## СКАКУН
## Аляксей Сцяпанавіч

**Член Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы**

*Выбраны ад Брэсцкай вобласці*

Нарадзіўся 1 сакавіка 1946 года ў вёсцы Дастоева Іванаўскага раёна Брэсцкай вобласці. Закончыў Гродзенскі сельскагаспадарчы інстытут, вучоны-заатэхнік. Доктар эканамічных навук, член-карэспандэнт Акадэміі аграрных навук, акадэмік Міжнароднай акадэміі арганізацыйных і кіраўніцкіх навук, акадэмік Беларускай і Міжнароднай інжынерных акадэмій. Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь. Аўтар 6 навуковых прац, 5 кніг.

Працоўную дзейнасць пачаў заатэхнікам калгаса «Чырвоная Зорка» Іванаўскага раёна Брэсцкай вобласці. Пасля службы ў радах Савецкай Арміі працаваў галоўным заатэхнікам, намеснікам старшыні калгаса «Маладая гвардыя», старшынёй калгаса «Дружба» Іванаўскага раёна, намеснікам старшыні Іванаўскага райвыканкама – начальнікам упраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання, старшынёй калгаса-камбіната «Памяць Ільіча» Брэсцкага раёна.

